Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 14 1934 г. СЕРАДА № 37 (4870)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА па арганізацыйных пытаннях

(ПАРТЫЙНАЕ І СОВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА)

XVII з'езд ВКП(б)

АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ (ПАРТЫЙНАЕ І СОВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА)

Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на XVII з'ездзе ВКП(б)

ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК ГЛ. Ў № 36

Увесь гэты апарат, раз ён атрымлівае зарплату, «павінен» пісаць. І вось пішуць. У дрэваапрацоўчым цэху, напрыклад, на 57 чалавек рабочых на працягу студзеня было выпісана 7 тыс. нарадаў. Пісалі нарады і там, дзе можна было абыйсціся без усякай пісаніны, прычым гэтай пісаніной займаюцца і інжынеры. Дарогна некаторыя думаюць, што ўсе інжынеры, пачаўшы на завод, займаюцца вытворчасцю. Многім з іх даручаюць займацца канцылярыйчынай і на заводзе, і ў цэху. На месцы вытворчасці, згатаўлення дэталяй, на месцы іх зборкі інжынераў яшчэ мала. З 55 інжынераў на Мыціпчынскім заводзе 36 працуюць у апараце заводакіраўніцтва і толькі 19 у цэхах. Калі вы пакажаецеся ў другіх заводах, дык тое-ж самае знойдзеце і там.

Дырэкцыя большай часткай знаходзіцца з начальнікам цэха не непасрэдна, а праз функцыянальныя аддзелы. Цэх, напрыклад, атрымлівае свой план ад двух аддзелаў: ад так званага вытворча-планавага, у функцыю якога ўваходзіць вызначэнне канкрэтных заданняў, а па астатніх показальніках ён атрымлівае задание ад планава-эканамічнага аддзела, прычым часты выпадкі, калі заданні аднаго і другога аддзела разыходзяцца.

Вялікая колькасць функцыянальных аддзелаў не можа не прыводзіць да лішняй паперовай пісаніны безадказнасці і нескаардынаванага кіраўніцтва. Я мог-бы праілюстраваць рад выключна камічных прыкладаў, як розныя аддзелы за заводакіраўніцтва перапісваюцца з начальнікамі цэхаў і як апошнія пацісканюць плячыма. Адзін стары майстар, начальнік цэха на Мыціпчынскім заводзе заявіў: «Нічога не зробіш, пісанне папер у іх адбываецца ад трызнення алоўка» (Смех).

Вось распараджэнні начальніку ліцейнага цэха т. Каткову. Загалчык промсанітарыі патрабуе: «Не пазней 19-і—34 г. даць весткі на наступных пытаннях: кубатура цэха, колькасць рабочых у кожным цэху ў розныя змены; па абрубных — колькасць важдакоў і барабанаў, па механічнаму—колькасць важдакоў з экранчыкамі; па дапаможных памяшканнях — колькасць саскоў ва ўмывальніку і колькасць месц ва ўборных; асвятленне ў цэхах у вячэрні і начны час; па ліцейнаму цэху — колькасць ліцця і загрузкавасць вагранак; рэгулярнасць выдачы спецодзежы і пытанне мыцця і папраўкі яе; па механічнаму цэху — колькасць маторных варштатаў з прапускнымі і агульная колькасць варштатаў; па кузні — колькасць печаў з вафтавай топкай, колькасць паравых молатаў і горнаў» і т. д. і т. п. Бясконцыя пісьмовыя запытанні, паперкі ад функцыянальных аддзелаў адрываюць начальніка цэха ад яго непасрэдных задач па кіраўніцтву цэхам.

Калі начальніку цэха неабходна зварачацца за чым-небудзь у заводакіраўніцтва, ён павінен зварачацца па пытанню аб людзях у аддзел найму і звальнення рабочай сілы, па пытанню аб апале—у энергабюро механічнага аддзела, па пытанню аб матэрыялах—у аддзел снабжэння, па пытанню аб чарнёжах—у аддзел падрыхтоўкі вытворчасці, па пытанню аб праграме—у вытворчы аддзел і планава-эканамічны аддзел, па пытанню аб тарыфах і нормах—у тарыфна-эканамічны сектар і т. д.

Гэта функцыянальная сістэма простым чынам вядзе да таго, што дырэктар, які волен ад непасрэднага кіраўніцтва цэхамі, займаецца агульнымі загадамі. Вось адзін загад гэтага дырэктара аб арганізацыі на заводзе медыка-санітарнай і хімічнай службы.

Ён пачынае так: «Капіталістычны свет задыхаецца ў цісках сусветнага крызіса» (**вясёлае ажыўленне ў зале**). Літаральна, канкуранцыя з тав. Мануільскім (**агульны смех**). «Вядзе шалёную падрыхтоўку да новай сусветнай вайны. Яны шукаюць выхаду з глыбокага эканамічнага і палітычнага крызіса шляхам узмацнення эксплаатацыі рабочых і працоўнага сялянства ўсіх краін і ў падрыхтоўцы ўзброенага нападу, у першую чаргу супроць СССР. Таму нашым абавязкам з'яўляецца мацаваць магутнасць і абароназдольнасць СССР, зарукай чаго з'яўляецца выкананне і перавыкананне промфінплана на заводзе».

І гэта не выпадковы загад. Сам па сабе тав. Хрунічаў работнік не дрэнны, але гэта, таварышы, стыль яго работы. У яго многа такіх загадаў.

Вядома, агітаваць за промфінплан трэба, за абароназдольнасць неабходна. Але, калі апаратыўнае кіраўніцтва падмяняецца вадалействам або балбатнёй, то не атрымліваецца ні справы, ні агітацыі. Такія кіраўнікі, відавочна, разумеюць слова рукавадзіць, як вадзіць рукамі. (**Агульны смех**).

Вот тут многа таварылі аб барацьбе за якасць. Гэта абсалютна правільна. Але пры захаванні функцыялкі на заводзе барацьба за якасць, несумненна, затрудняецца. Колькі раз бывала прыходзіш на завод і пытаешся: чаму брак, чаму запаролі дэталь? Адказваюць: вінаватаддзел праектаў або аддзел арганізацыі вытворчых працэсаў, далі няправільныя чарцяжы. Пытаешся ў аддзеле праектаў:—чаму запаролі? Ды вось у цэху няладна. Гэта і ёсць тая безадказнасць, якая ствараецца функцыянялкай, якая перашкаджае знайсці вінаватых ў браку.

Асаблівую ўвагу я лічу неабходным звярнуць на арганізацыю тэхналагічнага працэса. Яго большай часткай адрываюць ад цэхаў. Данбасаўцы памятаюць выдатны **ОППОТ**, які існаваў на шахтах, і як шахцёры раздзелалі гэты «аддзел праектавання вытворчых працэсаў і арганізацыі працы». І вось, уявіце сабе, на заводах у іншым выглядзе ён усё-ж існуе да гэтага часу.

На заводах існуюць аддзелы падрыхтоўкі вытворчасці, а тэхналагічны працэс адрываецца ад цэха. Начальнікі цэхаў—асноўная камандная сіла на заводзе—не прымаюць ніякага ўдзелу ў гэтай найважнейшай справе, а іх багацейшы вопыт зусім не скарыстоўваецца для распрацоўкі (першай і важнейшай справы) тэхналагічнага працэса, які вызначае чарцяжы, матэрыялы, спосаб апрацоўкі, час, патрэбны для апрацоўкі дэталі і т. д. Вядома, трэба звязаць цэхі з выпрацоўкай тэхналагічнага працэса. Як відаць у заводакіраўніцтве павінна існаваць пэўнае канструктарскае бюро, дзе-б начальнікі цэхаў маглі атрымліваць асноўныя ўказанні або даваць нешта накшталт заказаў. Канструктары, якія сканструіравалі тую ці іншую дэталь, тую ці іншую частку машыны, павінны быць непасрэдна ў цэху і там дапамагаць укараняць гэту частку. Сучасныя-ж аддзелы вытворчасці ў значнай сваёй частцы аканцылярваюць важнейшую справу арганізацыі тэхналагічнага працэса на прадпрыемстве.

Вось, напрыклад, на аўтазаводзе імя Сталіна дырэктар яго тав. Ліхачоў перабудаваў сваё заводакіраўніцтва, не ў прыклад Мыціпчынскаму заводу, і перарабіў аддзел праектавання вытворчасці ў свайго роду невялікае тэхналагічнае бюро, якое існуе пры заводакіраўніцтве, дае агульны напрамак тэхналагічнаму працэсу, а канструктарскія сілы перадаў у цэхі. Усе дэталі канструіруюцца ў цэхах пад кіраўніцтвам начальнікаў цэхаў і там-жа выраблюцца. Рэзультаты гэтага, несумненна, скажуцца, яны ўжо ёсць.

З прыкладу аўтазавода імя Сталіна відаць, што не на ўсіх, вядома, заводах абстаіць справа так, як на Мыціпчынскім. Але на большасці заводаў у той ці іншай ступені функцыянальшчына існуе, большасць служачых на заводах—гэта работнікі функцыянальных аддзелаў, даючыя, кожны ў паасобку, распараджэнні начальнікам цэхаў. Курс на начальніка цэха, а ў цэху на майстра, як на асноўную камандную сілу ў вытворчасці, пакуль пасапраўднаму не ўзят. І задача заключаецца ў тым, каб прыстасоўна да кожнай галіны вытворчасці, без аднолькавага шаблонага рэцэпта для ўсіх, канкрэтна перабудаваць работу заводакіраўніцтваў, работу цэхаў з тым, каб максімальна, па прыкладу вугольнай прамысловасці, скараціць і зрэзаць канцылярштчыну і бюракратызм і ўзмаціць ролю майстра і начальніка цэха.

Гэта адносіцца і да будаўніцтваў. Як толькі пачынаюць будаваць, так фарміруецца адразу шматлікі апарат будоўлі. Мне асабіста давялося бачыць адну з такіх будоўляў, дзе награмаздзілі трыццаць аддзелаў. Рабочым няма дзе жыць, апарат-жа заняў аграмаднае памяшканне.

Тэхнічная рэканструкцыя ўсіх галін народнай гаспадаркі, пабудова новых гіганцкіх прадпрыемстваў, укараненне механізаванай і аўтаматызаванай тэхнікі патрабуе велізарнейшай зладжанасці і строй насці ўсяго вытворчага працэсу. Таму, як ніколі, неабходна найстражэйшае правядзенне **адзінаначалля** ва ўсіх звеннях кіраўніцтва прамысловасцю. **Майстар ёсць поўнаўладны кіраўнік участка, начальнік цэха—поўнаўладны кіраўнік цэха, дырэктар завода—поўнаўладны кіраўнік завода з усімі выцякаючымі з гэтага правамі, абавязкамі і асабістай адказнасцю.**

Новая тэхніка ўладарна патрабуе ўсямернага ўмацавання тэхнічнага кіраўніцтва. Таму майстар, начальнік цэха, дырэктар завода, могуць быць сапраўднымі камандзірамі вытворчасці толькі тады, калі яны кіруюць не толькі гаспадарчай, але і тэхнічнай стараной вытворчага працэса. Адначасова тэхнічны персанал, і ў першую чаргу майстар і начальнік цэха, павінен кіраваць не толькі машынамі, але і людзьмі, арганізацыяй і нармаваннем іх працы, заработнай платай.

Ва ўсёй перабудове прамысловасці, і не толькі прамысловасці, самае галоўнае—гэта зменшыць колькасць звенняў у кіраўніцтве. Замест існуючай і існаваўшай чатырохзвеннай — устанавіць трохзвенную сістэму, а яшчэ лепш — двухзвенную, чаго, напрыклад, у некаторых галінах прамысловасці зараз дабіліся ліквідацыяй аб'яднанняў і цэлага раду трэстаў.

Па сярэднему і вышэйшаму звяну кіраўніцтва цяжкай прамысловасцю, Наркамцяжпром, згодна пастановы Цэнтральнага Камітэта правёў значную перабудову. Разбуйнен рад галінных главкаў для паляпшэння канкрэтнага кіраўніцтва. Падпарадкаваны непасрэдна Наркамцяжпрому рад прадпрыемстваў. Вопыт пацвярджае абсалютную правільнасць падпарадкавання раду прадпрыемстваў непасрэдна наркаматам. Ліквідаваны рад трэстаў і амаль усе аб'яднанні.

Якія магчымасці адкрывае нам правільнае вырашэнне арганізацыйнага пытання з пункту гледжання скарачэння апарата, паляпшэння яго работы показвае прыклад авіяцыйнай прамысловасці: у Глававіяпроме былі ліквідаваны два трэсты—самалётабудаўнічы і маторабудаўнічы. Сам Глававіяпром непасрэдна звязаўся з заводамі. Па абодвух трэстах скарачана, такім чынам, 440 чалавек. Адміністратыўныя расходы па гэтых трэстах складалі каля трох мільёнаў рублёў. Абодва трэсты ліквідаваны, і авіяцыйныя заводы працуюць не горш, калі не лепш.

Вядома, у перабудоўе сістэмы кіраўніцтва цяжкай прамысловасцю пэўная работа прароблена, але менш за ўсё трэба, асабліва пасля даклада тав. Сталіна, апераваць словамі: «ёсць пералом» і намячаюцца зрухі». Не гледзячы на тое, што ў Наркамцяжпроме быў разбуйнен цэлы рад главкаў для набліжэння да вытворчасці, быў ліквідован рад трэстаў для таго, каб знішчыць многазвеннасць, у сістэме кіраўніцтва прамысловасцю, у трэстах і ў самым Наркамцяжпроме ўсё яшчэ оргсістэма недаапрацавана. Там існуе яшчэ, напрыклад, многа функцыянальных сектароў. Усе функцыянальныя сектары ліквідаваць і не патрабуецца. Частка з іх можа і павінна застацца, але, папершае, іх трэба скараціць максімальна і, падругое, трэба забараніць функцыянальным сектарам дзейнічаць праз галаву вытворчых главкаў і кіраўніцтваў. Павінен быць адзін гаспадар, які дае распараджэнні. Функцыянальны сектар павінен быць невялікім дапаможным наркому апаратам, не даючым ніякіх непасрэдных распараджэнняў. Тады ва ўсякім выпадку шкоды ад яго будзе менш. (**Агульны смех, апладысменты**).

Можна выказаць пажаданне, каб цяжкая прамысловасць, якая першая атрымала ўрок на вуглі, паспаралася быць першай і ў перабудове ўсіх галін цяжкай прамысловасці.

2. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ Ў ЛЁГКАЙ, ХАРЧОВАЙ І ЛЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Асабліва дрэнна і нездавальняюча пастаўлена работа ва ўсёй сістэме лёгкай прамысловасці, пачынаючы ад наркамата і канчаючы фабрыкай.

Тав. Любімаў выступіў тут, ён прабаваў закранаць некаторыя арганізацыйныя пытанні. Аднак, крытыкаваў ён надзвычай нясмела і вузка, з яго выступлення відаць, што ён оргпытанні лёгкай прамысловасці надта лёгка ведае, таму я павінен буду ўскрыць недахопы крыху больш рэзка, чым ён. (**Голас:** Зразумела, зразумела, такім чынам, 440 чалавек. Адміністратыўныя расходы па гэтых трэстах складалі каля трох мільёнаў рублёў. Абодва трэсты ліквідаваны, і авіяцыйныя заводы працуюць не горш, калі не лепш.

Вядома, у перабудоўе сістэмы кіраўніцтва цяжкай прамысловасцю пэўная работа прароблена, але менш за ўсё трэба, асабліва пасля даклада тав. Сталіна, апераваць словамі: «ёсць пералом» і намячаюцца зрухі». Не гледзячы на тое, што ў Наркамцяжпроме быў разбуйнен цэлы рад главкаў для набліжэння да вытворчасці, быў ліквідован рад трэстаў для таго, каб знішчыць многазвеннасць, у сістэме кіраўніцтва прамысловасцю, у трэстах і ў самым Наркамцяжпроме ўсё яшчэ оргсістэма недаапрацавана. Там існуе яшчэ, напрыклад, многа функцыянальных сектароў. Усе функцыянальныя сектары ліквідаваць і не патрабуецца. Частка з іх можа і павінна застацца, але, папершае, іх трэба скараціць максімальна і, падругое, трэба забараніць функцыянальным сектарам дзейнічаць праз галаву вытворчых главкаў і кіраўніцтваў. Павінен быць адзін гаспадар, які дае распараджэнні. Функцыянальны сектар павінен быць невялікім дапаможным наркому апаратам, не даючым ніякіх непасрэдных распараджэнняў. Тады ва ўсякім выпадку шкоды ад яго будзе менш. (**Агульны смех, апладысменты**).

Можна выказаць пажаданне, каб цяжкая прамысловасць, якая першая атрымала ўрок на вуглі, паспаралася быць першай і ў перабудове ўсіх галін цяжкай прамысловасці.

2. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ Ў ЛЁГКАЙ, ХАРЧОВАЙ І ЛЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Асабліва дрэнна і нездавальняюча пастаўлена работа ва ўсёй сістэме лёгкай прамысловасці, пачынаючы ад наркамата і канчаючы фабрыкай.

Тав. Любімаў выступіў тут, ён прабаваў закранаць некаторыя арганізацыйныя пытанні. Аднак, крытыкаваў ён надзвычай нясмела і вузка, з яго выступлення відаць, што ён оргпытанні лёгкай прамысловасці надта лёгка ведае, таму я павінен буду ўскрыць недахопы крыху больш рэзка, чым ён. (**Голас:** Зразумела, зразумела!). У лёгкай прамысловасці звілі сабе гняздо няправільная сістэма арганізацыі, канцылярска-бюракратычны метад кіраўніцтва прадпрыемствам і функцыяналка. Функцыяналка тут набыла выключна вялікі размах. Вытворства «функцыяналкі» і канцылярштчыны ў сектарах і аддзелах Наркамлегпрома мае большы размах, чым яго работа па вытворчасці прадукцыі лёгкай прамысловасці (**смех**).

Усе тэкстыльшчыкі вельмі добра памятаюць гісторыю з функцыяналкай у тэкстыльнай прамысловасці, якая захапіла ўсе галіны вытворчасці і нанесла дастатковую шкоду. Я не закранаю тут многіх пытанняў арганізацый, у прыватнасці, падрабязна не закранаю пытанняў арганізацыі працы, бо гэта патрабуе спецыяльнага даклада, але ў сувязі з функцыяналкай у тэкстылі я закрану гэта пытанне.

Што сабой прадстаўляла функцыяналка ў тэкстыльнай прамысловасці? Сутнасць справы заключалася ў тым, што існаваўшы на працягу дзесяткаў год кваліфікаваны ткач або ткачыха, кваліфікаваны прадзільшчык, якія ў некаторым родзе ганарыліся сваёй спецыяльнасцю, іх ліквідавалі. У прадзільнай вытворчасці абавязкі прадзільшчыцы, ватэрштчыцы былі разбіты паміж прысучальшчыцамі, ставільшчыцамі і абмахваль шчыцамі, а ў ткацкай вытворчасці ткачыху замянілі заводчыцы, пускальшчыцы і зарадчыцы. Такім чынам, у прадзіве і ткацтве замест цэласнага працэса працы былі створаны дробныя (тры функцыянеры). Гэта прывяло да безадказнасці і дрэннай работы прамысловасці і да рэзкага павелічэння браку.

Патрабаваліся ўказанні т. Сталіна і рашэнне пленума ЦК для таго, каб скасаваць гэту функцыяналку ў тэкстыльнай прамысловасці і аднавіць кваліфікацыю ткача і прадзільшчыка з іх поўнымі правамі кваліфікаваных рабочых.

На фабрыках лёгкай прамысловасці функцыяналка выражана не менш ярка, калі не больш, чым у прыведзеным прыкладзе Мыціпчынскага завода.

На тэкстыльнай фабрыцы да самага апошняга часу існавала вялікая колькасць функцыянальных аддзелаў і сектароў, і ўся сістэма арганізацыі нездавальняюча. Так, напрыклад, па «Пролетарцы» было 18 функцыянальных аддзелаў, а на фабрыцы імя Свердлова — 13 функцыянальных аддзелаў і 10 сектароў. На ткацкай фабрыцы «Пролетарка» былі наступныя службовыя асобы: 1) дырэктар, 2) пам. дырэктара, 3) пам. дырэктара па рабочаму снабжэнню, 4) пам. дырэктара па масавай рабоце, 5) загадчык вытворчасцю, 6) заг. планавым аддзелам, 7) заг. аддзелам рацыяналізацыі, 8) заг. аддзелам арганізацыі працы, 9) заг. аддзелам тэхнічнага кантроля, 10) заг. аддзелам кадраў, 11) заг. аддзелам снабжэння, 12) галоўны бухгальтар, 13 заг. фінансавым аддзелам, 14) заг. сталом асабістага складу, 15) кіраўнік справамі, 16) заг. тэхпропам, 17) заг. тэхнікай безапаснасці, 18) галоўны механік, 19) заг. сектара кантроля і выканання і 20) заг. сектара капітальнага будаўніцтва.

Ясна, што функцыяналка ў вытворчасці і такая функцыянальная пабудова ўсёй сістэмы кіраўніцтва, асабліва на фабрыцы, спрыяла выпуску прадукцыі дрэннай якасці. Брак прадукцыі (брак і другі разбор) дайшоў да аграмадных размераў. Паасобныя прадпрыемствы дапускалі да 30 і 40 проц. браку.

ПРАЦЯГ НА 2-ай СТАР.).

ЗА РУБЯЖОМ

УСЕАГУЛЬНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ ЗАБАСТОЎКА АХАПІЛА УСЮ ФРАНЦЫЮ

МАГУТНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ РАБОЧЫХ, БАРЫКАДНЫЯ БАІ Ў ПАРЫЖЫ І ПРАВІНЦЫЯХ

БЕРЛІН, 12 лютага. (БЕЛТА).

Як паведамляюць, трамвайныя і аўтабусныя зносіны ў Парыжы і прадмесцях прыпынены. Тэлефонная сувязь з заграніцай спынена. Тэлеграмы не прымаюцца. Войскі ахоўваюць пошту, электрастанцыі, водаправод і газавыя заводы. Перад вялікімі прадпрыемствамі ўсюды стаяць стачачныя пікеты, за якімі наглядаюць паліцэйскія патрулі. Усе магазіны закрыты.

Як паведамляе «Берлінер бэрзен цайтунг», рух у Парыжы самёр, і па вуліцах праяжджаюць толькі аўтамабілі стачачных камітэтаў і аўтамабілі з узброенымі салдатамі. Згодна паведамлення газеты, у Парыж сцягнута каля 20.000 пяхоты і кавалерыі. Апроч таго, на пагатове 27.000 паліцэйскіх і некалькі тысяч рэспубліканскай гвардыі. Парыж падобен, паводле слоў газеты, на ўзброены лагер. Згодна паведамлення «Берлінер тагеблат», Парыж уяўляе з сябе мёртвы горад.

У часе дэманстрацый у Валанс'ене і Марселі мелі месца сутычкі з паліцыяй, прычым некалькі дэманстрантаў было ранена. Сутычкі адбываліся таксама ў Дзюркінхене, дзе цяжка ранена некалькі рабочых. Праведзены шматлікія арышты. У правінцыяльных гарадах поўнасцю спынен аўтабусны, аўтамабільны і трамвайны рух.

У парыжскім прадмесці Дзювіль (каля Версаля) мінулай ноччу адбываліся барыкадныя баі. На барыкадах забіт адзін з кіраўнікоў меснай арганізацыі компартыі.

***

ВАРШАВА, 12 лютага. (БЕЛТА).

У 19 гадзін 45 мінут тут атрымана першае радыё-паведамленне агенцтва Гавас з Ліона аб усеагульнай забастоўцы ва Францыі.

У паведамленні гаворыцца, што знадворы выгляд Парыжа непазнавальны. Увесь рух спынен. Ні адна газета сёння не выйшла. Спецыяльны нумар «Аксіон франсэз», які распаўсюджваўся раніцой, быў надрукован яшчэ ўчора ўвечары.

Паводле заявы міністра ўнутраных спраў Сарро, забастоўка ахапіла амаль што ўсю Францыю.

У радзе правінцыянальных гарадоў адбыліся сёння буйныя масавыя дэманстрацыі. У Марселі ў дэманстрацыі, згодна паведамлення Гавас, прымала ўдзел 60.000 бастуючых рабочых.

У Парыжы к 15 гадзінам дня, — паведамляе агенцтва Гавас, — па вуліцах ужо прайшло 15.000 рабочых, якія накіроўваюцца на дэманстрацыю адзінага фронта, назначаную каля Венсенскіх варот.

***

ПАРЫЖ, 12 лютага. (БЕЛТА).

УСЕАГУЛЬНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ ЗАБАСТОЎКА АХАПІЛА ЎСЕ ПРАВІНЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАДЫ.

У Марселі забастоўка была ўсеагульнай, ахапіўшы порт, трамвайны і аўтабусны рух, таксі, пошту, тэлеграф і муніцыпальныя прадпрыемствы. Закрыта большасць буйных заводаў і нават цэнтральны харчовы рынак. Удзень адбылася 60-тысячная дэманстрацыя.

У Бардо баставалі порт, трамвай, таксі, друкарні, буйныя заводы, магазіны, усе паштова-тэлеграфныя ўстановы, школы і нават рабочыя дзяржаўнага парахавога завода.

У Ліле баставалі паштова-тэлеграфныя ўстановы, муніцыпальныя прадпрыемствы, трамваі і 60 проц. рабочых металургічнай, тэкстыльнай і будаўнічай прамысловасці.

Забастоўкай быў ахоплен таксама рад буйнейшых рудзікоў у вугальных басейнах Валанс'ен, Дуэ і Гар. У Рубе, Туркуэн і Мульгаузене баставалі тэкстыльшчыкі.

У Ліоне баставалі работнікі трамвая, аўтабусаў, таксі, паштова-тэлеграфных устаноў і значная частка прадпрыемстваў. У Німе баставалі комунальныя прадпрыемствы, пошта, рабочыя-будаўнікі, швэйнікі і інш. У Шэрбургу баставала 50 проц. рабочых дзяржаўнага арсенала.

Амаль ва ўсіх гарадах адбыліся буйныя дэманстрацыі. У Ліле ў дэманстрацыі прымала ўдзел 10 тыс. рабочых, у Рубе—5 тыс., у Шэрбургу 2.500, у Німе—4 тыс., у Ліоне—2 тыс. і т. д. Найбольш буйныя сутычкі адбыліся ў Марселі, дзе налічваецца 17 раненых. Раненыя ёсць таксама ў Рубэ, Ліле, Валанс'ене, Дзюнкірхене, Мюлгаузене і Панце. Усюды праведзены масавыя арышты.

ВЫКЛЮЧНЫ ПОСПЕХ ЗАБАСТОЎКІ

ЛОНДАН, 13 лютага. (БЕЛТА).

Паведамленні з Парыжа пацвярджаюць выключны поспех забастоўкі. Такой забастоўкі Францыя яшчэ не ведала. Згодна папярэдніх вестак, у Парыжы баставала 75 проц. усіх рабочых і служачых. На прадпрыемствах пошты і тэлеграфа баставала не менш 90 проц. рабочых і служачых. На прадпрыемствах мясцовага транспарта ў забастоўцы прымала ўдзел таксама 90 проц. рабочых. Баставалі як дзяржаўныя, так і прыватныя прадпрыемствы. 80 проц. настаўнікаў прымала ўдзел у забастоўцы.

Дэманстрацыя адзінага фронта на Венсенскім праспекце сабрала 150 тыс. рабочых—комуністаў, соцыялістаў і беспартыйных. Дэманстрацыя насіла выключна баявы характар і паказала гатоўнасць рабочых мас на барацьбу з фашызмам. У дэманстрацыі прымала ўдзел многа прадстаўнікоў інтэлігенцыі. У прыватнасці, пісьменнікі Андрэ Мальро, Жан Рышэр, Блок, праф. Ланжэвен і інш.

Магутная калонна шофераў таксі, якія бастуюць ужо 12 дзён, была спаткана гучнымі прывітаннямі дэманстрантаў. Дэманстранты ішлі па вуліцы са спевам «Інтэрнацыянала» і «Маладой гвардыі». Асноўныя лозунгі, пераважаўшыя на дэманстрацыі: «Далоў фашызм», «За адзіны фронт», «Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад», «Няхай жыве совецкая ўлада ва ўсім свеце». З прамовамі на дэманстрацыі выступаў рад комуністычных аратараў, у тым ліку Марсэль Кашэн і Вайян Кутур'е.

„ЮМАНІТЭ" НА БАЯВЫМ ПАСТУ

Сёння ЦК французскай компартыі ў «Юманітэ» высоўвае наступныя патрабаванні: «Неадкладная адстаўка габінета фашызацыі і вайны—Тард'е, Думерга і Лаваля. Раззбраенне і роспуск фашысцкіх арганізацый. Неадкладны арышт К'япа».

Паміма дэманстрацыі на Венсенскім праспекце, у рабочых раёнах адбыліся масавыя дэманстрацыі, сабраўшыя многа тысяч рабочых. Так, у Аржантэй у дэманстрацыі прымала ўдзел 20 тыс. рабочых. «Рабочыя,—піша сёння Андрэ Марці,—зажалі ў ціскі буржуазныя кварталы».

Орган компартыі «Юманітэ» праўляе ў гэтыя дні выключную актыўнасць. Нумар ад 7-га лютага вышаў трыма выданнямі агульным тыражом у 550 тыс. экземпляраў. Нумар ад 8-га лютага—410 тыс. экз., нумар ад 11-га лютага 600 тыс. экз.

Працяг даклада тав. Л. М. КАГАНОВІЧА

Брак рабіўся не толькі ад дрэннай сістэмы кіраўніцтва і функцыяналкі, але і ад недарэчнай цэнтралізацыі дапаможнай гаспадаркі. Наркамлегпром стварыў пры сабе трэст дапаможных прадпрыемстваў і пазбавіў фабрыкі права вырабляць неабходныя ім дапаможныя матэрыялы (перасыпка берд, рамонт і выраб ганкоў і чаўнакоў, пагапялак, выраб і рамонт рэмізаў, валькоў і т. д.). Гэта стварала і стварае яшчэ і зараз дадатковыя труднасці для правільнай работы фабрыкі.

На Орэхаўскай канферэнцыі тэкстыльшчыкаў Маскоўскай вобласці былі ўскрыты ўсе гэтыя недахопы. У прыватнасці, адзін беспартыйны стары інжынер Копылаў расказаў як было раней, як зараз і ў чым памылкі, напісаў вельмі цікавы ліст, у якім ускрыў бюракратызм і канцылярыщину ў рабоце Дрэзненскай фабрыкі. Мы не можам разгарнуць барацьбы супроць браку, пісаў ён таму, што не маем цалага раду дапаможных матэрыялаў і дэталяй, якія патрэбны сёння. Паміж дырэктарам і тэхнічным дырэктарам фабрыкі няма той аператыўнай сувязі, якая павінна быць, і няма яе з начальнікамі цэхаў. Такую-ж карціну дрэннага, неаператыўнага кіраўніцтва мы маем і ў трэстах і ў самым Наркамлегпроме.

Калі ўзяць работу цэнтральных арганізацый і трэстаў, я павінен сказаць, што планіраванне ператвараецца зачастую ў здзек.

Вось прыклад трыкатажнай фабрыкі «Красная зара». Яна прапрацавала ўвесь 1933 г. без плана. План «Красной зары» разглядаўся ў 5 органах (Наркамлегпром СССР, Галоўтрыкатаж, Наркамлегпром РСФСР, абласное кіраўніцтва лёгкай прамысловасці Маскоўскай вобласці і трэст «Мострыкатаж»), у 46 сектарах.

Фабрыка атрымала 19 дырэктыў, якія адна другой супярэчылі. Планы перарабляліся: па вытворчасці 7 раз, па працы 4 разы, па сабекошту 8 раз. У рэзультаце — увесь год фабрыка працавала без плана. План на 1933 г. быў канчаткова зацверджан 4-га студзеня... 1934 г. План на 1933 г. спазніўся толькі на 1 год і чатыры дні (смех). Такіх яркіх прыкладаў бюракратызма і папяровакапылярскага кіраўніцтва ў Наркамлегпроме многа.

У баваўнянай прамысловасці апарат трэста складаўся з 19-22 функцыянальных аддзелаў. Апарат Маскоўскага баваўнянага трэста складаўся з 19 адзінак — сектароў і груп на правах сектароў. Камісія па рэарганізацыі Наркамлегпрома намячае астаўленне ў трэсце 8 аддзелаў і сектароў, замест існаваўшых 19-22.

Што датычыць наркамата лёгкай прамысловасці, то ён выключ на грамоздак, ён мае 39 буйных адзінак кіраўніцтва і 60 сектароў.

Ёсць такія галоўныя галіновыя кіраўніцтвы, якія не маюць уласнай вытворчай базы (Галоўныя кіраўніцтвы швейнай прамысловасці, галантарэйнай і саматужнай, паліграфічнай прамысловасці і т. п.). Прамысловасць гэтых кіраўніцтваў у большасці сваёй знаходзіцца ў ведамні месцаў.

Кіраўніцтва — гэта значыць, што людзі могуць размяркоўваць матэрыяльныя каштоўнасці, пераводзіць і знаёміць падначаленых людзей, адным словам, распараджацца поўнасцю прадпрыемствам, але калі прамысловасць належыць рэспубліканскім або мясцовым органам, чым-жа «кіруюць» тады існуючыя саюзныя кіраўніцтвы?

Вядома, няправільным было-б ставіць пытанне аб перадачы ўсесаюзных заводаў і фабрык мясцам, але зараз у сувязі з пастаноўкай пытання аб развіцці мясцовай прамысловасці, саматужнай прамысловасці трэба будзе звярнуць больш увагі на абласныя кіраўніцтвы, каб яны былі не проста прыдаткам, а сур'ёзнымі кіруючымі органамі, праз якія і наркамат і мясцовы выканком кіруюць мясцовай прамысловасцю. Неабходна ва ўсякім выпадку заваяваўчую экспансію Наркамлегпрома асадзіць. (Галасы: Правільна!).

Я не хачу сказаць, што трэба задаволіць імкненні многіх мясцовых таварышоў і перадаць у веданне месц бяспрэчна саюзныя прадпрыемствы. Але трэба наркаматам у далёка большай меры абаперціся на дапамогу мясцовых советаў і выканкомаў. (Галасы з месц. Правільна, правільна!).

Каганові ч.

Што датычыць кіраўніцтваў, у веданні якіх ёсць саюзная прамысловасць, то яны настолькі громоздкі, што фактычна яны не кіруюць прамысловасцю. Возьмем, напрыклад, галоўнае баваўнянапапіровае кіраўніцтва. Гэта кіраўніцтва яднае 14 саюзных трэстаў і камбінатаў з 179 прадпрыемствамі і 350 тысяч рабочых. Яго прадпрыемствы выпускаюць прадукцыі на 2,5 мільярда рублёў, што складае, прыкладна, каля 1/3 прадукцыі Наркамлегпрома. Такі, з дазволу сказаць, глаўк, натуральна, не ахапляе кіраўніцтва трастамі і прадпрыемствамі. Адсюль—затор і перабоі ў рабоце трэстаў і прадпрыемстваў. Чаму-ж Наркамлегпром не падумаў аб гэтым, не прышоў у ЦК і не паставіў пытання? Таму, як відаць, што ён займаецца «высокімі матэрыямі», а ў арганізацыйныя пытанні не ўваходзіць па сутнасці, перадаручаючы іх трэцяступенным работнікам.

Ці не лепш было-б, калі-б такі левіяфан, якім з'яўляецца баваўнянае кіраўніцтва, разузбуйніць і стварыць дзеяздольныя, арганізаваныя, сапраўды аператыўныя кіраўніцтвы, якія будуць ведаць свае фабрыкі, будуць імі кіраваць, будуць змагацца за якасць прадукцыі і выконваць нашы рашэнні па вытворчасці прадметаў шырспажыву (апладысменты).

Тав. Любімаў не ўскрыў у сваім выступленні ўсіх недахопаў. Тав. Любімаў павінен сур'ёзней і шырэй паглядзець на свае задачы. Ён павінен зразумець, што справа ідзе не аб дробных недахопах механізма, справа ідзе аб змяненні метадаў аператыўнага кіраўніцтва лёгкай прамысловасцю, справа ідзе аб ліквідацыі канцылярыщины і бюракратызма, звіўшых сабе гняздо ў яго ў наркамаце; справа ідзе аб тым, каб ліквідаваць метады папяровага кіраўніцтва, пануючыя ў Наркамлегпроме, наблізіцца да фабрык і паставіць іх пасапраўдпаму на ногі. Справа ідзе аб тым, таварышы, каб выканаць пяцігадовы план па расшырэнню вытворчасці прадметаў шырокага спажывання, які мы намецілі.

Калі ўзяць іншыя галіны прамысловасці, як харчовая і лясная, дык і там арганізацыйных недахопаў і неразбярыхі вельмі многа, і калі я іх тут падрабязна не разбіраю, то гэта проста таму, што няма магчымасці і часу ўсе галіны падрабязна разабраць, але зусім не таму, што ў іх лепш справа стаіць.

Даволі напомніць аб буйнейшых недахопах харчовай прамысловасці, якія прывялі да вырабу нядобраякаснай прадукцыі і да атручэння людзей. Можна, бяспрэчна, сцвярджаць, што іменна пяўважлівасць і пагаджальныя адносіны Наркамснаба да арганізацыйных пытанняў прывялі да гэтага. У харчовай прамысловасці, і ў рыбнай справе, і кансервовай і т. д. многа безадказнасці, абязлічкі і бюракратызма. Наколькі дрэнна, напрыклад, была арганізавана маслабойна-тлушчавая прамысловасць, можна бачыць з наступнага факта. Маслабойна-тлушчавай прамысловасцю кіравалі Галоўрастлушчмасла, Саюзрасмасла, Галоўтлушчпром і ОМПК і тры наркаматы—Наркамснаб СССР, Наркамлегпром СССР і Наркамлегпром РСФСР. У чатырох галоўках працавалі 493 супрацоўнікі. Такое кіраўніцтва маслабойна-тлушчавай прамысловасцю прывяло да нерацыянальнага расшырэння і загрузкі прадпрыемстваў у адных раёнах і недаснабжэння рынка і сустрэчных перавозак—у другіх. У рэзультаце і тлушчаў, і мас ла, і мыла аказалася менш.

Такая структура прыводзіла да таго, што рэсурсы нашы разбазараваліся, мыла з Паўночнага Каўказа трэба было везці на Урал, а уральскія і бліжэйшыя да іх заводы не мелі сырцу. Зараз пастановай ЦК справа гэта ліквідавана, зараз усё сканцэнтравалася ў адным Наркамснабе. Цэнтральны Камітэт аддаў гэтай справе вельмі вялікую і сур'ёзную ўвагу, і мы ўпэўнены, што справа пойдзе лепш.

Возьмем Наркамлес. Гэты наркамат наогул мае свае асаблівасці. Ён крыху «лясны» наркамат (смех), але сувязь паміж Наркамлесам і сапраўдным лесам вельмі слабая і нездавальняючая (смех, апладысменты).

Ад Наркамлеса да лясного ўчастка і сплаўнога пункта—дыстанцыя аграмаднага размеру, і гэта таму, што ў самым наркамаце кіраўніцтва мясцовымі органамі заблытана і безадказна, бо распараджаюцца ўсе, каму не лянота. Вось, напрыклад, Саюзлесзаг. Гэта арганізацыя ведае 46 % усёй прадукцыі Наркамлеса. Так, тав. Лобаў, амаль палова ўсёй прадукцыі Наркамлеса—у ведамні Саюзлесзага. Папершае, сама па сабе такая пабудова бязглузда—нельга амаль палову прадукцыі наркамата сканцэнтраваць у адным глаўку. Але побач з Саюзлесзагам існуе багата функцыянальных аддзелаў.

І вось паглядзіце як Саюзлесзаг кіруе Саюзсеўлесам. Устанаўленне асартымента прадукцыі трэста вырашаецца не Саюзлесзагам, а функцыянальным органам Наркамлеса —сектарам матэрыяльных балансаў. Здавалася-б, раз Саюзлесзаг існуе, ён і павінен вызначаць спаб жэнне трэста тэхнічнымі матэрыяламі, абсталяваннем, інструментамі. Аказваецца, гэта вырашаюць функцыянальныя органы Саюзлестэхснаба, пытанні-ж сырцу вырашаюцца Саюзлесазбытам. Такім чынам, Саюзлесзаг, называючыся вытворчым глаўкам, не вызначае ні матэрыяльных, ні людскіх рэсурсаў па загатоўцы лесу. Пытаемся, якое-ж гэта праўленне, якое «ведае» 50 проц. усёй лясной прадукцыі, але нічым не распараджаецца. Зразумела, арганізацыйна гэта ні якія вароты, нават лясныя, не лезе. А галоўнае, лясныя загатоўкі ад гэтага церпяць. Такі наркамат і такія глаўкі трэба неадкладна перабудаваць.

Я не буду прыводзіць новыя ілюстрацыі. Людзі, працуючыя на мясцах, добра ведаюць, як арганізацыйная блытаніна ў наркамаце, трэсце, у іх узаемаадносінах з заводам адбіваецца на вытворчасці і тым самым на агульным падёме ноў» (смех).

3. АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ ПЕРАБУДОВА У СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ ЗЕМЛЯРОБСТВЕ

У сельскай гаспадарцы арганізацыйныя пытанні ў сувязі з адсутнасцю вопыта арганізацый буйнай вытворчасці, стаяць далёка вастрэй, чым у другіх галінах народнай гаспадаркі.

Прамысловасць значна багацей вопытам па частцы вырашэння арганізацыйных пытанняў. Работнікі прамысловасці, дзе ўжо ёсць сапраўдны кадравы касцяк, маглі, пры ўважлівым падыходзе, вывучыць рад даволі шырокіх прыкладаў арганізацыі працы і кіравання прадпрыемствамі як у СССР, так і за граніцай. У галіне сельскай гаспадаркі мы гэтага не маем. У сельскай гаспадарцы мы сустрэліся з зусім новай формай земляробства, з новай тэхнікай і вырашэнне арганізацыйных пытанняў прыходзіцца пачынаць з самага пачатку.

На студзеньскім пленуме (1933 год) ЦК і ЦКК тав. Сталін гаварыў:

«Мы ўсе радуемся таму, што калгасная форма гаспадаркі стала пануючай формай у нашых хлебных раёнах. Але не ўсе разумеюць тое, што гэта акалічнасць не змяншае, а павялічвае нашы клопаты, і нашу адказнасць у справе развіцця сельскай гаспадаркі... Пераход да калгаснай гаспадаркі, як пераважаючай формы гаспадаркі, не змяншае, а павялічвае нашы клопаты аб сельскай гаспадарцы, не змяншае, а павялічвае кіруючую ролю комуністаў у справе пад'ёму сельскай гаспадаркі. Самапёк цяпер больш, чым калі-небудзь небяспечны для развіцця сельскай гаспадаркі. Самапёк цяпер можа загубіць усю справу».

І 1933 год быў годам арганізаванай барацьбы з самапёкам, годам тіганіцкага росту арганізатарскай ролі нашай партыі і пролетарыята ў вёсны.

Багацейшы вопыт 1933 года, пасля арганізацыі палітаддзелаў МТС і саўгасаў, пасля паваротаўсіх партыйных арганізацый да сельскай гаспадаркі, паказаў, якія тіганіцкія магчымасці адкрываюцца перад намі ў вырашэнні задач соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, калі правільна вырашыць арганізацыйныя пытанні. Такі вялікі дзержаўны апарат, як Наркамзем, а таксама НКСоўгасаў, калі-б ён аддаваў належную ўвагу арганізацыйным пытанням, хоць-бы напалову такую ўвагу, якую аддае гэтым пытанням ЦК, мог-бы зрабіць вельмі многае. Але ні Наркамзем, ні НКСоўгасаў не аддавалі гэтым пытанням неабходнай увагі. Скажу больш тэзка. Калі-б у Наркамземе арганізацыйныя пытанні правяўка выканання і аператыўнасць не былі-б загалоў, калі-б там не захапляліся пісаннем «агульных пытэктыў» і складаннем агульных дакладаў, мы напэўна мелі-б далёка менш недахопаў і не памылкі былі-б гаварыць па з'ездзе з такой рэзкасцю аб НКЗеме, як гэта прыходзіцца рабіць зараз.

Галоўная слабасць работы НКЗема заключаецца іменна ў тым, што ён пасылаў дзесяткі і сотні распараджэнняў уніз, патрабаваў улікі і справаздачнасці, рассылаў мапы і вагаматы, але не ўваходзіў у сутнасць аператыўнай работы і арганізацыйнай пабудовы нізавых органаў, не забяспечваў штодзённага кіраўніцтва ўсімі гэтымі арганізацыямі.

Таварышы, НКЗем распараджаецца аграмаднымі матэрыяльнымі рэсурсамі, ён размяркоўвае трактары, сельска-гаспадарчыя машыны. Праўда, пытанні сельскай гаспадаркі, у тым ліку і размеркаванне трактароў, машын і іншых матэрыяльных сродкаў, асабліва за апошнія гады, праходзяць праз ПБ і СНК. Аднак, нельга думаць, што размеркаванне Цэнтральным Камітэтам гэтых сродкаў ужо вырашае справу правільнага іх скарыстання. Рашэнне аб размеркаванні тоўба па справе правесці. Калі ёсць рашэнне накіраваць столькі-то трактароў, столькі-то запасных частак, то гэта не значыць, што сёй-той не можа змазаць і сапсаваць выкананне гэтага рашэння. Мы ведаем, што такое апарат, мы ведаем, што значыць выкананне рашэнняў. Любое выдатнае рашэнне можна сапраўдна, сказаць да пе-казнавацасці на практыцы, а потым яшчэ прыйсці і з «дакументамі» даказаць, што іншае нельга было зрабіць.

У Наркамземе апарат часта падходзіць да дырэктыў механічна, без уліку мясцовых канкрэтных умоў. З прычыны бязмежнай колькасці сектароў і аддзелаў у Наркамземе СССР самае простае пытанне, што высоўваецца месцамі, праходзіць праз бясконцую колькасць інстанцый. У рэзультаце — месцы астаюцца без адказу.

Мясцовыя работнікі ведаюць гэта добра. Вось, напрыклад, Наркамзем Кіргізіі 1-XII—1933 г. звяртаўся ў НКЗем Саюза з просьбай аб задаваленні Рэспублікі насеннем на 28 культурах. Гэта пісьмо паступіла з пачатку ў зернавое кіраўніцтва, адтуль — у кармовае, потым у плодагароднае, затым у насенгаводчае, а адтуль пайшло па сектарах. У кожным кіраўніцтве і сектары запатрабаванне пабывала ў дзесяткаў выкажаўпаў, кожны выказаўпа клаў разалюцыю. Шапера мытарствавала па Наркамзему 40 дзён. За гэты час толькі кармавая група напісала аднаго пісьма і то па адной культуры. Калі будуць даны адказы па астатніх 27 культурах — невядома. Хутчэй за ўсё пасля веснавой сяўбы (смех).

Я мог-бы прывесці яшчэ рад яркіх прыкладаў, але даволі і гэтага. Даволі вам сказаць, што ў Наркамземе існуе 29 кіраўніцтваў, 202 сектары (голас: ой, ой, ой!!!). Гэта яшчэ нічога—кожны сектар ведае ўсім СССР (смех, рух).

Такім чынам, для таго, каб вырашыць якое-небудзь пытанне, трэба прайсці праз дзесяткі сектароў. Для таго, каб даведаць аб становішчы таго ці іншага пытання, напрыклад, аб становішчы сяўбы якой-небудзь вобласці, трэба прайсці мінімум 20-30 сектароў, 202 тонкія нітачкі.

Вы ўяўлюце, калі-б іх звіць, стварыць некалькі моцных вяровак, тады т. Якаўлеў, у вас не было-б гэтага бедлама. Вось чаму атрымлівецца дрэннае ўпраўленне і дрэннае кіраўніцтва (голас: правільна!).

Такая важная справа, як распрацоўка форм натуральнага разліку паміж МТС і калгасамі, патрэбавала ад апарата Наркамзема 140 дзён мытарстваў праз 44 інстанцыі. Зацверджаная і разасланая на месцы 25-га красавіка форма была скасавана потым Зернатрактарацэнтрам. Сталі зноў перарабляць. Да сярэдзіны лістапада 1933 г. ні форма, ні інструкцыя не былі пасланы на месцы, хоць к гэтаму часу ўжо шырока разгарнулася хлебазбор.

Гэта адбываецца з-за канцылярскага падыходу да пабудовы і дынамікі работы апарата.

Як бачыце, функцыяналка дабілася ў Наркамземе асаблівых «дасягненняў» (смех). Да рэчы ўспомніць шчэдрынскіх герояў «пестрых писем». Там ёсць пісьмо другое. Героямі фігуруюць тры стацкіх саветнікі: Семён Міхайлавіч Неаслабны, Пётр Самойлавіч Прэлестнікаў і Нікадзім Лукіч Перадрагін (прозвішчы-то якія). Два з іх загадвалі аддзяленнямі: адзін — Семён Міхайлавіч Неаслабны — аддзяленнем завязвання вузлоў (смех), а другі Пётр Самойлавіч Прэлестнікаў — аддзяленнем развязвання такавых (аглушальны смех).

«Сумеснае існаванне абодвух аддзяленняў, — гаворыць Шчэдрын, —прадстаўлялася надзвычай карысным, бо як толькі бывала Семён Міхайлавіч завяжа вузялок, так Пётр Самойлавіч зараз-жа яго развяжа (гамерычны хохат), а потым Семён Міхайлавіч зноў завяжа, а Пётр Самойлавіч зноў развяжа. А пакуль яны рабілі сваю справу, Нікадзім Лукіч пахаджваў і адзначаў: вузел першы, вузел другі і т. д. (смех), і калі заметак накаплялася дастаткова, то з іх складалася статыстыка вузлоў —колькі такавых завязана (смех) і колькі развязана. А для чаго — невядома. (Узрыў смеху, апладысменты).

У заключэнне, — гаворыць Шчэдрын, — падводзіўся баланс: прыход з расходам верны, а ў касе нічога... (Узрыў смеху, апладысменты). Усе трое жылі душа ў душу і ўсе трое былі шчаслівы і павышэння варты (смех) у гэтым казачным свеце...

У гэтым свеце і Перадрагін, і Неаслабны, і Прэлестнікаў не толькі адчувалі сябе як рыба ў вадзе, але былі сур'ёзна пераконаны, што ўсякая спроба чыйсці з яго ёсць бунт і патрасенне асноў» (смех).

Каментарыі лішнія. Можна толькі падкрэсліць, што калі мы сёння гаворым аб функцыяналцы і яе знішчэнні аб завязванні і раз вязванні вузлоў, зразумела, ёсць людзі, якія, відавочна, думаюць, што гэта бунт і патрасенне асноў. Але мы павінны сказаць: гэта ёсць ліквідацыя астатняў старога свету.

Вось чаму аргпытанне ставіцца з такой вострасцю. Вось чаму наркаматы, у першую чаргу Наркамзем павінен перабудаваць сваю структуру.

Слоў няма, дзвесці з лішкам тысяч калгасаў і каля трох тысяч МТС — гэта далёка складаней, чым некалькі тысяч фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў. Іменна таму і трэба, каб НКЗем арганізаваў работу соўгасаў, калгасаў, МТС, райза і аблзу, а таксама і ежайго апарату так, каб сістэма была стройнай і гаспадарча-аператыўная, работа ішла бесперабойна.

Іменна таму, што гэта цяжка, іменна таму і трэба было ўстанавіць правільныя адносіны з абласнымі і раённымі зямельнымі кіраўніцтвамі, іменна таму і трэба было аддаць гэтаму значна больш увагі. Трэба было так вырашыць арганізацыйную пабудову апарата НКЗема, каб узаемаадносіны з нізавымі зямельнымі органамі былі найбольш простымі.

За пару месяцаў па з'езде мы ўзяліся за гэту справу, але не скончылі. Бо цяжка вырашаць арганізацыйнае пытанне адным махам, простым зацвярджэннем таго ці іншага праекта. Кожны наркамат, кожны аддзел патрабуе асобнага падыходу і сур'ёзнай утульнасці пры вырашэнні арганізацыйнай структуры і зараз па з'ездзе была нарада з мясцовымі таварышамі па гэтаму пытанню і пасля з'езда будзе зацверджана новая структура апарата НКЗема, як і другіх наркаматаў.

Усе існуючыя да гэтага часу ў НКЗеме трактарацэнтры ліквідуюцца і адпавядныя функцыі ўскладаюцца на кіраўніцтвы, ведаючыя НЕ ПАСРЭДНА АРГАНІЗАЦЫЯЙ ВЫТВОРЧАСЦІ Ў КАЛГАСАХ І МТС (галоўнае кіраўніцтва па зярну, галоўнае бураковае кіраўніцтва, галоўнае баваўнянае кіраўніцтва, галоўнае ільна-канапляводчае кіраўніцтва). Гэтыя галоўныя кіраўніцтвы сканцэнтроўваюць у сябе ўсе функцыі, раней раскіданыя ў розных установах і аддзелах. Галоўныя кіраўніцтвы (па зярну, па бураках, па баваўне, па ільну і т. д.) павінны разбівацца на тэрытарыяльныя сектары па аднаводных групах раёнаў (паўпёвыя і ўсходнія, далёкі і бліжні Ўсход, цэнтральная, паўночная паласа).

Кожнае з гэтых кіраўніцтваў ажыццяўляе ў сваім ведамні ЎВЕСЬ КРУГ ПЫТАННЯЎ, якія датычаць даўгай культуры, як-то пытанні сяўбы, размеркавання трактароў, запасных частак, сельска-гаспадарчых машын, барацьбы са шкоднікамі і т. д.

Таварышы з месц ведаюць, што такое ОБВ?

ГАЛАСЫ: Ёсць такое.

РОЙЗЕНМАН: Так, так.

КАГАНОВІЧ. Гэта аб'яднанне па барацьбе са шкоднікамі. Але нешчым змагацца са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы, трэба было-б разбіць паяўнае святомае ці несвядомае шкодніцтва ў самым аб'яднанні па барацьбе са шкоднікамі (апладысменты).

Адпаведна мы павінны перабудаваць і апараты ў абласных НКЗему зусім нама патрэбы мяшацца аўлаць усімі дэталямі. Для гэтага існуюць краёвыя і абласныя земельныя кіраўніцтвы.

Неправільна думаць, што НКЗем можа трымаць непасрэдную аператыўную сувязь і кіраваць тысячамі сваіх органаў на мясцах. Мясцовыя выканкомы павінны ў большай меры чым зараз займацца аператыўнымі пытаннямі, ажыццяўляючы пра эку выканання не толькі сваіх дырэктыў, але і дырэктыў урадавых органаў і наркаматаў. Мясцовыя выканкомы зусім не павінны абмяжоўваць сваю дзейнасць толькі дачай дырэктыў. Яны павінны чэрпаўпа умяшацца ў работу абл., краёвога земельнага кіраўніцтва, на-хаму пабіваючыся выпрацаўлення таго ці іншага нетаропу, лічачы для сябе справай гонару дасягненне найлепшых паказальнікаў у рабоце ўсіх аддзелаў выканкома. Адпавядна на павінна быць перабудавана і работа выканкомаў — па іменні парламентарызма, больш жывой аператыўнай справы, больш праверкі выканання.

Трэба справу арганізаваць так, каб НКЗем сканцэнтраваў сваю ўвагу на асноўных, рашаючых ва гарах, каб ён сапраўды мог, калі ён, напрыклад, размяркоўвае фінансы, праверыць выкананне раз меркавання гэтых фінансаў. Трэба вызваліцца ад таго становішча, пры якім НКЗем аўтаматычна распісвае атрымліваемыя ад урада мільёны па мёртвых табліцах.

Трэба пабудаваць справу так, каб можна было выправіць памылкі ў ходзе размеркавання, каб тэлеграмы, атрымліваемыя з месц дзесяткамі сотень аб адсутнасці трэнай, аб няўплаце рабочым, не заставаліся без адказу.

Трэба стварыць цэласны вытворчы апарат, вызваліць яго ад усяго непатрэбнага, і тады ў нас будзе сапраўдная сіла ў гаспадарчым кіраўніцтве. Мы-ж не можам так доўга, таварышы наркаматы, цярпець тое становішча, якое стварылася.

У гэтым годзе сельскай гаспадаркай займалася ўся партыя і не ЛК. Партыя будзе займацца гэтым і далей, партыя будзе трымаць каманднае вышыні сельскай гаспадаркі ў сваіх руках, партыя будзе арганізоўваць і калгасы і соўгасы. Але мейцо на ўвазе, што практычная гаспадарчая аператыўная пытанні паўсюдна быць за біспечаны работай НКЗема. Цельга цярпець, каб існаваў аграмадны земельны апарат, які з'ядае мільёны і сотні мільёнаў рублёў і працуе ў лепшым выпадку напалову ўпустую. Гэтага партыя не дапусціць. Работнікі земельных органаў павінны рашуча перабудавацца. У прыватнасці тав. Якаўлеў павінен атрымаць для сябе сур'ёзныя ўрокі, урокі ўспрыняць не ўнадворнай паказной «рапутацыю», а чарнавой работай, улікам і практыкуму пасапраўднаму.

Цэнтральны Камітэт, члены Палітбюро, правадыр нашай партыі тав. Сталін крытыкуюць НКЗем не для таго, каб пасля з'езда пажыць усё пастарому (Апладысменты). Або вы здолееце мабілізаваць пасапраўднаму апарат усяго НКЗема, сотні тысяч людзей для таго, каб выканаць задання партыі, або гэта будзе зроблена партыяй праз вашу галаву. (Апладысменты).

Я хацеў-бы закрануць яшчэ некаторыя арганізацыйныя пытанні сельскай гаспадаркі, якія выходзяць за рамкі НКЗема. Я мало па ўвазе райза. МТС, калгас, брыгада. Райза ў нас у загоне, ён знаходзіцца ў стане міжцарства, як-бы не знаходзіць сваіх абавязкаў. Зарастую плапаванне райза звязвацца да таго, што ён механічна разбіраецца вытворчыя задання па калгасах, без уліку цягла, рабочай сілы, эканамічных магчымасцяй. Райза павінен быць пабудаван так, каб ён забяспечваў ведан не кожнага калгаса.

Тав. Сталін выказаў мысль, што нельга навязваць МТС рад не ўласцівых ёй функцый. Неабходна ўсмерна ўмацаваць райза і абнавіць стробы іх ліквідацыі. Трэба, каб райза, гэты дзяржаўны орган, узяў-бы на сябе кіраўніцтва рамам сельска-гаспадарчых аператыўнай, у прыватнасці, у адносінах вызвалагадоўлі. Задачы жывёлагадоўлі, якія былі пастаўлены на з'ездзе тав. Сталіным з усёй восцтрасцю, патрабуюць сур'ёзнай рэарганізацыі ўсёй сістэмы арганізацыйнага кіраўніцтва жывёлагадоўляй. Што мы маем сёння? Вы ведаеце, таварышы, што ў жывёлагадоўлі засталося шчэ сляды старой каапаратыўнай сістэмы спецкалгаспцэнтраў Саюза Саюзаў, — так званага Малжыўкалгасаб'яднання. Існуючае ў Наркамземе кіраўніцтва калгасных жывёлагадоўчых ферм з яго сеткоўкі абсталяваннямі МТФ абмяжоўваць штогод на сарака мільёнаў рублёў аднітэнняў ад калгасных таварных ферм на свае ўтрыманне (рух у зале). Так, а толку ад яго вельмі мала.

Вазьміце краёвыя і абласныя земельныя апарата НКЗема — абл. і райзу. Там працуюць тысячы людзей. А колькі там людзей, якія займаюцца жывёлагадоўляй. — калгасаў і калгаснікаў? У лепшым выпадку дзесяткі. І гэта не тлумачыцца на тое, што 85-90 проц. усяго пагалоўя жывёлы згуртавана ў калгасах. Не лепшае становішча і ў НКЗеме.

Я павінен сказаць, што ў галіне жывёлагадоўлі нашы земельныя органы абмяжоўваюцца сваю работу толькі агульнымі інструкцыямі, агульнымі ўказаннямі. Да іх ліквідацыі прыстасоўна украінская пастанова аб кадрове: «Мыцыць, а не шаліцца» (смех). Людзі мыцыць, нельга сказаць, што яны не мыцыць... (смех), але яны не цалі ня (смех), практычна не арганізавалі справы.

Апра-зоатэхнічная служба пастаўлена дрэнна. Паглядзіце, што адбываецца з кадрамі зоатэхнікаў. У пытаннях важнейшых аб расцінах з 3.540 зоатэхнікаў у раённым апараце згуртавана 2.600, у краёвым — 300, у соўгасах — 160 і ні аднаго зоатэхніка ў калгасах. Гэта становішча трэба крута змяніць. У галіне жывёлагадоўлі мы павінны арганізацыйна перабудавацца.

Трэба, таварышы, таксама паставіць пытанне аб ліквідацыі функцыяналкі і многазвенасці ў калгасе і ў МТС. У МТС існуюць вытворчыя ўчасткі. Паміж МТС, калгасам і калгаснай брыгадай ёсць непатрэбнае звяно ў відзе гэтых участкаў. Пытаемся: ці патрэбен гэты ўчастак? (Галасы з залы: Не, не). Большасць мясцовых работнікаў схіляюцца к таму, што вытворчыя ўчасткі не патрэбны. (Галасы з залы: Правільна) Мы не прапануем зараз вырашыць пытанне. Але прыходзіцца вырашыць пытанне, каб у масе сваёй вытворчыя ўчасткі ліквідаваць.

Звернемся да структуры калгаса. Нашы маленькія калгасы капіруюць структуру вялікіх. А ў краі не 60 процантаў калгасаў —гэта калгасы, якія маюць усяго 60-70 гаспадарак. Хіба можна капіраваць структуру аднаго калгаса з другога? Нельга. Вы ведаеце, што вялізарны кіраўнічы апарат у калгасах. Мы маем дырэктыву — скарачаць апарат, але з прыкмеры таго, што сістэма арганізацыі не змянена, і побач са старшынёй калгаса існуюць палявод, арганізатары працы, планавік, агранам, завгаспчык гаспадаркі і дзесятак іншых службовых асоб, то атрымлівецца, што калгас мае аднаўмадны функцыянальны апарат. У рэзультаце брыгадзір атрымлівае распараджэнні ад вельмі многіх людзей, а старшыня калгаса не заўсёды мае ўяўленне аб становішчы ў брыгадах. Вось, напрыклад, што піша адзін начальнік палітаддзела:

«Калі вы запытаеце старшыню праўлення, як справа з сённішнім заданнем па сяўбе, уборцы, малапоўе, то можаце заладзь быць упэўнены ў тым, што адказ будзе адзін: палявод яшчэ не прадставіў зводкі».

Бачыце, палявод яшчэ не прадставіў зводкі. Гэтыя звоткі здаў нашы калгасы. Трэба скарацець справаздачнасць, якая патрабуецца зверху ад нашых калгасаў, устанавіць непасрэдную сувязь паміж старшынёй праўлення і брыгадзірам. Трэба зрабіць старшыню праўлення поўнаўладным гаспадаром, які кіруе, дае распараджэнні.

Галасы з месц: Правільна.

Каганові ч:... які не спасылаўся-б на звычаі і на тое, што фуфайцы не даў іх.

Постышэў: Правільна.

Каганові ч: Таксама ў самой калгаснай брыгадзе не трэба дапускаць функцыянальшчыны. Трэба, каб брыгадзір быў на поўным вытворчым участку і адказваў поўнасцю за ўсё: за ворыва і за сяўбу, і за ўборку, і за інвентар, і за кадры, — словам адказваў-бы за ўсё. Трэба ператварыць брыгаду ў сапраўды асноўную вытворчую адзінку калгаса.

Адносіны паміж трактарнай брыгадай МТС і брыгадай калгаса — вельмі сур'ёзнае пытанне. Гэта пытанне вырашаецца па мясцах розна. Вядома, адзінага рэцэпта тут даць нельга, але, як я мыслю сабе справу, брыгадзір калгаснай брыгады ў частцы якасці работы павінен загадваць і кіраваць брыгадзірам трактарнай брыгады. Вазьміце вы брыгадзіра трактарнай брыгады. Каб больш ўкараць, больш аграшаваць, ён пускае часамі трактар быстрэй, плуг у яго скача, атрымліваюцца агрэхі. Паливы калгасны брыгадзір гаворыць: спыніся, дай направіць, пачакай хвіліну. А той, каб быстрэй выканаць норму, сунае далей, не лічачыся з якасцю работы. Паливы брыгадзір павінен мець права сказаць яму: я адказваю за якасць апрацоўкі і пакуль ты працуеш на маім участку, будзь ласкаў падпарадкавацца.

Я прыйшоў толькі асвятляючы частку арпытанняў, якія стаяць у справе далейшага кіраўніцтва МТС, калгаса, але і гэта паказвае, наколькі нам усім і ў цэнтры і на мясцах неабходна звяртаць увагу на арганізацыйныя пытанні, асабліва цяжка выраслае ў такой новай справе, як соцыялістычная сельская гаспадарка.

Што датычыць соўгасаў, то іх заставанне ў прадпрыемстве сельска-гаспадарчых работ у значнай ступені тлумачыцца дрэнным аўладаннем тэхнікай і грамоздкасцю соўгасаў.

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.).

Працяг даклада тав. Л. М. КАГАНОВІЧА

сяч, здавальняюча 7 тысяч і не вытрымалі 3 тысячы.

З 7-мі тысяч комсамольцаў, мабілізаваных на будаўніцтва Сталінградскага трактарнага, выйшлі ўжо сотні і тысячы высококваліфікаваных рабочых.

Цікавымі, а масавымі сталі факты, калі ўчарашні, зусім непісьменны, прышоўшы з вёскі чалавек, літаральна на працягу некалькіх месяцаў становіцца ўзорам у аўладанні тэхнікай. Такіх герояў можна прывесці сотні і тысячы і на прадпрыемствах Масквы, Ленінграда, Украіны, Данбаса, Баку, Урала і т. д.

Вось, напрыклад, адзін з такіх рабочых.

Тав. Лапцёў пашоў з вёскі на аўтазавод імя Молатава ў 1931 г. Ён папаў на работу побач з амерыканцам, працаваўшым у Амерыцы на такім-жа варштаце 12 год, у тым ліку 4 гады ў Форда. Амерыканец заявіў, што перавышэнне фордаўскай нормы (65 дэталяй у рабочы дзень) немагчыма. Тав. Лапцёў выклікаў яго на спаборніцтва і пачаў прыбаўляць па 5 штук, і зараз дабіўся выработку 130-140 штук у дзень. Адміністрацыя, грунтуючыся на вопыце т. Лапцёва, устанавіла норму ў 112 штук. Амерыканец вымушан быў да гэтай нормы падцягнуцца. Цікава, аднак, што прапануемага т. Лапцёвым дагавора аб соцспаборніцтве ён усё-ж падпісваць пакуль не хоча. «Нічога — гаварыў т. Лапцёў — даганю да 200 штук дэталяй, тады і амерыканец зразумее, што значыць соцыялістычнае спаборніцтва і падпішаша са мной дагавор па соцыялістычнаму спаборніцтву». **(Апладысменты).**

Тав. Лапцёў скончыў па тэхнічнае гурткі паладчыкаў, вучыцца ў гуртку па гісторыі партыі, сур'ёзна чытае і пройдзены тэмы ўсвоў дасканала.

Цяпер тав. Лапцёў не проста з'яўляецца кваліфікаваным рабочым, ён адначасова вядзе вялікую грамадскую работу.

У нашых калгасах яшчэ марна асвойваюцца камбайны, дрэнна працуюць нашы трактарысты. Аднак, у результаце правядзення ў жыццё рашэння ЦК аб арганізацыі спаборніцтва і перагадных-гоўскі кваліфікаваных рабочых для сельскай гаспадаркі, мы ўжо маем сотні і тысячы выдатных узораў, як учарашні Мішоха, які не ведаў машыны, не разумеючы, сёння становіцца сапраўдным змагаром за соцыялізм. Ён сапраўна на трактар і камбайн, авалодвае ім і дае ўзоры выканання нормы.

Нашы прафсаюзы гіганцкі вырасці. За гады першай пяцігодкі з 1933 год лік членаў прафсаюзаў павялічыўся на 6 мілёнаў. Вырас прафсаюзны актыў, асабліва низавы. Нельга параўнаць фабзаўкомы, якія былі ў порыўці старога прафсаюзнага трэцыянісцкага кіраўніцтва, з тымі фабзаўкомамі, якія мы маем сёння. Лік членаў фабзаўкомаў і групоргаў з 462 тыс. у 1929 годзе вырас да 1.200 тыс. чалавек.

Фабзаўкомы значна перабудавалі сваю работу і складаюцца ў аграмадзнай сваёй большасці з сапраўдных гаспадароў. Гэтыя людзі не хварэюць трэцыянісцкай хваробай, яны працуюць упарта і настойліва над ажыццяўленнем задачы па развіццю соцыялістычнага спаборніцтва і ударніцтва, па паляпшэнню вытворчасці. Зразумела, недахопы ў нашых прафсаюзаў агромістая колькасць, і Цэнтральны Камітэт настаўляе пытанне аб неабходнасці работы прафсаюзаў. Галоўная мета яшчэ не дасягнута. Мэта была — перабудаваць работу па вытворчаму прынцыпу з тым, каб кожны Цэнтральны Камітэт прафсаюза глыбока вёў сваю вытворчасць і патробы сваіх рабочых. Цэнтральны камітэты саюзаў маюць вялікую магчымасці разгарнуць работу, могуць абагульніць скапаныя дадзеныя. Чаму Цэнтральны Камітэт партыі меў магчымасць атрымаць ад рабочых Сібскучы матэрыял у галіне тэхніці, вытворчасці, арганізацыі кіраўніцтва і паляпшэння арганізацыі працы? Чаму Цэнтральны Камітэт партыі меў магчымасць выклікаць да сябе на нарадзе, па прапанове тав. Сталіна, прафсаюзнікаў шахтёраў з Данбаса і ў простай гутарцы, без заслаўленьскай бутэлькі, без грамоў, па шчырасці, без спецыяльнай рэзалюцыі атрымаць бліскучыя прапановы аб удасканаленні і заработнай плаце і прозвай арганізацыі працы, функцыянальцы і т. д.?

Імкнна, на аснове гутаркі з некалькімі прафсаюзнікамі і з некалькімі гаспадарнікамі Цэнтральны Камітэт зрабіў вялікія выводы. Прафсаюзы маюць велізарныя магчымасці, апіраючыся на ініцыятыву кожнага работніка, на ініцыятыву новых рабочых, стаўшіць перад урадам і ЦК пытанні.

На жаль, прафсаюзы яшчэ не ахопваюць скарыстоўваюць свае магчымасці. Яны не ўмеюць выявіць галоўнага і абагульніць факты. Эхлірыям заядае прафсаюзы. Яны гаворуць, яны жаліцца, яны стараюцца, але яшчэ не навучыліся абагульніць і правесці ў жыццё тое, што абмяркоўваюць. Мы маем у прафсаюзах людзей, якія шчыра хочуць працаваць; аднак, яны яшчэ не ўмеюць уначаліць гэтае кіраўніцтва, ініцыятывы і энергіі, якія ёсць на фабрыках і заводах, ва ўдарных брыгадах.

І ВЦСПС пытаннем выканаў дырэктыву ЦК, дырэктыву свайго з'езда па частцы прадстаўлення большай ініцыятывы цэнтральным камітэтам вытворчых саюзаў. Ён усё яшчэ трымае курс на ажыццяўленне поўнага кіраўніцтва толькі з ВЦСПС.

Прафсаюзы маглі-б даўно выявіцца ад канцылярычны і сведчання папер і ўстанавіць сувязь з жывымі людзьмі без той велізарнай колькасці паперы, якая ў іх яшчэ ёсць. Калі праглядзець пасяджэнні ці пратаколы кожнага цэнтральнага камітэта саюза, то мы ўбачым, што там людзі нагадуюць мяса, але там за паперай часта не бачаць ініцыятывы, актыўнасці і жывога жыцця, якое бе крыніцай у час на заводах і фабрыках. Прафсаюзам неабходна, на аснове рашэнняў з'ездаў партыі, перабудавацца і палепшыць сваю работу, выгнаць канцылярыцыну і ў большай мерэ арганізаваць творчую актыўнасць ударнікаў і ўсіх членаў прафсаюзаў.

Тут на з'ездзе ўжо адзначалася, што жанчына вырасла, як магутная, актыўная сіла і ў горадзе і ў вёсцы.

За перыад паміж з'ездам ў лікуючую гаспадарку ўцягнута 3½ мільёны жанчын. Зараз жанчыны складаюць ⅓ усіх рабочых і служачых СССР.

У калгасах мы маем зараз гіганцкі рух. Тав. Сталін з выключнай праніклівасцю вызначыў гэту новую ролю жанчын у нашым калгасным руху, якая змянілася пад уплывам гіганцкага росту гаспадаркі. Вы памятаеце, як у пачатку калектывізацыі жанчына выгрывала часта адмоўную ролю: ёй цяжка было развітацца са старымі звычкамі і прадуцыямі.

Зараз справа рэзка змянілася. Вось, напрыклад, мы правялі ў восенню масквоўскі абласны з'езд калгаснікаў. На ім з 989 дэлегатак ударнікамі былі ў Маскве 824 і ўдарнікамі ездзілі на чатырох — 466.

Я многа сходаў бачыў, але не бачыў такога пафасу, які быў тут. Толькі ў першыя гады Кастрычніцкай рэволюцыі мы бачылі такі пафас, адчувалася, што ўзнята сапраўдная, вялікая цаліна.

Адна з делегатак — старуха 60 год, выступаючы, расказала, якія труднасці перажыла. Яна закончыла сваю прамову зваротам да прэзідыума канферэнцыі: «Вы, кажуць, там бліжэй да ўраду, ці нельга напісаць урад выдаць такі дэкрэт, каб жыццё палепшыць, а смерць адмяніць (смех, апладысменты). Жыць хочацца, савецкая ўлада зрабіла нас людзьмі».

Зараз жанчына вырасла ўжо настолькі, што становіцца, вядзрчна гаварыць аб спецыфічнай рабоце сярод жанчын.

Нікалаева: Правільна.

Кагановіч: Можа здарыцца так, што хутка жанчына скажуць: трэба ўзмацніць работу сярод мужчын **(смех, апладысменты).**

Мы маем поўнае палепшэнне работы нашых советаў, як масавых арганізацый. Нашы советы пацярпелі свае сакуды. Зараз секцыі гаратскіх і сельскіх советаў — гэта ўжо не проста сход для гутарак. Секцыі маюць магутную матэрыяльную базу. Гаратскія гаспадаркі, разгарнуліся ў вялікіх размерах. Масавая работа советаў напоўнілася матэрыяльным зместам. Нашы секцыі советаў, дэпутацкія групы становіцца актыўнымі кіючымі ўдзельнікамі ва ўсёй будаўнічай рабоце. Гэта, зразумела, не азначае, што ў советах і іх апаратах няма недахопаў. Уся настаноўка пытання аб перабудове цалкам прыстасоўна і да іх.

Толькі па РСФСР у 1933 годзе ў кіраўніцтва дзяржавай праз секцыі было ўцягнута 1.513 тысяч чалавек і праз дэпутацкія групы — 338 тысяч чалавек.

Мы маем зусім новую фотму ўдзелу ў кіраўніцтве дзяржавай — шэфства рабочых заводаў над дзяржустановамі. Можна пракансультаваць рад паляпшэнняў у сабоце апарата, як результат шэфства заводаў над установамі.

Да ча таго, за апошні час шырока разгарнулася соцыялістычнай сумяшчальнасць работы на вытворчасці з работай у дзяржапараце. Павялічыліся дачных, толькі па лініі профсаюза работнікаў дзяржустаноў ёсць 7 з лішкам тысяч удзельнікаў шэфскіх брыгад і, апрача таго, каля 7 тысяч соцсумяшчальнікаў.

Да гэтага часа дадаць так званы грамадска-пролетарскі актыў па адпаведных галінах работы, які налічвае больш двух мільёнаў чалавек.

Кіраўніцтва гэтай работай павінны ўзяць профсаюзы, асабліва ў сувязі з новымі задачамі кантроля, ускладаемымі на іх тэзісамі. Профсаюзы павінны будуць пасапраўднаму арганізаваць низавы кантроль, асабліва ў органах снабжэння і гандлю.

Што датычыць комсамола, то ў тэзісах ЦК спецыяльна падкрэслена аслабленне яго работы па арганізацыі «лёгкай кавалерыі». Комсамол павінен арганізаваць работу «лёгкай кавалерыі», але весці яе не наскокам, а сістэматычна. Партыі патрэбна сур'ёзная дапамога, каб той сапраўдны бюракрат, які ёсць у апараце, не ўслізнуў ад вока. Нам патрэбна грамадская дапамога ва ўсіх кутах нашай работы. Возьмем нашу складскую гаспадарку. Тав. Сталін яе раз указваў нам: вось вам прынята рэзалюцыя аб паляпшэнні матэрыяльнага добрабыту працоўных, а ключы ад складаў знаходзяцца ў чалавека, які, нам здаецца, «маленькім» чалавекам. Але гэты «маленькі» чалавек ўладае адсмяшнай складской гаспадаркай, ад гэтага чалавека залежыць нагрузмак і хаванне тавара і часта залежыць правільнае яго размеркаванне.

Мы павінны сказаць і нашаму комсамолу, што і ў яго ёсць недахопы, што і ў іх ёсць пацерамаванне і жанцылярычны. Яны таксама запаста лёгка паддаюцца спісанню доўгіх рэзалюцый. Комсамол павінен быць у значна большай меры актыўнай дзейнічаючай сілай не толькі на заводзе, на вытворчасці, але і ў ячэйцы, і ў райкоме, і ў абкоме, і ў ЦК комсамола. Усюды комсамол павінен бачыць перад сабой асноўную мэту — вучыць моладзь працаваць і правяраць яе рэволюцыйнасць справамі.

Лягчэй вядома і агульную прапаганду весці, і рэзалюцыю прыняць, чым займацца крапатлівай работай—стаць складчыкам склада і т. д. Не шкодзіць сакратару райкома сесці на склад, не шкодзіць таму ці іншаму актывісту сесці непасрэдна на самую чарнавую работу, бо на чарнавой рабоце выраблюцца сапраўдныя камандзіры. У арміі ў сапраўднага камандзіра выраблецца той, хто прайшоў узвод, роту і полк. Калі комсамольцы хочуць быць камандзірамі, яны павінны прайсці школу чарнавой практычнай работы. Тады з іх выйдуць сапраўдныя комсамольскія, гаспадарчыя і дзяржаўныя кіраўнікі.

Задача нашай партыі заключаецца ў тым, каб, паляпшаючы работу грамадскіх арганізацый, паляпшаючы работу профсаюзаў, паляпшаючы работу комсамола, узнімаць у той-жа час нашу палітычную работу ў масах, згуртоўваючы яшчэ цясней масы вакол партыі.

2. ПАРТЫЯ МОЦНА АДЗІНСТВАМ ВОЛІ І ДЗЕЯННЯЎ, АКТЫЎНАСЦЮ І САМААДДАНАСЦЮ ЎСЁЙ ПАРТЫІ У ЦЭЛЫМ, КОЖНАГА ЧЛЕНА ПАРТЫІ Ў ПААСОБКУ

Але для ўсяго гэтага неабходна, каб і сама партыя перабудавала свае рады і прадаўжала-б паляпшаць усю сваю работу.

Таварышы, адказнасць нашай партыі за далейшы лёс соцыялістычнага будаўніцтва не толькі не змяншаецца, а наадварот павялічваецца.

Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін не раз падкрэслівалі вялікае значэнне партыі, яе кіраўніцтва для перамогі пролетарыята. Уся дзейнасць нашай партыі была жывым доказам правільнасці гэтых палажэнняў. Тое, што зрабіла наша партыя за апошнае пяцігоддзе, падымае ўсё пытанне аб ролі і значэнні партыі і яе кіраўніцтва на новую небывалую вышыню.

І поспехам нашай справы, поспехам нашага генеральнага наступлення мы абавязаны перш за ўсё таму, што вялікі прадаўжальнік Леніна тав. Сталін змог умацаваць самае дарагое, самае раша ючае з усёй спадчыны Леніна, — іменна нашу вялікую ленінскую партыю **(апладысменты).** Я падкрэсліваю — захаваць і ўмацаваць таму, што пасля смерці Леніна пачаліся спробы расцягнуць партыю на фракцыі і групоўкі, раскалоць яе рады, аслабіць яе сілы і тым самым загубіць пролетарскую дыктатуру. Трэба было аўладаць ленінскай сілай прадбачання, каб таксама, як Ленін у 1903 годзе ўбачыў у супярэчнасцях па першаму пункту статута будучае здрадніцтва меншавікоў, таксама і ў 1923 годзе трэба было прадугледзець канчатковае скочванне трацкістаў на контррэволюцыйны шлях, скончванне ўсіх астатніх апартуністычных груповак на шлях здрадніцтва інтарэсам пролетарскай рэволюцыі.

Трэба было не толькі прадугледзець. Трэба было мабілізаваць партыю для таго, каб разбіць гэтыя раскольніцкія групоўкі і правесці нашу партыю да данага 17 з'езда магутнай, адзінай, маналітнай сілай.

Іменна гэта маналітнасць, імен на ўвесь урок нашай барацьбы за соцыялізм і дазваляе нам запісаць у новай рэдакцыі статута, што на ша **«партыя з'яўляецца адзінай баявой арганізацыяй, звязанай свядомай жалезнай пролетарскай дысцыплінай. Партыя моцна сваёй згуртаванасцю, адзінствам волі і адзінствам дзеянняў, несумяшчальных з адступленнем ад праграмы, парушэннем партыйнай дысцыпліны і з фракцыйнымі групоўкамі ўнутры партыі. Партыя кіруе ўсімі органамі пролетарскай дыктатуры і забяспечвае паспяховую пабудову соцыялістычнага грамадства».**

Наша партыя—не проста кіруючая партыя. У розных краінах ёсць кіруючыя партыі, але там гэтыя партыі сугуба абмежаваны імкненнямі замацаваць існуючы буржуазны лад. Наша партыя—кіруючая партыя соцыялістычнай дзяржавы. Сэнс існавання, сэнс работы нашай партыі заключаецца іменна ў тым, каб будаваць соцыялізм і перамагаць. А гэта накладвае на кожнага члена партыі і на ўсю нашу партыю зусім асаблівыя, выключныя абавязкі. **Галоўная адзнака партыйнасці большэвіка—роля авангарднага байца за соцыялістычныя адносіны да працы, роля арганізатара соцыялістычнага спосабу вытворчасці ў прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы.**

Вось чаму ў новай рэдакцыі статута разгорнуты новыя пункты аб членстве, аб абавязках кожнага члена партыі. У пералік гэтых абавязкаў мы ўключылі, побач з прызнаннем праграмы, уплатай членскіх узносаў і ўдзелам у рабоце, цэлы рад новых пунктаў, у якіх падкрэсліваюцца абавязацельствы члена партыі ў адносінах вытворчасці, ударніцтва, барацьбы за ўмацаванне радоў партыі і ў адносінах абавязацельстваў да дысцыпліны партыі і дзяржавы.

«Член партыі абавязан:

а) захоўваць найстражэйшую партыйную дысцыпліну, прымаць актыўны ўдзел у палітычным жыцці партыі і краіны, праводзіць на практыцы палітыку партыі і рашэнні партыйных органаў;

б) пастомна працаваць над павышэннем сваёй ідэйнай узброенасці, над усваеннем асноў марксізма-ленінізма, важнейшых палітычных і арганізацыйных рашэнняў партыі і растлумачваць іх беспартыйным масам;

в) як член кіруючай партыі ў савецкай дзяржаве, — быць узорам захавання працоўнай і дзяржаўнай дысцыпліны, аўладаць тэхнікай сваёй справы, безупынна павышаючы сваю вытворчую, дзелавую кваліфікацыю».

Аб чым гавораць новыя пункты статута? Яны гавораць аб тым, што кожны ўступаючы ў партыю павінен быць гатовым дакладна і пяўхільна выконваць усе ўказанні партыі, у першую чаргу пералічаныя ў статуце, а кіруючыя органы абавязаны выхоўваць повага члена партыі так, каб ён быў здолен не на словах, а на справе ажыццяўляць гэтыя важнейшыя абавязкі кожнага члена кіруючай партыі. **Бо наша партыя моцна актыўнай дзейнасцю, самаадданасцю ўсёй партыі ў цэлым, кожнага большэвіка ў паасобку.**

Вось чаму, таварышы, разам з падёмам значэння і ролі нашай партыі на новым этапе соцыялістычнага будаўніцтва падымаецца роля і значэнне кожнага члена партыі. Мы ставім з усёй вострасцю пытанне аб парадку прыёму ў партыю, парадку ідэйнага ўзбраення кожнага члена партыі.

Апошнія гады, будучы гадамі падёму палітычнай актыўнасці рабочых і калгасных мас, натуральна ўзмацнілі прыток гэтых мас у партыю. Аднак, мы, партыйныя работнікі на мясцах, не здолелі ўсю гэту масу належным чынам праверыць, выхаваць і замацаваць. Мы павінны чэсна сказаць гэта перад XVII з'ездам партыі. Прымалі ў партыю недастаткова асцярожна, часта вельмі неахайна.

Зразумела, у рабочым класе ёсць імкненні і вялікая актыўнасць да ўступлення ў партыю. Гэту актыўнасць ён хоча выліць у арганізаванай форме, уступаючы ў большэвіцкую партыю, але мы не можам у перадавую авангардную партыю прымаць толькі таму, што ён добры рабочы, чэсны чалавек. Такіхжа чэсных беспартыйных у краіне вельмі многа.

Калі брыгада ЦК ездзіла ў Данбас, то высветліла, што, напрыклад, у парт'ячэйцы шахты «Лідзіеўка» лічылася 391 комуніст (памятаю, мы гэта адзначалі на раённым сходзе ў Сталіно), а фактычна аказалася—250, на 140 чалавек менш, таму што прымалі ў партыю механічна, частка прынятых ушла з шахты, не знімаючыся з учоту.

Былі і такія факты скажэння. У часе чысткі на Лысвенскім заводзе высветлілася, што ў парадку спаборніцтва паміж сакратарамі ячэек двух цэхаў, паміж сакратаром ячэйкі жэсць № 1 Коласавым і сакратаром ячэйкі жэсць № 2 Бронікавым быў заключан дагавор... на вярбоўку ў партыю 100 чалавек. З прычыны таго, што Колаваў завербаваў толькі 99 чалавек, то адзін з членаў партыі, каб выручыць свайго сакратара, запісаўся ў партыю ў другі раз. **(Смех).**

Гэта, таварышы, не анекдот, гэта факт. Калі гэта высветлілася і запыталі гэтага члена партыі, то ён заявіў: «Нельга-ж падводзіць свайго сакратара, каб ён не выканаў дагавора. Ну, я і запісаўся, каб наша ячэйка была першай у спаборніцтве». **(Смех).**

Гэта паказвае, да чаго даводзяць скажэнні. Няўважлівы, а часамі ліберальны падход да прыёму ў партыю,—што-ж, моў, чалавек просіцца, чаму-ж яго не прыняць, —прыводзіць часта да таго, што ў агульным патоку прыёму ў партыю найлепшых людзей нашай эпохі, якія ідуць для актыўнай барацьбы ў перадавую партыю, прабіваюцца ў рады партыі людзі, не толькі не падрыхтаваныя тэарытычна і практычна, але і людзі чужыя партыі, кар'ерысты, шкурнікі, людзі якія не вераць у перамогу партыі, не могуць успрыняць жалезнай пролетарскай дысцыпліны партыі і пролетарскай дзяржавы.

Вы ведаеце, партыя прадпрыняла чыстку. Тав. Рудзутак падрабязна спыніўся на чысткі ў сваім дакладзе. У часе чысткі мы выключылі з партыі 182,5 тыс. комуністаў. Усяго выключана з партыі 16,8 проц. З іх па катэгорыях выключэння: класава-чужых—2,7 проц., двурушнікаў—0,9 проц., за парушэнне дысцыпліны—3,5, пераражэнцаў — 1.5 проц., адносячыхся да групы кар'ерыстаў і шкурнікаў 1,4 проц., за бытавое і маральнае разлажэнне—2 проц., за пасіўнае прабыванне ў партыі 4,2 проц. і па іншых прычынах—0,6 проц.

Па партыйнаму стажу найбольшы процант выключаных падае на маладых членаў партыі; каля паловы выключаных складаюць уступіўшыя ў партыю ў 1929 г. і пазней.

Што і гаварыць, пяцігодка нас падняла. Рабочы клас і мы ўсе былі захвачаны і захапіліся пафасам будаўніцтва. Рабочыя ішлі ў партыю. Мы прымалі іх тысячамі, але мы не праявілі ў дастатковай меры той строгасці ў прыёме, якая павінна была быць. Чыстка дала нам вялікія рэзультаты, але куды лепш было-б, калі-б мы з вамі больш строга прымалі, тады менш прышлося-б вычысціць.

Галасы: правільна.

Кагановіч: Трэба адкрыта сказаць, што ў партыйных апаратах не толькі сакратар, але нават загадчык аддзела не заўсёды сам асабіста рэгуляваў працас прыёму ў партыю. Прыём у партыю вёў той ці іншы работнік, які кіраваў адпаведным сектарам партыйнай работы.

Вось чаму, таварышы, у тэзісах па аргпытаннях і ў новай рэдакцыі статута дзецца агульны курс на больш сур'ёзны падыход да прыёму ў партыю. Мы будзем прадаўжаць прыём у партыю. Пасля чысткі лепшым перадавым людзям з рабочага класа калгаснікаў і працоўных будзе дана магчымасць уступіць у рады партыі, але мы павінны правяраць, ці дарос ужо даны таварыш да партыі. У тэзісах і статуце перш за ўсё падкрэслена, што прыём у члены партыі робіцца выключна ў індывідуальным парадку, што ў члены партыі прымаюцца рабочыя, калгаснікі, чырвонаармейцы, студэнты і служачыя, праявіўшыя сябе на рабоце ў групах спачуваючых, у прафсаюзах, советах, комсамоле, канперацыі, дэлегацкіх сходах, пасля атрымання водзываў той арганізацыі, у якой уступаючы працуе, г. зн. людзі, прайшоўшыя школу актыўнай грамадска-палітычнай работы.

Вы чыталі ў статуце, якія катэгорыі ўстанаўляюцца пры прыёме ў партыю, што пры прыёме ў партыю для рабочых патрабуецца выдворчы стаж не менш пяці год, што патрабуецца павялічэнне рэкамендацый і павялічэнне партыйнага стажа рэкамендацеляў. З асаблівай сілай падкрэслена, што **рэкамендуючыя нясуць за рэкамендуемых адказнасць, падлягаючы, у выпадку негрунтоўных рэкамендацый, партыйным спагнанням аж да выключэння з партыі.**

Але мы, таварышы, павінны помніць, што самі гэтыя пункты не вырашаюць яшчэ справы. Знойдзе чалавек і пяць рэкамендацый і не толькі з пяцігадовым, але і з дзесяцігадовым стажам. Тут трэба, каб прыём у партыю стаяў на такой-жа вышыні, на якой стаіць наша партыя ў цэлым, і каб кожны жадаючы ўступіць уяўляў-бы сабе, што значыць наша вялікая партыя і якія яна прад'яўляе патрабаванні кожнаму свайму члену.

Побач з гэтым мы ўстанаўляем групы спачуваючых. Партыя ўлічвае, што ў рабочым класе і калгасным сялянстве побач з масай беспартыйных, актыўна падтрымліваючых партыю і совецкую ўладу, выдзяляюцца групы рабочых актывістаў, якія падняліся на вышэйшую ступень і больш на блізіліся да партыі, чым астатнія.

Мы даем магчымасць такім актывістам, якія на адну ступеньку яшчэ не дараслі да партыі, успрыняць навыкі арганізаванасці і перадавітасці спачатку ў групах спачуваючых. Гэта справа вельмі важная і добрая, трэба толькі яе не сапсаваць. Трэба, каб партыйныя арганізацыі аддавалі групам спачуваючых адпаведную ўвагу і сапраўды вялі сярод іх кваліфікаваную ідэйна-палітычную работу.

Чалавек павінен прывыкнуць к партыйнай дысцыпліне, аднак, мы не ўстанаўліваем, як правіла, што ў партыю ўступаюць толькі праз групы спачуваючых.

Такім чынам, таварышы, першы і асноўны вывад з новай задачы, гэта — вялікая сур'ёзнасць да пытанняў прыёму ў партыю, тады менш прыдзецца выключаць. Работа па прыёму ў партыю ёсць самая важная справа для ўсіх работнікаў партыйных камітэтаў знізу да верху, у першую чаргу сакратароў, якія абавязаны асабіста кіраваць такой важнай справай, як прыём у нашу вялікую партыю.

3. АБ ІДЭЙНЫМ УЗБРАЕННІ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ

Арганізацыя правільнага прыёму ў партыю — гэта яшчэ поўсправы. Неабходна забяспечыць, каб нова прыняты член партыі, ужо будучы ў яе радах, правільна ідэйна ўзброіваўся, рос, адчуваў-бы штодзённае кіраўніцтва сваёй дзейнасцю, актыўна ўцягваўся ў работу партыі і загартоўваўся палітычна. Калі мы гаворым аб марксісцка-ленінскім выхаванні, мы гаворым не толькі аб школьным выхаванні, мы гаворым аб ідэйным узбраенні большэвіка. Члена партыі трэба выхоўваць у партыйнай школе і галоўнае—на практычнай рабоце. Гэта значыць, што мы павінны падняць на большую вышыню марксісцка-ленінскае выхаванне членаў партыі і палепшыць работу партыйных арганізацый.

За гэтыя гады ў нас пашырылася і вырасла сетка нашых партыйных школ і гурткоў. Калі ў 1930 годзе было 52 тысячы школ і гурткоў партасветы, ахапляючых мільён з лішнім слухачоў, то ў жніўні 1933 года мелася ўжо 210 тысяч школ і гурткоў, ахапляючых 4½ мільёна слухачоў, у тым ліку 2.200 тысяч беспартыйных. У нас ёсць 130 тысяч прапагандыстаў, г. зн. у пяць раз больш, чым у 1928 годзе, з іх 10 проц. скончылі ІКП, комвузы і курсы марксізма і 25 проц. стацы янарныя соўпартшколы. Сярод прапагандыстаў—51 проц. рабочых (а ў 1928 годзе было ўсяго 8 проц. рабочых).

Мы маем сякі-такі рух наперад у частцы разгортвання сеткі завочнага навучання. У нас існуе спецыяльны інстытут завочнага навучання па радыё. Аднак, тав. Кіраў, які тут абгаворвае яшчэ, калі ён гэта гаварыў аб адставанні нашых работы па марксісцка-ленінскаму выхаванню.

Большэвік не можа абмяжоўвацца простай верай у соцыялізм падобна таму, як верыць рэлігійны чалавек у шчастя небесае. Не, большэвік — гэта член такой партыі, праграма, палітыка і тэктыка якой будуюцца на строга навуковых асновах марксізма-ленінізма; большэвік, гэта той, хто разумее неабходнасць краху капіталізма, неабходнасць дыктатуры пролетарыята, якая забяспечвае перамогу соцыялізма. Вось чаму кожны член партыі павінен авалодаць асновамі марксізма-ленінізма.

Як магчыма гэта? Безумоўна магчыма. Вось-жа ў часе чысткі, калі было пастаўлена пытанне аб правярэнні падрыхтаванасці комуністаў, за поўгода было зроблена ў аўладанні асновамі марксізма-ленінізма больш, чым у два гады звычайнай культурэспаўскай работы.

Галасы: правільна.

Кагановіч: неабходна падняць узровень нашай работы па марксісцка-ленінскаму выхаванню членаў партыі. Мы павінны ў куды большай меры вывучаць літаратуру марксісцка-ленінскую, сталінскую.

Мы правялі зараз агрэгіяум, тэхмінімум. Нам трэба дабіцца, каб быў партпалітмінімум і каб не было ніводнага члена партыі, не аўладаўшага асновамі марксізма-ленінізма. **(Апладысменты).**

Тут быў даклад т. Мануільскага. У суразі з разгорнутымі ім задачамі бліжэйшых комуністычных партый і міжнароднага комуністычнага руху, мы павінны ў моцніць інтэрнацыянальнае выхаванне комуністаў. У нас часта інтэрнацыянальныя пытанні абмяркоўваюцца ў парадку кампаніі — ад аднаго пленума ВКП да другога. Гэтага мала. Трэба, каб інтэрнацыянальнае выхаванне вялося сістэматычна. Трэба, каб члены партыі былі ў курсе ўсіх асноўных рашэнняў, асноўных дзействуючых сіл па сусветнай арэне.

Вы чулі тут калгаснікі Даброву, чулі некаторых рабочых, якія выступалі, і косныя з вас пераканаліся сваёй практыкай — і масквічы, і ленінградцы, і украінцы, і уральцы, што ёсць выдатныя самагонкі рабочых, якія пачыналіся і выраслі за гады пяцігодкі. Аднак, калі ўзяць пытанне вясковага комуніста, на што ён скарыстаў больш за ўсё і якія ў яго пытанні? Дайце мне такую анкету, вазучыце мяне, каб я ўсё разумеў.

Тав. Сталін часта паторгае літаратараў і нашы газеты ў тым, што яны, не лічачыся з узроўнем шырокіх мас, датускаюць хіба гэта роду скарочаныя словы. Вось вышуць, напрыклад, аб міжнародным юнгштурме дні і абавязкова ўбачыце: МЮД.

Мы паслалі тав. Шолуна з сельгасаддзела ЦК у вёску, каб вывучыць, на якія кнігі там патрабаванне, якавы там узровень чытача. Ён высветліў, што ён гэта мала. Тав. Шолун у гутарцы запытаў: ці разумееце вы, што такое МЮД? Адзін комуніст адказаў яму: «МЮД, гэта было, атрымаў слова, рэволюцыйнае свята». Але якое свята, што значыць слова МЮД? Не ведаю, таварышы.

Або возьмі нашы газеты, там часта сустракаецца слова ІТР. У нас вераюць, што так скарочана называюць інжынерна-тэхнічных работнікаў. А вось вясковы комуніст чытае ІТР і не ведае, што гэта такое за ІТР? У газетах такое скарачэнне: чатыры кв. Што такое 4 кв? Вясковаму комуністу, ды і не толькі яму пляна заканчэння, што за тым скарочэннем хаваецца слова: чацверты квартал. Я гавару гэта не для таго, каб смяяцца над чалавекам, як не вялікае простае рэчай. Не, хутчэй смяяцца трэба над тымі, якія так пішуць для рабочых і сялян.

Галасы. Правільна. **(Апладысменты).**

Кагановіч: Таварышы, мы навучылі многа комуністаў у ІКП, комвузах, курсах марксізма. Гэтыя людзі накапілі пэўны капітал ведаў. Велізарная большасць стараецца працаваць добра. Партыя мае права патрабаваць ад іх, каб яны з усёй энергіяй і напружанасцю разгарнулі партыйна-палітычную вучобу і поўнасцю запланілі-б партыі на вексалях. Але я павінен сказаць, што частка гэтых людзей не ўмее яшчэ звязаць пытанні тэорыі з пытаннямі практыкі.

Ленін заўсёды звязваў тэарытычныя пытанні са штодзённай практыкай. Сталін паказвае нам узоры, як спалучаць складанейшыя тэарытычныя пытанні са штодзённай барацьбой. А вось многія з нашых ікапістаў у адну клетачку кладуць тэорыю, а ў другую—практыку, а звязаць гэтыя дзве клетачкі разам не могуць. На жаль, частка нашых прафесароў замест злучэння тэорыі з практыкай пішуць глыбокамысленныя трактаты на тэму—вяроўка—верве простае,—а дзеля таго, што ў Маркса і Энгельса накопт гэтага нічога няма, то яны лічаць, што гэтым самым паглыбляюць і ўзбагачаюць скарбніцу марксізма. **(Смех).**

(ПРАЦЯГ НА 5 СТАР.).

Працяг даклада тав. Л. М. КАГАНОВІЧА

Тав. Сталін ужо сказаў тут, што пытанне разузбуйнення соўгасаў паставіў ЦК. Тав. Юркін мне га раз'язджае па мясцах, ён блізкі да жыцця. Аднак, калі ён прыязджае ў Маскву, ён завалены такім аграмадным функцыянальным апаратам, такой колькасцю папяровай пісаніны, што аказаўся ня здольным абагуліць гэты мясцовы вопыт. Галоўная слабасць нашых соўгасаў — гэта іх грамоздкасць, а таксама грамоздкасць кіраўніцтва як у самых соўгасах, так і ў Наркамсоўгасаў, функцыянальнічына развіта ў Наркамсоўгасаў не менш, чым у другіх наркаматах. З дванцаці аднаго вытворчага кіраўніцтва толькі шасць з'яўляюцца вытворчымі, у сапраўдным сэнсе, астатнія — функцыянальныя.

Дазвольце прывесці прыклад, які паказвае да чаго прыводзіць функцыяналка ў апараце Наркамсоўгасаў.

Існуе такі соўгас — «Малочнае». Да красавіка 1933 года соўгас знаходзіўся ў веданні ўсесаюзнага малочна-племяннога трэста. 16 мая 1933 года, згодна ўказанням нам. Наркамсоўгасаў тав. Герчыкава, соўгас ператвараецца ў самастойную гаспадарчую адзінку. 11 нерэвня 1933 года, —праз месяц пасля загаду т. Герчыкава — тав. Юркін перадае соўгас у Паўночны маслатрэст. У той-жа дзень, 11 чэрвеня, калі т. Юркін падпісваў загад аб перадачы гэтага соўгаса ў Паўночны маслатрэст, — вам, наркома тав. Грушэўскі выдае загад аб замацаванні соўгаса за... Паўночным навукова-даследчым інстытутам. **(Галасы:** Вось парадкі!).

21 чэрвеня 1933 г. т. Герчыкаў атрымлівае паведамленне ад пашткіраўніцтва, што яго загад ад 16 мая не выкананы. Тав. Герчыкаў не ведаў, што яго загад ад менен наркомам, а загад наркома, у сваю чаргу, быў адменен другім нам. наркома **(смех).** Тав. Герчыкаў піша ва гэтым паведамленні наступную рэзалюцыю: «Тав. Львоў, з прыстрасцем правядзіце асабіста допыт, хто шкодзіць і ідзе зарганізуе работу наркамата **(гамерычны хохат)** і ўводзіць у зман калегію. У рэзультаце расследвання вінаватых вытпаць з апарата **(шум, смех),** каб другія памяталі чатыры пяцігодкі». **(Хохат усёй залы).**

Адзін вузялок завязаў, другі развязаў **(смех, апладысменты).**

Трэба аддаць справядлівасць, тав. Герчыкаў вялікі аптыміст, ён разлічвае, што ў такім апараце памяць можа захавацца чатыры пяцігодкі **(смех),** у той час, як не толькі памяць, але і розум можна страціць у адзін дзень **(смех, апладысменты).**

Справа-ж скончылася, таварышы, тым, што ЦКК-НК РСІ канстатаваў, што соўгас даведзен да агіднага становішча. Цяпер тав. Юркін даў справаку аб тым, што зараз справы соўгаса паляпшаюцца.

Дык вось, тав. Юркін і соўгаснікі, вам трэба не толькі перабудаваць і разузбуйніць соўгасы але і перабудаваць свой наркамат. У нас працуе камісія, яна сваёй работы не скончыла. Пасля з'езда партыі, я спадзяюся, гэтай справай мы займемся і безумоўна такіх завязванняў і развязванняў вузялкоў больш не будзе **(апладысменты).**

4. АРГПЫТАННЕ І ПАЛЯПШЭННЕ СПРАВЫ ТАВАРАЗВАРОТУ

На гэтым з'ездзе і яшчэ да з'езда т. Сталін паставіў з усёй вострасцю пытанні тавараазвароту й транспарта.

ЦК змагаўся з загатаварваннем, з нецэлесным засылкай тавараў, з планаваннем толькі ў рублях, ка лі ігнараваўся асартымент і над маркай «галантарэі» ў адну вобласць пасылалі вагоны сабачых нашыйнікаў у такой колькасці, што можна было ўсіх сабак адзець з ног да галавы, у другую адпраўлялі тоны лампавых гарэлак, але без лампавага шкла, у трэці — лампавае шкло без гарэлак і т. д.

ЦК займаўся пытаннямі арганізацыі магазінаў, ларкоў, разгортвання гандлёвай сеткі.

Мы змагаліся супроць бюракратычнай сістэмы размеркавання, якая звяла гандаль на нішто і з'яўляецца яркім выражэннем «ляўацкага» ўхілу ў тавараазвароце.

Арганізацыйныя пытанні тавараазвароту яшчэ поўнасцю не распрацаваны, хоць-бы так, як у прамысловасці. У арганізацыі тавараазвароту наша задача зводзіцца, па-першае, да нармальнага, быстрага і культурнага водпуску тавараў з магазінаў і, падругое, да правільнага рэгулявання і планавання гандлю, да правільнай дастаўкі тавараў у магазіны, улічваючы попыт спажыўцоў, неабходнасць першачарговага снабжэння тых груп спажыўцоў, якія маюць асабліва важнае значэнне ў народнай гаспадарцы.

Якое-ж становішча ў магазіне? Можна падумаць, што ў магазіне, дзе павінен ісці гандаль, большасць работнікаў — пакупцы. Але гэта не так, таварышы.

Павсюдна даных выбарачнага абследвання, толькі 25 проц. гандлёвых работнікаў з'яўляюцца ўласна, прадаўцамі; астатнія — гэта заг. секцыямі, адзелам, пом. загатчыкаў, пом. загатчыкаў, касіры і т. д. Патрэбны і гэтыя людзі, але не да беспрытомнасці. Накладныя расходы велізарныя, а пакупец стаіць у чарзе, тавар адпускаецца яму неакуратна, бо не хапае прадаўцоў.

Прадавец атрымлівае малую зарплату. Тым часам штаты абслугоўваючага персанала павялічваюцца, накладныя расходы велізарныя ў выніку таго, што кашы ляршчына пісаніна ўкараніліся ў такую ступень, дзе здавалася-б, можна за ўсё ім месца, — у гандаль, у магазіны.

Папер у магазінах пішуць велізарную колькасць. Людзі пішуць, а пакупцы часта вымушаны стаяць у чарзе. Гэта і ў сетцы Наркамснаба і у асаблівасці ў магазінах спажыўкааператыў.

Трэба вызваліць загатчыкаў (магазінамі ад дробнай апекі, даць ім больш правоў, ініцыятывы. Трэба даць заг. магазінам права выбіраць тавары, самому вызначаць асартымент тавараў у межах свайго задання і плана па тавараавароту. Трэба прадаставіць права заг. магазінам панбіраць сабе прадаўцоў, рэзка скарачыць аппіні страцыйны абслугоўваючы персанал. Трэба, нарэшце, акружыць гандлёвых работнікаў той увагай, якой заслугоўвае адказнейшы участак тавараавароту.

Калі расшырыць правы заг. магазінам, то сваёй ініцыятывай ён знойдзе новыя крыніцы тавараў, будзе стымуляваць саматужныя арцелі, рабіць уплыў на якасць прадукцыі.

Некаторы ўзор больш культурнага гандлю даюць магазіны дзяржгандлю, якія пяддаўна арганізаваліся. Там менш цяганіны, менш папер; там прадаўцоў больш, а чаргі менш. Але і там ёсць яшчэ недахопы.

Трэба падкрэсліць, што арганізацыйнымі пытаннямі тавараавароту не займаліся, людзі ведалі толькі адно — тавары распісаць, размеркаваць, адправіць. Але ці пападуць тавары ў патрэбнае месца, у які склад, ці дойдзе тавар да пакупца, ці дойдзе туды, куды трэба — гэтым слаба цікавіліся.

Возьмем складскую гаспадарку. Магазін і склад — асноўныя звенні гандлю. Складской гаспадаркай не займаліся ні гуртавой, ні раздробнай. Гэта буйнейшая справа, якую мы павінны арганізаваць.

Адзін час мы рэзка крытыкавалі маскоўскіх кааператараў. Магазінаў у нас многа, а чаргі ёсць. Чаму вы, кааператары, сядзіце ў канцылярыях, паязджайце ў магазін, паглядзіце на месцы і выпраўце недахопы. Прышлося для прыкладу самім паехаць і на практыцы павучыць, як уваходзіць у дэталі арганізацыі гандлю.

Прышлі ў магазін. Стаіць вялікая чарга за гуркамі. Гуркі ёсць, але выдаюць іх з маленькага вядра. Кожны раз, як вядро апараж няецца, прадавец бяжыць у падвал за новым вядром, а чарга стаіць. Прышлі мы інкогніто. Пытаемся прадаўца — чаму ў вас чарга? Гуркі ёсць? Спачатку адказаў, што няма, потым сказаў — ёсць, але нямнога і ў падвале, пасуды, бач, няма, каб наверх выцягнуць. Нам засталося палезці з загадчыкам магазіна ў падвал. Там аказалася вялікая колькасць бочак з гуркамі і без гуркоў. Але людзі не здагадаліся паставіць некалькі бочак у самым магазіне, замест таго, каб з вядзерцам хадзіць кожны раз у падвал. Жонкі рабочых стаяць у чарзе і правільна лаюць арганізацыю гандлю, але ад гэтага не лягчэй. Прышлося ткнуць носам нашых кааператараў для таго, каб яны занялися гэтымі простымі пытаннямі арганізацыі гандлю, якая так бліска закранае інтарэсы мас.

Калі вы возьмеце планаванне тавараў і рэгуляванне гандлю, то тут затор велізарны. Для таго, каб размеркаваць фонды па 12 планаваных таварах, неабходна прайсці праз 20 інстанцый. Вы можаце сабе ўявіць, колькі паперы спісваецца, колькі часу людзі засядаюць, пакуль план зацвярджаецца. Нарэшце, гэта часта супадае не з пачаткам, а са сканчэннем квартала.

Таму з-за слабасці ўнутранай арганізацыі Наркамснаба і Цэнтрасаюза фактычна атрымліваецца так: план планам, а адгрузка тавараў ідзе самацёкам.

У прыватнасці, неабходна адзна чыць, што зараз сельспажыўтаварыствы павінны стаць у цэнтры ўвагі Цэнтрасаюза, усякаму зразумела тая аграмадная не толькі гаспадарчая, але і палітычная роля, якую набываюць зараз сельспажыўтаварыствы ў справе развіцця тавараавароту і культурнага совецкага гандлю ў вёсцы. Сельспажыўтаварыствы павінны быць узняты на палітычную вышыню. **Работа ў сельспажыўтаварыствах павінна лічыцца такой-жа ганаровай, як работа ў праўленні калгаса, у сельсавеце.**

Я не спыняюся падрабязна на арганізацыйнай структуры Наркамснаба, Цэнтрасаюза і іх краявых —абласных органаў. Гэта структура хварэе таксама функцыяналкай, раздутымі штатамі.

Наколькі раздуты штаты Цэнтрасаюза, паказвае наступнае: на 3 квартал 1933 г. устаноўлены штаты ў 1.563 чал. супроць 2855 чал. у IV квартале 1932 г., г. зн. на 46 проц.).

І ад гэтага тавараснабжэння не пагоршылася, а работа Цэнтрасаюза павінна палепшыцца.

Я ўпэўнен, калі скараціць апарат Цэнтрасаюза і НКСнаба і палепшыць унутраную арганізацыю, папэўна будзе лепш. Наркамснаб і Цэнтрасаюз змогуць тады дайсці да магазіна, склада, будуць кіраваць гандлем не фармальна, а па сутнасці **(апладысменты).**

5. ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПРАВЯДЗЕННЕ Ў ЖЫЦЦЁ РАШЭННЯ ЦК І СНК АБ ПЕРАБУДОВЕ ТРАНСПАРТА

Аб транспарце гаварылі многія, гаварылі правільна, гаварылі востра. Гаварыў тав. Сталін, гаварылі т.т. Варашылаў і Кіраў, гаварылі і іншыя аратары. Выступаў і тав. Андрэеў.

Я хачу сказаць перш за ўсё аб водным транспарце. Водны транспарт у нас яўна недаацэньваецца. Вытворчая арганізацыя ў воднікаў найбольш простая — параход, прыстань, затон, суднарамонтны завод. А на справа і ў іх функцыяналка, безадказнасць і абязлічка.

Вы думаеце, што параходства распараджаецца суднарамонтам? Памыляецеся. Параходства кіруе эксплаатацыяй параходаў, але для таго, каб адрамантаваць свой параход, яно павінна звярнуцца ў спецыяльную цэнтралізаваную арганізацыю ў Наркамводзе — Судна будрамонт. Функцыянальнымі распараджэннямі НКВод збіраецца кіраваць рамонтам кожнага парахода. У Наркамводзе існуе яшчэ галоўнае рэчнае кіраўніцтва (РЭТУ). Гэта кіраўніцтва распараджаецца, прыкладна, 70 проц. усяго воднага транспарта. Гэта тое-ж што мы мелі раней у НКШЗ — Галоўцужэл, які распараджаўся 75 проц. усёй гаспадаркі НКШ. Неабходна гэта рэчнае кіраўніцтва ліквідаваць і арганізаваць кіраўніцтва рэчным транспартам прыстасоўка да рэчных сістэм. Камісія ЦК намячала чатыры такіх кіраўніцтвы Наркамвода: Волжска - Камскае, Паўночнае, Паўднёвае і Азіяцкае (Сібір і Сярэдняя Азія). Функцыянальныя сектары Наркамвода трэба ліквідаваць і перадаць пытанні суднарамонта, затоны, верфі, берагавую і шляхавую гаспадаркі рэчным трэстам — параходствам.

Калі ў другіх мясцах пануе кан цылярскі бюракратызм, то тут ён асабліва моцны. Спытайце, напрыклад, горкаўцаў, як цяжка прасунуць якое-небудзь гаспадарчае пытанне ў Наркамводзе. Яны вам расказуць. У наркамводаўцаў параходы дрэнна плаваць летам, але затое і летам і зімой самі наркам водаўцы плаваюць у канцылярыях бліскуча **(смех).** Вось гэта мы павінны ліквідаваць. І за НКВод, відавочна, пасля з'езда Цэнтральнаму Камітэту прыдзецца ўзяцца больш рашуча, чым гэта было да гэтага часу.

Што датычыць чыгуначнага транспарта, то ліпеньская пастанова ЦК і СНК дала поўную лінію перабудовы. Справа на чыгунках зараз не ў новай арганізацыйнай перабудове. Калі зараз пачынаць новую перабудову, будзе новая катавасія, структура ўстаноўлена правільная, трэба яе ажыццёвіць. Рашаючая роля цяпер за **праверкай выканання, за дысцыплінай, як работа ў праўленні калгаса, у сельсавеце.**

Я не спыняюся падрабязна на арганізацыйнай структуры Наркамснаба, Цэнтрасаюза і іх краявых —абласных органаў. Гэта структура хварэе таксама функцыяналкай, раздутымі штатамі.

Наколькі раздуты штаты Цэнтрасаюза, паказвае наступнае: на 3 квартал 1933 г. устаноўлены штаты ў 1.563 чал. супроць 2855 чал. у IV квартале 1932 г., г. зн. на 46 проц.).

І ад гэтага тавараснабжэння не пагоршылася, а работа Цэнтрасаюза павінна палепшыцца.

Я ўпэўнен, калі скараціць апарат Цэнтрасаюза і НКСнаба і палепшыць унутраную арганізацыю, папэўна будзе лепш. Наркамснаб і Цэнтрасаюз змогуць тады дайсці да магазіна, склада, будуць кіраваць гандлем не фармальна, а па сутнасці **(апладысменты).**

5. ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПРАВЯДЗЕННЕ Ў ЖЫЦЦЁ РАШЭННЯ ЦК І СНК АБ ПЕРАБУДОВЕ ТРАНСПАРТА

Аб транспарце гаварылі многія, гаварылі правільна, гаварылі востра. Гаварыў тав. Сталін, гаварылі т.т. Варашылаў і Кіраў, гаварылі і іншыя аратары. Выступаў і тав. Андрэеў.

Я хачу сказаць перш за ўсё аб водным транспарце. Водны транспарт у нас яўна недаацэньваецца. Вытворчая арганізацыя ў воднікаў найбольш простая — параход, прыстань, затон, суднарамонтны завод. А на справа і ў іх функцыяналка, безадказнасць і абязлічка.

Вы думаеце, што параходства распараджаецца суднарамонтам? Памыляецеся. Параходства кіруе эксплаатацыяй параходаў, але для таго, каб адрамантаваць свой параход, яно павінна звярнуцца ў спецыяльную цэнтралізаваную арганізацыю ў Наркамводзе — Судна будрамонт. Функцыянальнымі распараджэннямі НКВод збіраецца кіраваць рамонтам кожнага парахода. У Наркамводзе існуе яшчэ галоўнае рэчнае кіраўніцтва (РЭТУ). Гэта кіраўніцтва распараджаецца, прыкладна, 70 проц. усяго воднага транспарта. Гэта тое-ж што мы мелі раней у НКШЗ — Галоўцужэл, які распараджаўся 75 проц. усёй гаспадаркі НКШ. Неабходна гэта рэчнае кіраўніцтва ліквідаваць і арганізаваць кіраўніцтва рэчным транспартам прыстасоўка да рэчных сістэм. Камісія ЦК намячала чатыры такіх кіраўніцтвы Наркамвода: Волжска - Камскае, Паўночнае, Паўднёвае і Азіяцкае (Сібір і Сярэдняя Азія). Функцыянальныя сектары Наркамвода трэба ліквідаваць і перадаць пытанні суднарамонта, затоны, верфі, берагавую і шляхавую гаспадаркі рэчным трэстам — параходствам.

Калі ў другіх мясцах пануе кан цылярскі бюракратызм, то тут ён асабліва моцны. Спытайце, напрыклад, горкаўцаў, як цяжка прасунуць якое-небудзь гаспадарчае пытанне ў Наркамводзе. Яны вам расказуць. У наркамводаўцаў параходы дрэнна плаваць летам, але затое і летам і зімой самі наркамводаўцы плаваюць у канцылярыях бліскуча **(смех).** Вось гэта мы павінны ліквідаваць. І за НКВод, відавочна, пасля з'езда Цэнтральнаму Камітэту прыдзецца ўзяцца больш рашуча, чым гэта было да гэтага часу.

Што датычыць чыгуначнага транспарта, то ліпеньская пастанова ЦК і СНК дала поўную лінію перабудовы. Справа на чыгунках зараз не ў новай арганізацыйнай перабудове. Калі зараз пачынаць новую перабудову, будзе новая катавасія, структура ўстаноўлена правільная, трэба яе ажыццёвіць. Рашаючая роля цяпер за **праверкай выканання, за дысцыплінай.**

Справа за тым, каб поўкасцю правесці структуру, устаноўленую рашэннем ЦК і СНК, да канца разграміць супраціўленне перабудове.

Вось напрыклад, у паравозным кіраўніцтве да гэтага часу пытанні кацельнай гаспадаркі займаюцца чатыры сектары. Па цёплатэхніцы функцыянальны ланцужок цягнецца ад НКШЗ да дэпо. У паравозным дэпо засталіся спецыяльныя інструктары па цёплатэхніцы, падпарадкаваныя не начальнікам дэпо, а непасрэдна паравознай службе дарогі. Таму дэпо не нясе адказнасці за расходванне апалу. У рэзультаце — вялікі перапал апалу на дарогах.

Калі да гэтага дадаць, што вугольныя склады, снабжаючыя паравозы вугалем, знаходзяцца не ў веданні дэпо, а ў веданні гаспадарча-матэрыяльнай службы і паравозам прыходзіцца гадзінамі, а часамі і па 10-12 гадзін прастойваць у чарзе за вугалем, і за гэта ніхто адказнасці не нясе, то стане зусім ясным, што функцыяналка і абязлічка працвітаюць яшчэ на чыгунках.

Я ўжо не гавару аб існаванні звыш 180 ! розных пастаноў, раст лумачэнняў, інструкцый, рэгулюючых аплату працы чыгуначнікаў. Коратка кажучы, кіраўніцтва НКШЗ да гэтага часу не зламала супраціўлення бюракратычных элементаў перабудове транспарта.

Транспарту ўсё яшчэ не хапае арганізуючай большэвіцкай сілы. Калі для выхавання і згуртавання чыгуначнікаў патрабуецца многа больш памагання, чым у прамысловасці, то комуністы-чыгуначнікі гэтых удзесяцяроных памаганняў пакуль не праявілі. Больш таго, — некаторыя чыгуначнікі адчуваюць сябе нібы пакрыўджанымі: што-ж гэта нас усё б'юць, за што-ж гэта нас усё крытыкуюць?

Безумоўна, маюць рацыю высту паўшыя тут тт. Варашылаў і Кіраў, якія рэзка паставілі пытанне: **калі кіраўнікі транспарта не стануць самі на чале рэзкай крытыкі, не ўзначаляць лепшых людзей, — транспарт ім узняць цяжка будзе.**

Ёсць дасканалыя ўдарныя брыгады, многа герояў-ударнікаў, ёсць і дасканалыя палітаддзелы, якія паказалі ўжо сябе на рабоце. У сельскай гаспадарцы задача была больш цяжкая, чым на транспарце. Там мелі справу не з рабочымі, а з сялянамі. Як там узнялі справу? Згуртавалі лепшых людзей—калгаснікаў-ударнікаў, павялі рэзкую барацьбу з кулакамі і падкулачнікамі, апіраючыся на масы, пачалі ажыццяўляць мерапрыемствы, накмечаныя Цэнтральным Камітэтам. А на транспарце мы гэтай цвёрдай арганізатарскай рукі пакуль яшчэ не бачым!

Работнікі палітаддзелаў чыгуначнага транспарта не ўсвядомілі яшчэ поўнасцю труднасці і сурёзнасць фронту, на які пастаўлены.

Галасы: Правільна.

Кагановіч: Яны не разгарнулі работу яшчэ так, як, напрыклад, палітаддзелы МТС, якія пашлі ў вёску, ведаючы загадзя, што ідуць на трудную, вялікую справу. Яны ўяўлялі сабе, што справа больш трудная, чым яна нават для іх аказалася ў жыцці. А чыгуначныя палітаддзельцы ішлі і ўяўлялі сабе справу больш лёгкай. Вось чаму яны труднасцяй пакуль не перамаглі. Частка палітаддзельцаў ужо дабілася поспеху ў сваёй рабоце, але ўся палітаддзельская армія яшчэ не прарвала фронт, труднасцяй не перакагла.

З'езд партыі павінен патрабаваць ад усіх чыгуначнікаў поўнага правядзення ў жыццё рашэнняў ЦК і Соўнаркома. З'езд павінен патрабаваць ад чыгуначнікаў, каб яны наладзілі, нарэшце, праверку выканання і аператыўнае кіраўніцтва.

У чыгуначнай справе больш чым у якой-небудзь іншай трэба аператыўнае кіраўніцтва і праверка выканання тых рашэнняў, якія прыняты. Трэба, каб чыгуначнікі зразумелі, што справа не да жартаў, што справа ідзе аб нармальным крывявароце народнай гаспадаркі, бо транспарт — гэта крывяносныя жылы нашай краіны. Рабочы клас і партыя маюць права прад'явіць патрабаванне ўсім чыгуначнікам, у першую чаргу комуністам і кіраўнікам, палітаддзельцам: працаваць набольшэвіцку, не быць «добранькімі» за кошт інтарэсаў пролетарскай дзяржавы.

Да аздараўлення транспарта трэба падыйсці так, як партыя ішла, ідзе ў перамаганні труднасцяй на асобных гаспадарчых участках. **Трэба згуртаваць масы, абаперціся на лепшых людзей-ударнікаў** транспарта і перамога будзе забяспечана. **(Бурныя апладысменты)**

Я не маю матчымасці, таварышы, спыніцца на ўсіх другіх наркаматах, на ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Для гэтага патрабавалася-б занадта многа часу, але гэта не значыць, што ў другіх галінах, якіх я тут не закрануў, няма ў той ці іншай меры тых недахопаў, аб якіх я гаварыў.

Спынюся яшчэ на пытанні аб пастаноўцы праверкі выканання ўнутры саміх совецкіх і гаспадарчых арганізацый.

6. АБ ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАННЯ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ АПАРАЦЕ

Я ўжо гаварыў аб праробленай Цэнтральным Камітэтам рабоце па падрыхтоўцы кадраў. Аднак, я хачу падкрэсліць яшчэ раз, што справа ідзе аб жывых людзях, аб вырошчванні новых людзей, каб кожнаму талантліваму, здольнаму чалавеку, які прэ знізу, дапамагчы вырасці, дапамагчы падняцца.

Выхоўваць кадры мы павінны ў практычнай рабоце — і партыйныя, і беспартыйныя. У тэзісах Цэнтральны Камітэт падкрэсліў ролю беспартыйных. Гэта не для «палітыкі» наогул. Не, таварышы, вопыт нашага соцыялістычнага будаўніцтва паказаў, што там, дзе комуніст працуе добра, там ён умее згуртаваць беспартыйных людзей, не толькі рабочых, не толькі тых, якія заўсёды ішлі з намі, але і спецыялістаў, якія хісталіся, сумняваліся.

Трэба, каб нашы работнікі аўладалі тэхнікай. Ёсць дырэктары, якія аўладалі тэхнікай сваёй справы, але мы не можам сказаць, што тут зроблена ўжо ўсё. Аўладаць тэхнікай, перастаць кіраваць наогул, перастаць штэмпелявацъ тое, што падсоўвае апарат, — гэта ёсць рашаючы паказальнік добрай работы.

Трэба прадаўжаць перасоўванне работнікаў на заводы і цэхі. Нельга недаацэньваць супраціўлення гэтай справе. Многія да гэтага часу яшчэ не бачаць, **што вытворчае жыццё праходзіць на заводзе, там, унізе, на фабрыцы, у калгасе, у МТС.**

Мы працуем для арганізацый гэтай справы. Але да гэтага часу сёй-той не разумее, што ісці на завод — гэта найвялікшы гонар і пашана для кожнага байца, кожнага інжынера, кожнага тэхніка.

У Данбасе нам удалося пабіцца пераломy. Там работнік саромеецца сказаць, што ён не хоча ісці на шахту, калі яго пасылаюць. Трэба, каб работнікі, калі іх пасылаюць на заводы, у калгасы і соўгасы, каб яны не толькі не супраціўляліся, але лічылі-б гэта выражэннем вышэйшага давер'я да іх.

Рашаючае значэнне мае праверка выканання. Калі выносіш рашэнне, але не правяраеш, як яно праводзіцца, нават добрыя работнікі разлагаюцца. Што-ж яму далі рашэнне, пару дзён ён з ім носіцца, потым на работніка навальваюцца новыя справы. Ён рашэнне кладзе пад сукно і часамі нават і не ўспомніць аб ім.

Правільная-ж пастаноўка праверкі выканання ў совецкім апараце, у гаспадарчых органах тады мае, выхоўвае чалавека. Нават к работнікам, якія працуюць добраумлення, трэба своечасова прыйсці і сказаць: «ты захапіўся, дарагі, адным бокам справы, у цябе атрымаўся флюс у рабоце, павярніся крыху, выпраў памылкі.» А гэта магчыма толькі тады, калі кіраўнік ведае сваю ўстанову, сваю сістэму не «наогул», а ведае кожнага работніка, сістэматычна яго правярае.

Як справа стаіць у нас з праверкай выканання ў наркаматах, у гаспадарчых арганізацыях? Да гэтага часу існуе забабон, што праверка выканання ёсць нейкая асобная функцыя, аддзельная ад кіраўніцтва і падбору людзей. Існавалі спецыяльныя вялікія апараты і для падбору людзей і для праверкі выканання.

У рэзультаце факты бюракратызма ў самой праверцы выканання. Дзіўна, аднак, факт.

У лепшым выпадку тэтыя сектары правяраюць наркамаў, перапісваюць. Ну, як-жа яму, бедняму, правяраць па жывому, калі ён сам-жа даваў распараджэнні, калі ён сам справы не ведае, калі ў нутро пытання не ўлез.

Ясна, што такому сектару праверкі выканання астаецца гаварыць толькі згульнымі месцамі, пісаць паперы або валакіціць. Адным словам, прыходзіцца зноў успамінаць Шчэдрына: грэмадным вокам нічога не бачыў, а пярэманым бачыў глушэцца **(Смех).**

Вось, напрыклад, сектар праверкі выканання НКЛеса. Ён павінен быў прыкантраляваць загад наркома аб адкамандзіраванні лесінжынерным лясным трэстам у ліквідацыі тэрмін 13 спецыялістаў у Карэлію. І гэты сектар праспаў фрэйм **5 месяцаў,** перш чым пачаў кантраляваць. Прачнуўся, пайсаў паперку і па гэтым супакоўся. А справа не зрушылася. Частка работнікаў не паслана. Но дарма ў наркаматах сектар праверкі выканання нават у афіцыяльных паперках у парадку скарачэння называюць СПІ **(смех, апладысменты).**

І сапраўды спяць сектары праверкі выканання наркаматаў і гаспадарчых органаў.

Вазьміце, напрыклад, абслугоўванне рабочых мас. Мы ўсе гаворым, што святая справа большэвікоў — абслугоўванне рабочых.

Совет працы і абароны ў ліпені 1932 г. пастанавіў: пабудаваць для Далёка-Усходняга края і Усходняй Сібіры 7 санітарных пропускных пунктаў і 15 лазняў, душаў і пральняў простага тыпу, з праспейшай устаноўкай. Ваенныя людзі ведаюць, што гэта можна пабудаваць хутка і лёгка. СПА даў НКГасу месячны тэрмін для выканання гэтага рашэння. НКГас, вядома, разумее, і, мабыць, прамовы гаварыўся на тэму аб значэнні лазняў, душаў і раогул купання **(смех),** але большэвіцкай праверкі выканання не паставіў. І што-ж вы думаеце? 18 месяцаў прайшло, а значная частка гэтых лазняў і санітарных пунктаў не пабудавана. Вось да чаго давяло ліквідаўчая паста ноўка праверкі выканання, калі людзі замест таго, каб неадкладна, без рэзалюцый, аператыўна давесці справу да канца, чаруючоць справу **СПІ,** або каму іншаму. Гэтыя **СПІ,** каб лепш была праверка, завялі ў сябе ў самым сектары праверкі выканання кан трольную пушу! **(смех),** адным словам, атрымліваецца як у Гогаля ў «Мертвых душах» «камісія наглядання за камісіяй пабудавання» **(смех).**

Так і ў некаторых наркаматах: камісія наглядання за камісіяй па будавання, у самым-жа сектары праверкі выканання кантрольная група, а на справе не існуе правільнай большэвіцкай праверкі выканання. Вось чаму ў тэзісах праблема праверкі звязваецца з арганізацыйнай перабудовай, з ліквідацыяй функцыяналкі.

Час зразумець, што галоўнае ў рэарганізацыі совецкага дзяржаўнага апарата заключаецца ў тым, каб павярнуць кіруючыя органы да нізавога звяна, перайсці да цеснай жывой сувязі з нізавымі звеннямі—заводам, фабрыкай, цэхам, участкам, прадпрыемствам, калгасам, вёскай, МТС, соўгасам і т. д. **Не завод для наркамата, а наркамат для завода. Не калгас для Наркамзема, а Наркамзем для калгаса. Не соўгас для Наркамсоўгасаў, а Наркамсоўгасаў для соўгаса.**

ОРДЖАНІКІДЗЕ: Правільна.

КАГАНОВІЧ: Наркаматы павінны абслугоўваць нізавыя звенні, а не так паварочваць справу і работу, што калгас існуе для Наркамзема. Бяда ў тым, што структура ў трэсце, у наркамаце складаецца механічна, канцылярыстамі, бо кіраўнікі пагарджаюць гэтай работай. А канцылярысты паняцця не маюць аб сутнасці аператыўнай работы. Бяда ў тым, што трэст слепа капіруе структуру наркамата, а завод структуру трэста, тады як справа павінна ісці якраз наадварот. Трэба ўзяць завод, пабудаваць правільна яго арганізацыю, узяць калгас і соўгас і пабудаваць правільна іх арганізацыю прыстасоўна да патрэбнасцяй вытворчасці і потым ісці да вышэйшых звенняў, прыстасоўна да асноўнай задачы, якая стаіць перад кожным наркаматам—задачы павелічэння прадукцыі, асваення тэхнікі, паляпшэння гаспадаркі, паляпшэння кіраўніцтва.

Толькі адпаведна перабудаваўшы работу, мы можам умацаваць нізавыя звенні і кіраўніцтва зем

Гаспадарчыя, совецкія і партыйныя работнікі павінны неадкладна пасля з'езда—без асобных напамінанняў і падштурхванняў, прыступіць да знішчэння ўсіх арганізацыйных недахопаў у сваёй рабоце. Прыступіць сур'ёзна, без чахарды, і прапановы па перабудове свайго апарата ўнесці куды трэба на зацвярджэнне.

Цэнтральны Камітэт будзе пільна сачыць за ходам перабудовы ва ўсіх нашых органах. У перабудове работы ні ў якім выпадку нельга абмежавацца толькі зменай структуры і перасаджваннем людзей, зменай шыльдаў, над чым так зло здзекаваўся тав. Ленін, над чым няшчадна, штодзенна здзекуецца тав. Сталін. ЦК не дапусціць таго, каб сутнасць арганізацыйнай перабудовы была вы ташана пераменай шыльдаў, фармальным правядзеннем перабудовы.

Кожнаму кіраўніку трэба ўдумліва перагледзець метады, сістэму работы сваёй і ўсёй установы, аператыўна ўносіць змены па-ходу, скараціць рэзка пісаніну, у першую чаргу ўчотныя і статыстычныя даныя, якія нязмерна раздуты.

Праверка выканання павінна праводзіцца не фармальна, а па сутнасці работы. Яна абавязана даводзіць справу да канца, г. зн. да **поўнага** выканання дырэктывы. Неабходна праверка рэзультатаў работы, а не папяровае, не фармальнае прыняцце мер: пратакол атрымаў, рэзалюцыю налажыў, распарадженне зрабіў. Часта атрымліваецца, што распараджэнне зверху атрымаў, перафразіраваў яго крыху і пераслаў уніз, а там яго пасылаюць яшчэ ніжэй і так валакіта цягнецца.

Сталін: І паперу прышыў к справе.

Кагановіч: Зусім правільна, і па перу прышыў к справе.

Наш дзяржаўны апарат, безумоўна, за апошні час палепшыўся, органы пролетарскай дыктатуры ўмацаваліся. На нашым дзяржаўным апараце не маглі не сказацца агульны гаспадарчы падём і рост палітычнай свядомасці шырокіх рабоча-сялянскіх мас.

Іменна гэты эканамічны рост, гэты палітычны падём мас дазваляюць партыі з такой смеласцю і рашучасцю, як намеціў ЦК і як, спадзяюся, з'езд прыме, ускрываць недахопы нашых органаў. Гэта дае нам гарантыю, што мы здолеем яшчэ больш палепшыць наш дзяржаўны апарат, які павінен лепш абслугоўваць масы, павінен выкарэнь бюракратызм, канцылярщчыну, абязлічку.

Мы ўпэўнены, што партыя, яе ленінскі ЦК, яе правадыр т. Сталін даб'юцца гэтай перабудовы і ўмацавання пролетарскай дыктатуры. **(Бурныя апладысменты).**

III. Аб перабудове масавай работы і партыйных арганізацый

І. АРГАНІЗАВАЦЬ ЭНЕРГІЮ І ІНІЦЫЯТЫВУ МАС НА ПАЛЯПШЭННЕ РАБОТЫ ДЗЯРЖАЎНАГА АПАРАТА

На студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК тав. Сталін, пытаючы, дзе асноўныя сілы, якія забяспечылі гістарычную перамогу пяцігодкі, ўказаў:

«Гэта, перш за ўсё, актыўнасць і самаадданасць, энтузіязм і ініцыятыва мільённых мас рабочых і калгаснікаў, развіўшых разам з інжынерна-тэхнічнымі сіламі каласальную энергію па разгортванню соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Гэта, падругое, цвёрдае кіраўніцтва партыі і ўрада, заклікаўшых масы ўперад і перамогшых усе і ўсякія труднасці на шляху да мэты.

Гэта, нарэшце, асаблівыя якасці і перавагі совецкай сістэмы гаспадаркі».

На працягу ўсяго перыяда пяцігодкі мы бачылі, як гэтыя тры сілы сапраўды забяспечылі нам перамогу. Усе гэтыя тры сілы дзейнічалі як адзіная сіла, пад адзіным кіраўніцтвам ленінскага Цэнтральнага Камітэта нашай партыі. Прыпомніце выдатную, рашаючую для поспехаў гаспадарчага будаўніцтва формулу тав. Сталіна, даную ім у прамове, увайшоўшай у жыццё мільёнаў, як шэсць гістарычных умоў.

Ён гаварыў: «Рэальнасць нашай праграмы гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасць працаваць пановаму, наша рашучасць выконваць план».

Рашаючай рысай дзейнасці Цэнтральнага Камітэта за справаздачны перыяд была сіла кіраўніцтва масамі, сіла мабілізацыі мас для выканання задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Энтузіязм мас, пафас будаўніцтва, пафас барацьбы за палепшэнне і падём гаспадаркі, забяспечылі рэальнасць нашых планаў і тыя залікія перамогі, з якімі мы прышлі да 17 з'езда нашай партыі.

Соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва разгарнулася шырокім фронтам. Калі на 1 студзеня 1930 года соцспаборніцтвам было ахоплена ў прамысловасці 29 проц. рабочых, то на 1 лістапада 1933 года мы ўжо маем 71 проц. Тол па прамысловасці і транспарту, паводных даных, налічваецца звыш 5 мільёнаў ударнікаў,

Працяг даклада тав. Л. М. КАГАНОВІЧА

Частка нашых соўпартшкол страдае больш за ўсё тым, што там вучоба настаўлена іменна па-школьнаму. Большэвік—не школьнік, ён выхоўваецца палітычна, яго школьная вучоба павінна злучацца з палітыкай і практыкай штодзённай барацьбы. Яго трэба ідэйна ўзброіваць і ў школе і на выходзе. Вось чаму, калі вы заўважылі, у праекце статута сказана не проста аб выхаванні а аб ідэйным узбраенні комуніста. Кожны член партыі павінен быць узброен асновамі марксізма-ленінізма. Калі мы такія патрабаванні прад'яўляем кожнаму члену партыі, дык тым большыя патрабаванні павінны быць прад'яўлены да партыйных кіраўнікоў. У нас не павінна быць рэзкіх падзелаў на спецыялістаў-прапагандыстаў і спецыялістаў-арганізатараў. Спецыялізацыя—рэч добрая, мы за яе, але не да страты прытомнасці. І ў асаблівасці такая празмерная спецыялізацыя непрыемлема ў партыйнай рабоце. Часта арганізатар не вядзе прапагандысцкай і агітацыйнай работы не толькі таму, што ў яго няма часу, але скажам праўду, і таму, што не ўмее. Мы патрабуем ад дырэктара завода аўладання мінімумам тэхнічных ведаў. У яшчэ большай ступені мы павінны патрабаваць ад кожнага сакратара пярвічнай партыйнай арганізацыі, ад кожнага сакратара райкома, ад кожнага партыйнага арганізатара аўладання марксісцка-ленінскім компасам. Партыйны кіраўнік павінен быць не толькі арганізатарам-адміністратарам у лепшым сэнсе слова, але і прапагандыстам і выхаваўцай членаў партыі.

Мы ведаем, што падняўся ўзровень партыйных сходаў. Член партыі навучаецца і павінен навучацца на партыйных сходах большэвізму не менш, калі не больш, чым у партыйнай школе. Гэта кожны разумее.

Унутрыпартыйная дэмакратыя, самакрытыка былі і з'яўляюцца важнейшым стрыжнем усёй нашай партыйнай работы і выхавання членаў партыі. Унутрыпартыйная дэмакратыя падвялася на новую ступень.

Зусім пановаму разумеецца унутрыпартыйная дэмакратыя. Зараз, калі бываеш на сходзе комуністаў, няма ніякага параўнання з тым, што было пару год таму назад.

Апазіцыянеры хацелі скарыстаць унутрыпартыйную дэмакратыю для разлажэння большэвіцкіх радоў. Партыя нанесла сакрушальны ўдар па гэтых кулацкіх падгалосках, выгнала іх з сваіх радоў і падняла нашы партыйныя арганізацыі на новую вышыню. Паглядзіце зараз любую нізавую партыйную арганізацыю, любы партыйны сход. Вы ўбачыце, як члены партыі падняліся да ўзроўню дзяржаўнага разумення задач, якія карэнныя пытанні жыцця нашай краіны і міжнароднай палітыкі закранаюцца ў прамовах і выступленнях радавых членаў партыі. Абмяркоўваючы свае вытворчыя ці агульна-партыйныя пытанні, людзі выступаюць і гавораць аб мільярдах, промфінплане, гавораць аб тэхніцы. Вядома, з гэтага пункту гледжання кожны комуніст гіганцкі вырас, падняўся.

Аднак, мы не можам адмаўляць і таго, што мы маглі-б зрабіць куды больш, калі-б мы дабіліся большага спалучэння работы арганізатараў і прапагандыстаў. Гэта падняло-б марксісцка-ленінскае ідэйнае ўзбраенне комуністаў на новую ступень.

Бываюць выпадкі, калі партыйныя сходы праходзяць шаблонна і без сур'ёзнай падрыхтоўкі. Збяруць людзей: таварышы, у нас ёсць заданне, мы павінны выканаць то-та і то-та. Або паставяць пытанне: такая-та кампанія, або які-небудзь юбілейны дзень.

У такіх выпадках пераважае або мітынгоўшчына або дзяляцтва, і, натуральна, такія сходы не выхоўваюць членаў партыі. Тым часам кожны партыйны сход павінен павышаць ідэйны ўзровень комуніста. Абмеркаванне ўнутрыпартыйных пытанняў, пытанняў палітыкі і практыкі будаўніцтва соцыялізма падымае свядомасць члена партыі да ўзроўню разумення ім авангардной ролі большэвіка—арганізатара мас.

Член партыі расце, выхоўваецца і загартоўваецца ва ўмовах унутрыпартыйнай дэмакратыі, сваёднага і дзелавога абмеркавання ўсіх пытанняў партыйнай палітыкі. У той-жа час ён загартоўваецца і выхоўваецца на барацьбе з усімі тымі, хто адступае ад асноўных пытанняў партыйнай палітыкі, хто хоча скарыстаць абмеркаванне гэтых пытанняў для таго, каб падарваць гэту палітыку, для таго, каб падарваць кіраўніцтва партыі, для таго, каб фасіствуць не жаленыя рады. Вопыт нашага ўнутрыпартыйнага жыцця паказвае, што нашы партыйныя рады раслі, мацнелі і загартоўваліся ў барацьбе з усімі адступаўшымі ад палітыкі партыі, ад ленінізма, у барацьбе за згуртаванасць і маналітнасць нашых партыйных радоў.

Вось чаму і ў далейшым мы павінны падымаць і загартоўваць членаў партыі на барацьбе з малейшымі праяўленнямі апартуналізма ў нашых радах.

Рост члена партыі залежыць ад паспяховай унутрыпартыйнай работы, залежыць ад увагі да члена партыі і ад таго, як ім кіруюць. Вось чаму мы ў тэзісах, не расшіваючы многага, паставілі пытанне аб пярвічнай партыйнай арганізацыі.

4. ПЕРАБУДОВА І ПАЛЯПШЭННЕ РАБОТЫ ЗАВОДСКІХ ПЯРВІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПАРТЫІ

Нашы пярвічныя партыйныя арганізацыі выраслі і арганізацыйна і палітычна. Яны безумоўна сталіся, як актыўна дзействуючы фактар у вытворчым жыцці прадпрыемства.

Унутрыпартыйнае жыццё пярвічных арганізацый абагацілася. У нас за гэтыя гады падняўся зусім новы пласт кіруючых работнікаў, абнаўляецца актыў, крыніцай вярот ідзе добра, буйна новыя людзі растуць. Я-б мог тут прывесці даныя па 1½ тысячам цэхаў 85 буйнейшых прадпрыемстваў, ахапляючых звыш 700 тысяч рабочых, з іх 94 тысячы комуністаў. Амаль палова сакратароў цэхавых пярвічных арганізацый гэтых прадпрыемстваў уступіла ў партыю пасля 1929 года, і толькі шосць уступіла ў партыю па 1925 года ўключна. Аднак, хоць яны і маладыя партыйцы, але кадравікі рабочыя. 60 проц. сакратароў маюць вытворчы стаж больш дзесяці год.

Зразумела, гэтым людзям трэба дапамагчы ў справе іх большэвіцкай падрыхтоўкі і асабліва ў справе кіраўніцтва нашай пярвічнай падпыйнай арганізацыяй.

Што мы маем зараз у нашай пярвічнай партыйнай арганізацыі, як мы называем цяпер і павінны называць нашы партыйныя ячэйкі?

Наша партыя, як баявая рэвалюцыйная партыя пролетарыята, вайны будавала сваю нізавую сетку на заводах па вытворчаму прынцыпу. Аднак, папершае, у вёсцы у нас гэтага не было, і, падругое, нават на заводах наша вытворчая арганізацыя не заўсёды мела яўна выражаны вытворчы характар.

Вытворчая роля нашай пярвічнай партыйнай арганізацыі пачала разгортвацца, галоўным чынам, за апошнія 3-4 гады. Яшчэ-ж толькі на мінулым з'ездзе партыі нам прыйшлося канстатаваць, што соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва не ахапілі не толькі большасці, але нават значнай часткі членаў партыі. Былі прамысловыя арганізацыі, дзе ўсяго 10-20 проц. членаў партыі і комсамольцаў прымалі ўдзел у спаборніцтве і ўдарніцтве. На сённяшні дзень амаль 100 проц. комуністаў з'яўляюцца ўдарнікамі. Нашы заводскія партыйныя арганізацыі ўлазяць у пытанні вытворчага жыцця прадпрыемства досыць прынцыпова.

Лік усіх нізавых партыйных арганізацый і кандыдацкіх груп вырас з 54 тыс. к XVI з'езду да 139 тыс. на 1 кастрычніка 1933 года. Заводскія нізавыя парторганізацыі ў галіне прадпрыемстваў — гэта буйнейшыя арганізацыі, яны налічваюць 1000 і больш чалавек.

Разка змяняўся характар работы нізавой партыйнай арганізацыі. Ячэйкі фактычна перарасліі рамкі ячэек старога тыпу як па вайму складу, так і па задачах, якія ставяць перад імі.

Вось чаму гэта ўжо не ячэйка, гэта ёсць пярвічная арганізацыя нашай партыі. Роля такой арсані заны ў галіне вытворчасці, як вядучай сілы на заводзе, на фабрыцы і ў калгасе, павялічна падняцца яшчэ вышэй.

У статуце партыі на пярвічную партыйную арганізацыю ўскладаюцца задачы больш шырокія, чым гэта было раней.

У статуце сказана:

«Пярвічная партыйная арганізацыя звязвае рабочыя і сялянскія масы з кіруючымі органамі партыі. Яе задачай з'яўляецца:

1) агітацыйная і арганізацыйная работа ў масах за партыйныя лозунгі і пастановы;

2) прыцягненне спачуваючых і новых членаў і іх палітычнае выхаванне;

3) дапамога райкому—гаркому або палітаддзелу ў яго штодзённай арганізацыйнай і агітацыйнай рабоце;

4) мабілізацыя мас па прадпрыемствах, у соўгасах, у калгасах і т. п. за выкананне вытворчага плана, умацаванне працоўнай дысцыпліны і развіццё ўдарніцтва;

5) барацьба з расхлябанасцю і безгаспадарчым вядзеннем справы на прадпрыемствах, у соўгасах, у калгасах і штодзённыя клопаты аб паляпшэнні бытавых умоў рабочых і калгаснікаў;

6) актыўны ўдзел, як партыйнага органа, у эканамічным і палітычным жыцці краіны».

Я зварачаю вашу ўвагу на 4-5 пункты.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі нашых дзяржустаноў, не прэтэндуючы на кіраўніцтва, павінны таксама змагацца з расхлябанасцю, калі яна мае месца ва ўстанове, дзе яны працуюць.

Для таго, каб выканаць гэтыя задачы, пярвічныя партыйныя арганізацыі павінны перабудаваць сваю работу. Мы маем многа яркіх прыкладаў станоўчай работы пярвічных парт'арганізацый.

Таварышы, усе вы кіруеце работай партыйных арганізацый і ведаеце, што ў нас шмат добрых пярвічных партыйных арганізацый. Мы паставілі пытанне на абмеркаванне з'езда, галоўным чынам, для таго, каб намеціць задачы будучага. У сувязі з гэтым не абходна ўказаць, што мы маем і шмат адмоўнага.

Было-б няправільным не бачыць, што ў партыйную работу пранікілі элементы канцылярщчыны і функцыяналкі. А сёй-той з партыйных работнікаў не разумее таго, што цэнтральнай і галоўнай задачай партыйнага кіраўніка з'яўляецца ажыццяўленне кіраўніцтва членамі партыі і праз усю масу членаў партыі — мільёнамі рабочых і сялян. Таму член партыі павінен стаяць у цэнтры работы партыйных арганізацый. У самой структуры нашых арганізацый ёсць рад адмоўных з'явішч. Ад парткома завода да члена партыі стараецца западта многа арганізацыйных ступеней.

Гэта яшчэ дапушчальна, як вы ключэнне, на буйнейшых заводах, дзе сапраўды ёсць цэхавая арганізацыя і дзе вялікая колькасць членаў партыі, як напрыклад, на Путылаўскім заводзе, у якім налічваецца каля 6 тыс. комуністаў, або на Луганскім паравозабудаўнічым заводзе, дзе налічваецца больш 4 тыс. комуністаў, або на Маскоўскім электразаводзе і т. д. Але і гэтым вялікім арганізацыям не трэба захапляцца і ствараць многаступенчатасць, тым больш гэта няправільна на сярэдніх і невялікіх заводах.

Новым статутам дапускаюцца, побач з цэхавымі пярвічнымі арганізацыямі, партыйныя групы па брыгадах і агрэгатах. Але гэтыя групы не павінны капіраваць цэхавую арганізацыю. Гэта павінны быць групы баявога характару, якія менш за ўсё займаюцца пасяджэннямі, загадамі, пісаннем рэзалюцый і т. д.

Неабходна прама сказаць, што функцыяналка і агульныя рэзалюцыі ёсць і ў партыйных арганізацыях. Пішуць без канца пратаколы, рэзалюцыі, справаздачы, даклады і зачастую ў гэтым віпараты мы, кіруючыя парторганы. Калі інструктар прыходзіць к сакратару пярвічнай партыйнай арганізацыі, пачынае правяраць яго работу, ён перш за ўсё бярэцца за пратаколы: ці абмеркаваў ты такое пытанне, ці займаўся такімто пытаннем? Адным словам, сакратар нашай пярвічнай арганізацыі стараецца запасціся ўсімі відамі і формамі рэзалюцый для таго, каб ніхто не падкапаўся. **(Смех).**

Вазьміце, напрыклад, завод Рост сельмаш—буйнейшы завод у Растове. У партыйнай арганізацыі грамоздкі апарат. У парткоме пяць аддзелаў. Толькі ў заводскім парткоме працавала 20 аслабанёных работнікаў.

Голас з месца: Больш.

Каганавіч: Калі з цэхамі, то, вядома, больш. Велізарную колькасць часу ўбівалі на пасяджэнні. Быў выпадак, калі на гэтым заводзе партком засядаў два дні і абмеркаваў 125 пытанняў. **(Смех).**

Або вазьмі завод імя Петроўскага ў Днепрапятроўску. У парткоме, разам з цэхячэйкамі працавала, калі яго абследавалі работнікі ЦК, 75 платных работнікаў.

Вялікая многазвеннасць. Напрыклад, у доменным цэху быў цэхпартком, чатыры зменныя парт'ячэйкі, 20 звенавых ячэек, падначаленых зменным, у сваю чаргу звенавыя ячэйкі мелі партгрупы. Атрымліваецца пяціступенчатая арганізацыя.

Вось пералік 11 сектароў, існуючых у заводскім парткоме і ва ўсіх цэхавых ячэйках: 1) культ проп, 2) агітмас, 3) сектар кадраў, 4) сектар праверкі выканання, 5) сектар па рабоце з беспартыйным актывам, 6) сектар па рабоце з кандыдатамі партыі, 7) сектар па ўліку авангардной ролі комуністаў на вытворчасці **(смех)**, 8) сектар па рабоце сярод комсамола, 9) сектар па рабоце сярод жанчын, 10) сектар па кааперацыі, 11) сектар па партнагрузках.

Дайшло да такой бязглуздзіцы, што звенавая ячэйка вальца-пракатнага цэха, маючы ўсяго 7 членаў партыі і 4 кандыдатаў, стварыла бюро ячэйкі, у якое ўвайшлі ўсе сем членаў партыі **(смех)**. Пры чым на 7 членаў партыі ў гэтай звенавой ячэйцы мелася 10 сектароў **(смех)**, у тым ліку і такія, як сектар праверкі ўплаты членскіх узносаў, агіт мас, сектар кадраў, сектар праверкі выканання («СПН») **(смех)**, сектар па рабоце з беспартыйным актывам, сектар работы з кандыдатамі партыі, сектар уліку авангардной ролі комуністаў у вытворчасці **(смех)**, сектар па рабоце сярод комсамола, сектар па рабоце сярод жанчын, сектар па партнагрузках. А па справе форменны здзек і ніякай работы. У звенячэйцы доменнага цэха на 16 комуністаў 16 сектароў.

Сталін: Усё-такі менш, чым у Наркамземе.

Каганавіч: Так, за Наркамземам пакуль што не ўгналіся. Падбор кіраўнікоў сектароў своеасаблівы:

Барадзенка, слухач школы палітграматы, кіраваў сектарам партвучобы комуністаў, а сам 14 раз прапусціў заняткі ў школе па літграматы. **(Смех).**

Сакаленка—кіраваў сектарам па праверцы ўплаты членскіх узносаў, а сам 9 месяцаў не плаціў членскіх узносаў. **(Смех).** Вядома, такіх уродлівых з'явішч у нас не так ужо многа.

Сталін: І ўсё-такі нямала.

Каганавіч: Вядома, нямала. Я прывёў гэты факт, як найбольш яркі, для таго, каб паказаць, што гэта ёсць агідны напрамак работы, калі хочаце — гэта бюракратычнае скажэнне лініі партыі. Вось чаму мы павінны ўдарыць па гэтых скажэннях.

Нас запытваюць: Чаму ў цэхах не ствараюцца бюро? Як вы ведаеце, новым статутам прадбачыцца мець у цэху партарганізатара. Зараз само бюро засядае вельмі многа, а агульныя цэхавыя сходы комуністаў склікаюцца вельмі рэдка. Пры цэхавым партыйным арганізатары агульныя сходы комуністаў будуць склікацца часцей. Парторганізатар павінен быць баявым прадстаўніком партыі ў цэху. Ён павінен, не парушаючы адзіначалля, выконваць задачы, якія статут ставіць перад партыйнай арганізацыяй, змагацца з расхлябанасцю, дабіцца на справе жалезнай пролетарскай дысцыпліны.

Некаторыя нізавыя арганізацыі скардзяцца, што партыйныя камітэты і райкомы загружаюць іх вялікай колькасцю пісаніны. У Цэнтральным Камітэце па гэтых пытаннях нямала лістоў. Гэта правільна, і нам, кіруючым парторганам, прыдзецца абавязкова рэзка скараціць патрабаванні, а для таго, каб не так лёгка было займацца пісанінай і патрабаваць паперы, паляпшаем апарат, у прыватнасці, у райкомах ліквідуем аддзелы.

Галасы: правільна.

Каганавіч: Зразумела, пэўная справаздачнасць патрэбна. У асаблівасці ўлік членаў партыі трэба паставіць з усёй строгасцю. Як раз гэта важнейшая справа ў нас поўнасцю не забяспечана — улік членаў партыі пастаўлен нездавальняюча, і рад арганізацый гэтай справай не займаецца.

Мы ўпэўнены, што скарачэнне засядацельскай мітусні і скарачэнне пісання агульных рэзалюцый, безумоўна, палепшыць усю работу. Гэта дасць магчымасць нічэвым партыйным работнікам сканцэнтравацца на сапраўды базавых пытаннях, аслабаніць парткомы ад канцылярчыны і—будзе зусім даволі часу і людзей для работы.

Галасы: правільна.

Каганавіч: Пярвічныя арганізацыі совецкіх устаноў набываюць зараз вельмі вялікае значэнне. Нельга думаць, што можна правесці ўсю работу па перабудове дзяржапарата без умацавання і паляпшэння совецкіх пярвічных парт арганізацый. У некаторых выпрацоўваюцца няправільныя, лёгкія адносіны да совецкай пярвічнай арганізацыі. Але хто-ж, як не члены партыі ў совецкіх установах — забяспечаць перабудову дзяржапарата і паляпшэнне яго работы?

Іменна яны. Таму пярвічным партыйным арганізацыям у совецкіх установах трэба аддаваць належную ўвагу.

5. СЕЛЬСКІЯ ПЯРВІЧНЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ—НА ЎЗРОВЕНЬ НОВЫХ ЗАДАЧ

Дазвольце спынуцца на пярвічнай арганізацыі ў калгасе і на сяле. Бы помніце, што к XVI з'езду наша вясковая партыйная арганізацыя была вельмі слабая. Вясковых ячэек налічвалася 30 тыс., у іх было 404 тыс. комуністаў: з гэтага ліку 263 тыс. знаходзіцца ў тэрытарыяльных ячэйках, 115 тыс. — у калгасных, 26 тыс. — у соўгасных і МТСаўскіх. На 1-е кастрычніка 1933 г. замест 30 тыс. ячэек маем 80 тыс. пярвічных арганізацый і кандыдацкіх груп, у якіх знаходзіцца замест 404 тыс. комуністаў — к XVI з'езду, 790 тыс. комуністаў. Паміма гэтага ў калгасах ёсць 22 тыс. партыйна-комсамольскіх груп і 38 тыс. комуністаў адзіночак.

У пяперашні момант мы маем 30 тыс. пярвічных калгасных арганізацый, 20 тыс. кандыдацкіх груп, 22 тыс. партыйна-комсамольскіх груп, 38 тыс. комуністаў адзіночак. Такім чынам, каля 50 проц. усіх калгасаў не маюць комуністаў.

У краях і абласцях з найбольш буйнымі калгасамі (Паўночны Каўказ, УССР, Нізавая Волга) шмат калгасаў, не ахопленых комуністамі, дасягае ад 3-х проц. (Нізовая Волга) да 22 проц. (УССР).

У краях і абласцях, дзе калгасы больш дробныя (Заходняя вобласць, Іванаўская вобласць), там процант калгасаў, не ахопленых комуністамі, дасягае 50-70 проц.

У такіх абласцях, як Нізовая Волга, Сярэдняя Волга, Паўночны Каўказ, Урал, Украіна, лёгка дабіцца, шляхам пасылкі работнікаў з раённых цэнтраў і прымацавання абласных і раённых работнікаў непасрэдна да калгасаў, ахопу комуністамі большасці калгасаў. У другіх-жа абласцях, дзе калгасы дробныя, гэта задача больш трудная.

Для росту пэўных у вёсцы комуністаў і адбору жадаючых і падыходзячых да ўступлення ў партыю, вельмі важнае значэнне мае мець практыка частаннага прымацавання абласных і раённых кіруючых работнікаў непасрэдна к таму або іншаму калгасу. Гэта значыць, што трэба прымацоўваць кіруючых работнікаў к калгасам не толькі для правядзення тых або іншых кампаній, але і для палітычнай і масавай арганізатарскай работы.

На аснове рашэння Цэнтральнага Камітэта, сельскія ячэйкі зараз перабудаваны па вытворчаму прызнаку, зусім змяніліся склад і твар сельскай пярвічнай партарганізацыі. Вось, напрыклад, склад адной, былой, валаснай партарганізацыі Яраполецкай вобласці, Валакаламскага павета, Маскоўскай вобласці — цяпер і раней.

Ячэйка складалася раней пераважна з адміністратыўнага персанала: старшыні сельсавету, членаў праўлення сельспажыўтаварыства, старшынь сельсоветаў, кантралёра па малаку, загадчыка малочным заводам, старшыні праўлення крэдытнага таварыства, участковага судзі, валаснога міліцыянера, прадаўшчыцы сельспажыўтаварыства, настаўніка, двух старшынь калгасаў і аднаго радавога калгасніка.

Цяпер-жа на гэтай тэрыторыі саве калгасныя пярвічныя парторганізацыі, адна кандыдацкая група ў калгасе і ў васьмі калгасах парткомсамольскае ядро. Склад іх рэзка змяніўся. Тупы-ж увахопіць старшыні калгасаў, бухгалтары, радавыя калгаснікі, калгаснікі, аграномы. Тут ужо пераважае другі склад.

Як бачыце, намёк, раней пышны валаснымі ячэйкамі і пяперашнімі калгаснымі пярвічнымі арганізацыямі вялікая розніца.

Ці павінны мы фарсаваць прыём у партыю ў вясковай парторганізацыі. Некаторыя гавораць: раз у калгасах парторганізацыі і комуністаў шма, давай набіраць у партыю. Гэта — памылка, гэта няправільна. Рэчна чаго ствараць штучна ў кожным калгасе парторганізацыі. Калі там вырастуць лю дзі, вартыя быць у партыі, калі ласка, мы павінны дапамагчы, каб яны выраслі, мы павінны прымацаваць над гэтай справай. А калі людзей такіх няма, штучна фарсаваць прыём не трэба, нельга набіраць чохам. Трэба ўмацаваць комсамольскую арганізацыю, комсамольскую групу, стварыць моцны беспартыйны актыў, каб арганізацыя аднаго калгаса абслугоўвала некалькі бліжэйшых калгасаў.

Зразумела, таварышы, неабходна ўзмацніць увагу к кожнаму калгасу, кожнаму калгаснику ўпасобку.

Не трэба баяцца таго, што некаторыя калгасныя партыйныя арганізацыі нешматлікія. Сіла іх павінна заключацца не ў шматлікасці, а ў кіраўніцтве беспартыйным актывам, у яго згуртаванні вакол нешматлікай калгаснай пярвічнай парторганізацыі, у яго згуртаванні вакол партыйна-комсамольскай групы або вакол адзіночак-комуністаў.

Нельга забываць сур'ёзнага значэння тэрытарыяльных сельскіх парторганізацый, бо яны прамым чынам звязаны з сельсоветамі, з кааперацыяй. А мы ведаем, што роля сельсоветаў і кааперацыі не толькі не зменшаецца, а ўсё ўзрастае. Цяпер ужо нават тыя, якія збіраліся ліквідаваць сельсоветы і зліць іх з калгасамі, зразумелі, што гэта лявацкае глупства.

Да ўсяго гэтага неабходна дадаць, што калі пытанне аб марксісцка-ленінскай вучобе стаіць востра ў горадзе, то ў вёсцы яно стаіць ва сто раз больш востра. Вясковыя комуністы і ў першую чаргу сакратары партыйных арганізацый, старшыні праўленняў калгасаў, старшыні сельсоветаў ад чуваюць зараз вострую патрэбнасць у падняцці свайго культурна-палітычнага ўзроўню.

І тут трэба, быць можа, прымяніць і такую форму, як склікание сакратароў калгасных парторганізацый па кароткатэрміновых курсы. Можна спасланца на вопыт Маскоўскай вобласці, дзе ў снежні гэтага года 900 сакратароў калгасных парторганізацый былі скліканы на кароткатэрміновыя курсы. Гэтыя курсы аказаліся безумоўна станоўчым фактарам і далі штурпшок сакратарам калгасных парторганізацый у іх імкненні да далейшага павышэння свайго ўзроўню. Патрэба ў гэтым велізарная.

Дазвольце агаласіць вытрымку з ліста аднаго з сакратароў калгаснай парторганізацыі, набываўшага на гэтых курсах:

«Зараз папаў у Маскву на дзесяць дзён на курсы, якія многае далі і, самае галоўнае, прымушаюць далей вучыцца, ведаць праграму нашай партыі, ведаць вучэнне Леніна і Сталіна, ведаць сельскую гаспадарку і міжнароднае становішча. Мне прыходзілася прапаваць над сабой на даму, але што-ж атрымліваецца—толькі сядзеш пачытаць тав. Сталіна, падрыхтавацца да заняткаў або штонебудзь з белетрыстыкі, дык табе тут сварка, плач дзяцей і т. д. Думаю, дай пайду ў ячэйку, там запруся і буду рыхтавацца, раптам ступаюць, крык: што запеся, ад злодзея? Пытаю: у чым справа? Ды адчыні. Ім адказваеш: хлопцы, я рыхтуюся да заняткаў. Ды адчыні, у мяне ёсць пытанне па сакрэту. Адчыняеш, ён гаворыць: сёння ноччу вартаўнік па мляне накраў хлеб. Запішаш, ён уходзіць. Зноў запіраюся і саджуся рыхтавацца. Раптам зноў убягае і крычыць: хутчэй пойдзем на фермы, там не ўсё добра. Кінеш і ідзеш. У другі раз таксама атрымліваецца, толькі што сядзеш зайнацца, тут табе прыехаў з Масквы з якой-небудзь рэдакцыі—дзе сакратар ячэйкі, пытае. У чым справа? Нам трэба азнаёміцца з вашай гаспадаркай, паедзем з табой па гаспадарцы, і едзеш».

Вось якія труднасці адчуваюць нашы нізавыя работнікі ў справе сваёй падрыхтоўкі. А сакратары-ж пярвічных партыйных арганізацый у тым ліку і ў вёсцы, павінны быць самі прапагандыстамі і палітычна падкаванымі людзьмі.

Рост калгаснай пярвічнай арганізацыі і ўмацаванне калгаснага ладу прад'яўляюць да партыйнага кіраўніцтва новыя і новыя патрабаванні. Гэтыя патрабаванні ставяць задачу ўмацавання, перш за ўсё, кіруючых кадраў пярвічных партыйных арганізацый у вёсцы.

Тут могуць і павінны быць розныя шляхі яе вырашэння. За гэты час для работы ў вёсцы і непасрэдна ў калгасах паслана каля 50 тысяч работнікаў. Але гэтага недастаткова. Нам прыдзецца яшчэ некаторы час, трымаючы курс на выхаванне і выгадаванне мясцовага калгаснага актыва, пасылаць работнікаў з раёнаў і гарадоў непасрэдна ў калгасы.

Неабходна ўмацаваць штодзённае і сістэматычнае кіраўніцтва вясковымі парторганізацыямі, выхоўваючы калгасных большэвікоў на канкрэтных практычных пытаннях калгаса і палітычных лозунгах партыі. Калі пасылаюць на колькаюць парторганізацый, якія прыпадаюць па аднэй палітаддзел і райком, то мы ўбачым, што не так ужо цяжка і палітаддзелу, і райкому правяраць і ведаць кожнага сакратара і самую калгасную пярвічную парторганізацыю. Уласна кажучы, іменна для непасрэднага ўмацавання работы калгасаў у вёсцы і створаны палітаддзелы.

Што датычыць работы самой пярвічнай парторганізацыі, то павінен вам сказаць, што яна зараз яшчэ не падвялася да ўзроўню работы сапраўднай вытворчай парторганізацыі. Мы зрабілі агромадны крок наперад параўнальна з тым, што мелі. Работа пярвічных парторганізацый палепшылася, асабліва ў сувязі са стварэннем палітаддзелаў. Але ўсё-ж у гэту новую форму вытворчай каласнай і соўгаснай парторганізацыі яшчэ не ўлажылі сапраўднага зместу іх работы.

Усе адзначаюць, што арганізацыя палітаддзелаў падняла ідэйнасці вёску, падняла комуністаў і ўмацавала пярвічныя парторганізацыі.

Калі на XVI з'ездзе партыі мы гаварылі, што ў нас у вясковай парторганізацыі няма моцна спаянай ваяўчай ячэйкі, то сёння мы москам ужо заявіць, што яна ёсць, але яна яшчэ слаба. Мы павінны шанаваць яе, умацаваць, не фарсуючы штучна прыём, адбіраць лепшых людзей для таго, каб мы мелі ў калгасах сваіх комуністаў, комсамольцаў і партыйнае ядро.

6 ВОПЫТ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ І ПЕРАБУДОВА РАБОТЫ РАЙКОМАЎ

Палітаддзелы адыгралі суп'бзную ролю іменна таму, што яны звязаліся непасрэдна з сялом. Скалацілі партыйную арганізацыю ў вёсцы аказвалася куды трудней, чым у горадзе. І вось для скалачвання гэтых арганізацый, для іх гартавання, для іх загартоўкі партыя, па ініцыятыве тав. Сталіна, паслала ў вёску звыш 18 тыс. работнікаў палітаддзелаў МТС і соўгасаў, людзей праверэных і большэвіцкі загартаваных. У аснову гэтай арганізацыі таварыш Сталін паклаў тыя-ж прынцыпы, якія Ленін развіў у кнізе «Што рабіць». Тав. Сталін не раз падкрэсліваў, што калі-б мы гэтага не зрабілі, нам прыйшлося-б чакаць дзесятак год, каб у вёсцы вырасці работнікі такога маштаба з мясцовых кадраў.

Сёння, пасля года з лішнім работы палітаддзелаў, мы можам сказаць, што яны з гонарам выканалі ўскладзеныя на іх задачы і апраўдалі тое даверэ, якое ўкладала на іх наша партыя. **(Апладысменты).**

Мы спадзяемся, што нашы палітаддзелы МТС і соўгасаў у 1934 годзе і ўжо гэтай вясною пакажуць, што яны не толькі не дадуць спаду ў сваёй рабоце, але падымуць яе на новую вышыню. Хацелася-б, каб нашы чытаючыя палітаддзелы вывучылі ўсе прыёмы работы палітаддзелаў МТС, якія выкоўваліся літаральна ў баі, у барацьбе і прымянялі-б іх на адным з самых вострых нашых участкаў — на чыгуначным транспарце.

Многія цікавяцца пытаннем: у чым справа? Чаму палітаддзелы здолелі паставіць сваю работу і чаму ў райкомаў справа выходзіла горш?

Папершае, трэба сказаць, што ў асобе палітаддзелаў мы далі ў вёску калр свежых людзей, якія паехалі туды ў пэўнай атмасферы, у пэўнай абстаноўцы, для пэўных выразных і ясных задач. Работнікі-ж райкома былі там на працягу раду год і вельмі многія з іх не заўважылі новых класавых працэсаў у вёсцы. А некаторыя паддаліся класава-чужым уплывам.

Падругое, таварышы, справа ў сістэме работы.

Прадаставім слова былому сакратару раду райкомаў партыі (Кар сакава, Гразі, Курск) тав. Гусеву, які стаў начальнікам палітаддзела Кірсапаўскай МТС. Вось што ён гаворыць:

У раёне па маю работу ўплывала наяўнасць апарата—там я расплываўся. Раён, калгасы, я ўжо не гавару аб брыгадзе, я ведаў у агульных рысах, і таму і кіраўніцтва было агульным. Калі мне трэба зрабіць тую або іншую справу, я перадаваў апарату, перадаваў РВК, райза, а праверыць выкананне не было часу.

У раёне ў нас бывала шмат пасяджэнняў, нарад і мы пытанні, хоць і злабадзённыя, абмяркоўвалі, але яны аставаліся ўнутры нашых апаратаў.

(ПРАЦЯГ НА 6 СТАР.).

Працяг даклада таз. Л. М. КАГАНОВІЧА

Зусім іншая справа тут у паліт аддзеле. Як толькі ўзнікае тое, або іншае пытанне, або я сам, або хто-небудзь з апарата абавязкова разбярэм яго і даб'емся вырашэння ў той або іншы бок. Нашы нарады тут, якія мы наладжваем кожную суботу, носяць зусім другі характар. На гэтых унутрыпалітаддзельскіх нарадах мы звычайна падводзім вынікі нашай канкрэтнай работы за тыдзень, ад значаем слабыя бакі і намячаем канкрэтныя меры па іх знішчэнню. Пасля гэтых нарад мы ўсе раз'язджаемся зноў на месцы для правядзення тых пастаноў, якія мы прынялі. За тыднёвы тэрмін мы паспяваем аб'ехаць самыя слабыя ўчасткі работы радыуса МТС і на месцы прымаем меры да іх знішчэння. А потым правяраем, якія рэзультаты гэтыя меры далі. Ніякіх рэзалюцый, пастаноў, пісьменных указанняў. Вядзем толькі дзённікі нашай работы.

Тав. Гусёў зусім праў.

Калі параўноўваць работу начальніка палітаддзела і сакратара райкома, то мы бачым, што начальнік палітаддзела бывае разы ў тры больш у калгасе, чым сакратар райкома. Гэта, вядома, зусім не таму, што работнікі раёнаў не хочуць ездзіць у вёску. Не, яны ездзяць многа і гатовы ездзіць, я не кідаю абвінавачванне работнікам раёна — людзі працуюць многа і працуюць часам у трудных умовах. Але справа не ў гэтым. Справа ў падыходзе да работы, у яе пастаноўцы. Райкомаўцы больш засядаюць, больш складаюць пратаколы, пішуць дырэктывы, а сапраўднай праверкі выканання няма.

Начальнікі-ж палітаддзелаў вядуць сваю работу, галоўным чынам, непасрэдна ў калгасе, ажыццяўляючы дырэктывы т. Сталіна, даныя ім пры арганізацыі палітаддзелаў.

Мы гутарылі з многімі сакратарамі райкомаў, і ўсе яны скардзяцца на грамоздкасць раённага апарата, на велізарную колькасць раённых устаноў, якімі яны абавязаны кіраваць. У раёне ёсць да 26 раённых арганізацый і да 12 міжраённых. Кіраўніцтва гэтым грамоздкім апаратам займае ў райкомаўцаў гібель часу, і гэта не дае ім магчымасці бываць у калгасах.

У метадах работы райкома, яго аддзелаў вельмі многа канцылярычны, пісаніны і адсутнічае дзелавая аперацыйная праверка выканання. Калі нават узяць аддзелы райкома—аргінстр і культпроп, работнікі якіх павінны ездзіць у вёску, то аказваецца, што яны ездзілі ў вёску менш, чым памочнік начальніка палітаддзела. Вось чаму, таварышы, зараз, захоўваючы і ўмацоўваючы палітаддзелы, мы павінны адначасова перабудаваць і райкомы. Райкомы неабходна зрабіць больш гібкімі, больш рухавымі, больш аператыўнымі. Іменна таму мы ідзем па ліквідацыю аддзелаў у райкомах і прапануем узамен аддзелаў мець раз'язных адказных інструктароў. Гэтыя інструктары—не інструктары старога тыпу, якія прыязджалі ў раёны, правяралі пратаколы партыйнай арганізацыі і не мелі ніякіх праў прыняць на месцы неабходныя меры. Цяпер гэта будзе інструктар, які будзе мець пэўную групу тэрытарыяльных партыйных арганізацый і адказваць за іх работу.

Што датычыць гарадскіх раёнаў, то і тут, нават у такіх гарадах як Масква і Ленінград, дзе райкомы роўны часамі цэламу гораду, і нават некаторым абласцям, мы ўсё-ж умовіліся правесці ў іх ліквідацыю аддзелаў, пакінуўшы адзін культпроп. Тут таксама ўводзіцца інстытут інструктароў.

Мы трымаем курс на тое, каб раён, які атрымаў шмат правоў, меў магчымасць іх рэалізаваць. Але многіх цікавіць пытанне, якжа будзе далей, з палітаддзеламі і райкомамі, указваючы на некаторую супярэчнасць. Зразумела, з пункту погляду фармальнай логікі, тут ёсць некаторая супярэчнасць. Нават у самым стварэнні палітаддзелаў была пэўная супярэчнасць. Палітаддзел не ёсць звычайная форма партыйнай арганізацыі, гэта спецыяльная, з пэўным прызначэннем партыйная арганізацыя выгворчага тыпу.

Некаторыя таварышы, як-жа так, у раёне працуе палітаддзел, падпарадкоўваецца яму партыйная арганізацыя, а ён, моў, райкому не падпарадкаван. Але калі-б мы падпарадкавалі палітаддзелы райкомам, заканчваю вас, палітаддзелы не справіліся-б так з задачай, як яны справіліся з ёю зараз.

Галасы: Правільна.

Каганові́ч: Палітаддзелы з самага пачатку арганізацыі былі пастаўлены ў асобыя ўмовы работы. Калі ў ЦК былі атрыманы весткі аб тым, што некаторыя райкомы ашыўляюць некаторую коснасць і супраціўляюцца новым метадам работы, мы ў гэтым годзе дзелі спробу затармазіць правядзенне рашэнняў ЦК па выкананню новых задач, пастаўленых партыяй і прамовай тав. Сталіна аб работе ў вёсцы. Па гэтых настроях ударылі. Там, дзе лінія раённых камітэтаў супадала з лініяй палітаддзелаў на правядзенне пастаноў партыі, а гэта ў большасці, што мы не прадвырашаем, дзе, у якім месцы могуць быць створаны палітаддзелы, дзе, у сілу якіх умоў яны будуць узнікаць або скасоўвацца на пэўных участках нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

Палітаддзелы сябе апраўдалі, і ставіць зараз пытанне аб ліквідацыі палітаддзелаў — гэта шкодна. Паглядзіце, які аўтарытэт маюць палітаддзелы ў сялянства. Штучна не стварыць такога аўтарытэта. Гэты аўтарытэт зароблен практычнай работай. Аб перспектывах работы палітаддзелаў мы ставім пытанне шырэй. У нас складваюцца новыя эканамічныя і палітычныя цэнтры ў вёсцы — МТС і соўгас. Старыя раённыя цэнтры ствараліся на зусім іншаму прызнаку: гандлёвае сяло, адміністрацыйны цэнтр. Цяпер, у сувязі са стварэннем МТС, соўгасаў, новых прадпрыемстваў стваравоцца новыя цэнтры прыцяжэння, вакол якіх групуюцца калгасы.

Матчымы два лініі развіцця: або палітаддзел там, дзе тэрыторыю, ахапляемую МТС, мэтазгодна вылучыць у самастойны раён, можа стаць райкомам, або палітаддзел можа стаць падрайкомам. Пытанне аб тым, хто будзе «пад» і хто «над», для большасці пытанне другараднае. Справа ў сутнасці работы.

Тав. Шэбалдаеў сказаў тут, што наўрад ці будзе мэтазгодна палітаддзелы ператвараць у райкомы. Думаю, што не трэба гадаць і не трэба даваць схематычных рэцэптаў у арганізацыйным пытанні. Трэба канкрэтна, прыстасоўна да кожнага раёна, да кожнага палітаддзела вырашаць пытанне. Цэнтральны Камітэт так іменна і будзе вырашаць пытанне.

На сённяшні дзень, таварышы, мы астаўляем нашы палітаддзелы ў тым вылучэнні, у якім яны існавалі. Яны павінны працаваць энергічна сваю работу. Нельга ставаць вакол палітаддзелаў атмасферу касавання. Справа сёння заключаецца ў тым, што нашы задачы ў вёсцы ніяк не вызначаны, што прадстаўляе сур'ёзная работа ўмацавання калгасаў, перавароцення іх у сапраўды большэвіцкія. Трэба асвоіць дасягнутыя перамогі. Ёсць небяспека галавакружэння, захапленне перамогамі, небяспека прамазгаць гэту вясну, упусціць момант трактароў. Гэта будзе злачынствам.

Мы пакідаем палітаддзелы і райкомы ў стане дружнай работы, як яны працавалі да гэтага часу. Зразумела, падтрымаць дружнай работы нельга разумець, як маральную катэгорыю. Мы разумеем гэта арганізацыйна і палітычна, як гэта склалася сёння на базе дырэктыў ЦК, на базе барацьбы, якая вялася за перамогу соцыялістычных форм сельскай гаспадаркі, і мы ўпэўнены, што палітаддзелы і падалей разам з райкомамі будуць з поспехам умацоўваць калгасны лад у вёсцы (**аплядысменты**).

7. АБ ВЫТВОРЧА-ГАЛІННЫХ АДДЗЕЛАХ АБКОМАЎ, КРАЙКОМАЎ І ЦК

Нашы арганізацыйныя мерапрыемствы ў галіне партыйнага будаўніцтва былі-б незакончанымі, калі-б мы абмежаваліся толькі пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі і райкомамі. Работа ўсіх партарганізацый залежыць у значнай ступені ад работы абкомаў, крайкомаў і іх апаратаў.

Вы ўсе памятаеце, як па студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК (у 1933 годзе) тав. Сталін падверг заслужанай рэзкай крытыцы работу некаторых абкомаў, крайкомаў і ЦК нацкомпартый.

Акругі былі ліквідаваны для таго, каб наблізіць вобласці і краі да раёнаў. На справе, у сувязі з тым, што з аграмаднай рэформы ліквідацыі акруг не зрабілі ўсіх неабходных арганізацыйных вываў, не толькі такія рэспублікі, як Украіна і Казакстан, з іх аграмаднай тэрыторыяй і вялікай колькасцю раёнаў, але і многія іншыя вобласці і краі аддаліліся ад раёнаў.

Абласныя органы дрэнна вывучалі раёны, не ведалі раённых работнікаў, не ведалі, што робіцца ў раёнах. А ў наш-жа час, калі даеш раёну план хлебазагатовак, пасеўны план, калі не ведаеш, колькі ў яго ворнай зямлі, які ў яго севазварот, колькі ў яго цягі, колькі насення і чым раёну канкрэтна трэба дапамагчы, — твой план не толькі ператвараецца ў пустую паперку, але зачастую ператвараецца ў тормаз руху ўперад, дэзарганізуе работу. Так і было, калі аднаму раёну давалі, напрыклад, перапавялічаны план хлебазагатовак, а другому раёну—пераўменшаны. У рэзультаце адны раёны аказваліся ў цяжкім становішчы, а другія—у прывілеяваным. Гэта лішняя ілюстрацыя сувязі палітыкі з правільным вырашэннем арганізацыйных пытанняў.

Тав. Сталін на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК рэзка ўскрыў палітычныя і арганізацыйныя недахопы нашай работы ў вёсцы. Барацьба з імі, работа над іх выпраўленнем, у першую чаргу з боку абкомаў, крайкомаў і ЦК нацкомпартый і палітаддзелаў, у рашаючай меры вызначыла поспех гэтага года. Цяпер работа палепшылася, людзі спаяліся ў барацьбе за перамаганне труднасцяй, лепш вывучылі раён, але яшчэ недастаткова.

У недахопах кіраўніцтва раёнамі ва многім павінна няправільная функцыянальная пабудова партыйных апаратаў абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкомпартый. Уласна кажучы, таварышы крайкомаўцы, калі паставіць пытанне адкрыта і рэзка, то мы павінны сказаць, што аддзелы нашых абкомаў—крайкомаў апошнія два-тры гады працуюць кепска. Яны выбіліся з каляіны, бо жывуць абагнала функцыянальную пабудову апарата.

«Функцыянальшчына» ў апаратах абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкомпартый і ў апараце ЦК перашкаджала рабоце «функцыянальшчына» перашкаджала схватваць асноўныя пытанні жыцця, і ад сваіх аддзелаў Цэнтральны Камітэт атрымліваў часта менш матэрыялаў, чым ад іншых арганізацый.

Перабудову апарата аддзелаў абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкомпартый і самога ЦК мы ставім не як тэхнічную задачу. Мы ствараем цэласныя вытворчыя аддзелы. Гэта значыць, што замест агітацыйна-масавага аддзела, які універсальна ахапляў агітацыю, масавую работу па ўсіх пытаннях і па ўсіх галінах прамысловасці, транспарта, вёскі і т. д.; замест функцыянальнага арганізацыйна-інструктарскага аддзела, які таксама вёў работы, — ва ўсіх галінах стваравоцца вытворча-галінныя аддзелы, нам патрэбны цэласныя аддзелы, якія-б ведалі партыйнай работай, пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі, масавай агітацыяй, падборам кадраў, размеркаваннем людзей, вывучэннем гэтых людзей, прафесіянальнай работай і т. д.

У абкомах і крайкомах будуць наступныя аддзелы: сельска-гаспадарчы, прамыслова-транспартны, совецка-гандлёвы, культуры і прапаганды ленінізма, кіруючых парторганаў (гарадскіх і раённых) і асобы сектар.

У Цэнтральным Камітэце транспартны і гандлёвы аддзелы будуць існаваць асобна.

Якую работу будуць весці гэтыя аддзелы:

Сельска-гаспадарчы аддзел мае ўжо вопыт весці ўсю работу партапарата па сельскай гаспадарцы. У сферу яго работы ўвойдуць калгасы, МТС, соўгасы, загатоўчыя органы, усе сельска-гаспадарчыя навукова-даследчыя і навучальныя ўстановы, друк па сельскай гаспадарцы і ўсе астатнія пытанні партыйнай і совецкай работы ў вёсцы. Гэты аддзел наглядае за пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі ў вёсцы і кіруе іх работай. Ён-жа падбірае кадры, ведае размеркаваннем людзей. Тыя-ж функцыі па сваёй галіне будуць і ў іншых аддзелах.

Прамысловы аддзел ахопіць цяжкую, лёгкую, лясную і харчовую прамысловасці, работу ў комунальнай гаспадарцы, мясцовай прамысловасці і саматужнай кааперацыі.

Транспартны аддзел ахопіць работу на чыгунках, водным транспарце, грамадзянскай авіяцыі, аўта-гужавым транспарце. Яго значнае асабліва ўзрасце ў сувязі з баявымі задачамі дабіцца пералому на транспарце, падняць транспарт на новую вышыню ў адпаведнасці з патрабаваннямі другой пяцігодкі.

Планава - фінансава - гандлёвы ахопіць работу ў планавых, фінансавых і гандлёвых органах, у тым ліку ў органах замежнага гандлю.

Палітыка-адміністрацыйны аддзел ахопіць работу ў агульна-совецкіх органах (край- і аблвыканкомы, РВК, горсоветы), у Чырвонай арміі (сумесна з ПУР'ам), органах пракуратуры і інш.

Аддзел культуры і прапаганды ленінізма. Гэты аддзел, апрача сваіх звычайных функцый, павінен будзе ў куды большай меры наглядаць за ўсёй дзейнасцю ўстаноў Наркамасветы і Наркамаховы здароўя, усіх культурных і навуковых арганізацый, якія падрыхтоўваюць кадры. Ён будзе па частцы прапаганды ленінізма абслугоўваць усю партыю, а ў пярвічных партыйных арганізацыях культурных устаноў весці ўсю арганізацыйна-партыйную работу.

Аддзел кіруючых парторганаў будзе ажыццяўляць нагляд за работай кіруючых парторганаў абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкомпартый. Але гэты-ж аддзел будзе час ад часу залязаць у работу райкомаў. У абкомах гэтыя аддзелы будуць сканцэнтроўваць сваю работу, галоўным чынам, на гарадскіх і сельскіх раёнах і час ад часу залязаць для праверкі работы райкома ў тую ці іншую пярвічную партыйную арганізацыю. Аддзел будзе таксама займацца пытаннямі партыйных кадраў.

Зараз расце актыў, але часта адчуваеш вялікія затрудненні, калі падбіраеш работніка на кіруючую партработу. Час пакончыць з такім становішчам. Калі патрэбен работнік той ці іншай кваліфікацыі, — прыходзіцца наспех падшукваць. Трэба мець пастаянны рэзерв работнікаў, вывучаных не па анкетах, а па жывой рабоце. Каб ведаць работніка, трэба яго выклікаць, гаварыць з ім асабіста адзін раз, другі, праверыць з аднаго, з другога боку, праверыць па справах, па матэрыялах. Гэта вельмі складаная справа.

Стварэнне аддзела кіруючых парторганаў у Цэнтральным Камітэце партыі азначае ўзмацненне кантролю і праверкі работы абкомаў і крайкомаў з боку ЦК. Тое-ж самае можна сказаць аб праверцы абкомамі работы райкомаў. Правер ку выканання неабходна звярнуць па ўсіх вузлавых пытаннях, толькі без «завязвання» і «развязвання» вузлоў (**смех**), а паставіць аператыўную праверку ў парадку штодзённай бягучай работы.

Кожны вытворчы аддзел будзе весці ў наркаматах па сваёй лініі праверку выканання. Аднак, партыя і яе Цэнтральны Камітэт павінны мець аўтарытэтны орган кантролю, як гаварыў тав. Сталін у сваім дакладзе, сур'ёзны орган, які будзе правяраць і ўстанаўліваць кантроль і месц, і наркаматаў, і профсаюзаў і ўсіх іншых органаў, якім так або інакш адрасавана дырэктыва Цэнтральнага Камітэта партыі.

8. ЛЕНІНСКАЯ ЛІНІЯ—КАНТРОЛЬ ВЫКАНАННЯ І АПЕРАТЫЎНАСЦЬ КІРАЎНІЦТВА ЦК ПАРТЫІ—ЗАБЯСПЕЧЫЛІ І ЗАБЯСПЕЧАЦЬ ПЕРАМОГУ

Тэзісы ЦК патрабуюць аператыўнай праверкі выканання. Яны патрабуюць, каб праверка праводзілася непасрэдна кіруючымі работнікамі, бо гэта асноўная работа кіраўніка.

Праверка выканання павінна быць сістэматычнай і штодзённай, а не эпізадычнай, ад выпадку да выпадку. Ясна для ўсіх, што пакідаць кантроль у такім стане, у якім ён быў да гэтага часу, нельга, таму што аператыўнае кіраўніцтва перарасло яго. Кантроль трэба падняць і падпягнуць да аператыўнага кіраўніцтва, інакш мы атрымаем разрыў паміж кіраўніцтвам і праверкай выканання. Для ажыццяўлення сапраўды канкрэтнага і аператыўнага кантролю ствараюцца замест ЦКК-РСІ і Камісіі Выканання, Камісіі Партыйнага і Совецкага Кантролю.

Тэзісамі і праектам статута прадугледжана, што Камісія Совецкага Кантролю выбіраецца з'ездам партыі. Мы прапануем унесці наступныя змены ў тэзісы і статут: члены Камісіі Совецкага Кантролю намячаюцца з'ездам і зацвярджаюцца ЦВК і Соўнаркомам СССР.

Як мы прадстаўляем сабе работу Партыйнага і Совецкага Кантролю. Зразумела, прыдзецца сур'ёзна і падрабязна распрацаваць палажэнне аб камісіях прыстасоўна к задачам і патрабаванням партыйнага і совецкага кантролю выканання рашэння. Справу можна прадставіць так: камісіі выбіраюцца на з'ездзе, а на мясцах яны не выбіраюцца. У рэспубліцы, краі і вобласці пасылаюцца ў якасці ўпаўнаважаных цэнтра члены камісіі, выбраныя на з'ездзе. З пункту погляду ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ясна, што выбары на з'ездзе ўсесаюзнай комуністычнай партыі перакрываюць выбары на мясцах.

Пасланыя на месцы члены камісіі будуць, папершае, кантраляваць выкананне пастаноў партыі і ЦК, падругое, прыцягваць да адказнасці вінаватых у парушэнні партыйнай дысцыпліны і партыйнай этыкі. Члены камісіі будуць падпарадкаваны толькі цэнтру. Упаўнаважаныя камісіі будуць паведамляць у Цэнтральны Камітэт аб усіх справах, усіх недахопах і парушэннях пастаноў ЦК у рэспубліках, краях і абласцях. Вы бачыце, таварышы, што справа ідзе не аб аслабленні, а аб узмацненні кантролю.

Любчанка: Заметна.

Каганові́ч: Камісія партыйнага кантролю будзе мець у цэнтры групу людзей, якая будзе сістэматычна кантраляваць як цэнтральныя арганізацыі выконваюць пастановы ЦК. Раз рашэнне выпесена, то яго трэба штодзенна кантраляваць і дакладваць ЦК.

Па лініі Совецкага Кантролю ў цэнтры таксама будзе група работнікаў. Астатнія члены гэтай камісіі паедуць упаўнаважанымі на месцы. Вобласць, край і рэспубліка будуць мець, можна вас «парадаваць», замест аднаго старшыні КК — двух упаўнаважаных. (**Смех**). Справа, зразумела, не ў колькасці. Справа ў сутнасці аператыўнай пастаноўкі кантролю.

Правільна пастаўлены партыйны і совецкі кантроль можа прывесці к таму, што нам прыдзецца ўжываць значна меншую колькасць спагнанняў, чым пры дрэнным кантролі. (**Апладысменты**).

Сталін: Кантроль папярэджвае.

Каганові́ч: Сапраўды, добры кантроль, як правільна гаворыць т. Сталін, папярэджвае парушэнні рашэнняў партыі і совецкага ўрада.

Адно тое, што ўсе будуць ведаць, што гэта не выпадковы налёт, а сістэматычны кантроль, кантроль пасапраўднаму і не па праблеме «увогуле і ў цэлым», а па канкрэтных пастановах ЦК і СНК,—адно гэта ўжо прымусіць хутчэй выконваць рашэнні. Прыпяду прыклад. У мінулым годзе, калі з вырабам запасных частак справа стала дрэнна, Цэнтральны Камітэт у парадку праверкі выканання ўмяшаўся і прапанаваў спытаць ведамственныя перапалкі, і ў дакладныя тэрміны выканаць заказ на запасныя часткі. У рэзультаце аператыўнай мабілізацыі ўсіх сіл прамысловасць падцягнулася, узялася пасапраўднаму, падзарджаўному і выканала заказ.

Камісіям партыйнага і совецкага кантролю, ды багдай не толькі гэм, прыдзецца прайсці сур'ёзны курс у Цэнтральнага Камітэта партыі. Вывучаючы работу ЦК, яго аператыўнасць і яго праверку выканання, можна навучыцца таму, як трэба ставіць аператыўнае кіраўніцтва і кантроль. Вялікейшыя рашэнні ЦК на фасаду галін. агульнакомандныя ў друку і не апублікаваныя, прыняты большай часткай у парадку аператыўнай праверкі выканання.

Прыняду ў якасці прыкладу вядомае рашэнне ЦК па Данбасу. Вы ведаеце, што прымалася многа рашэнняў па вугалю. У парадку праверкі выканання, і правяркі не проста фармальнай, а праверкі зверху данізу, было пастаўлена пытанне аб рабоце Данбаса. Хіба выклікалае ў Цэнтральны Камітэт партыі і прафесіяналістаў, і піаавых гаспадарнікаў з шахт Данбаса не з'яўляецца праверкай? У парадку гэтай праверкі радзілася тое гістарычнае рашэнне, якое адыграла і адыгрывае буйнейшую ролю ва ўсім вашым дзяржаўным і гаспадарчым будаўніцтве.

Гэта пастанова мае сваю гісторыю. Можна было-б расказаць падрабязна, як першы камісія, якую выбралі, прынесла рэзалюцыю па Данбасу звычайнага тыпу. Другая камісія таксама прынесла праект, не адпавядаючы задачам сёпешняга дня, агульны паўтараючы тое, што мы ставілі не раз. І толькі пасля грунтоўнай глыбокай праверкі, пасля вывучэння фактаў, такога іх абагульнення, на якое здольны толькі тав. Сталін, мы атрымалі тую рэзалюцыю, якая сёння ляжыць у аснове ўсёй нашай арганізацыйнай перабудовы. (**Апладысменты**).

Але гэтага мала. Пасля ўказанай пастановы Цэнтральны Камітэт партыі арганізаваў рад праверак. Праверка ідзе і зараз. Здавалася, данбасаўцы не могуць вылезці з прарыву, а мы бачым, што яны вылезлі, падняліся, палепшылі работу.

Па ўсіх другіх галінах прамысловасці, таварышы, працуючыя на гэтых участках, ведаюць практыку работы ЦК, ведаюць, як ён правярае выкананне сваіх пастаноў. Ці датычыць справа Тагільскага вагонабудаўнічага завода, ці датычыць яна работы Крывароскага басейна, ці датычыць васінай прамысловасці, нафты, Цэнтральны Камітэт сістэматычна правяраў выкананне сваіх пастаноў. Калі вы памятаеце, Палітбюро па Сталінградскаму трактарнаму слухала ў 1931 годзе справаздачы ў парадку праверкі кожныя пяць дзён.

КАНЕЦ ДАКЛАДА У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

ПАДЗЕІ У АУСТРЫІ

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА. ПРОЛЕТАРСКІ АДПОР ФАШЫСЦКАЙ ГЭАКЦЫІ

УЗБРОЕНЫЯ ПАУСТАННІ У РАБОЧЫХ КВАРТАЛАХ, БАРЫКАДЫ, БАІ З ПАЛІЦЫЯЙ

ПРАГА, 12 лютага. (БЕЛТА).

Паводле вестак карэспандэнтаў газет, ход падзей у Аўстрыі прадстаўляецца ў наступным выглядзе: сёння раніцой у горадзе Лінцы паліцыя ўварвалася ў «рабочы дом» мясцовай соцыялдэмакратычнай арганізацыі для правядзення вобыску ў пошуках зброі.

Рабочыя аказалі супраціўленне і забарыкадаваліся ў «рабочым доме». Супроць рабочых былі накіраваны райсковыя часці з кулямётамі. Завязаўся крывавы бой. К палове пятага налічвалася 20 забітых і 100 раненых.

Супроць паўстаўшых была кінута артылерыя, пасля чаго паўстаўшыя адступілі. Становішча ў Лінцы зараз такое, што ўрадавыя войскі займаюць цэнтр горада, тым часам як **АКРАІНЫ ЗНАХОДЗЯЦЦА У РУКАХ ПАУСТАЎШЫХ РАБОЧЫХ.**

Зараз-жа пасля таго, як весткі аб падзеях у Лінцы пачалі паступаць у Вену, рабочыя газавага завода і электрычных прадпрыемстваў аб'явілі забастоўку салідарнасці. Да іх далучыліся рабочыя вадаправоду і трамвайшчыкі.

ПАСЛЯ ПОЎДНЯ У ВЕНЕ БЫЛА АБ'ЯЎЛЕНА ЎСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА. На працягу бліжэйшых гадзін чакаецца **ПАШЫРЭННЕ ЗАБАСТОЎКІ ПА ЎСЕЙ АЎСТРЫІ.**

БАРЫКАДНЫЯ БАІ ПРАДАЎЖАЮЦЦА

ПРАГА, 13 лютага (БЕЛТА).

Паведамленне з Вены гаворыць, што рабочыя Вены далі адпор фашысцкаму наступленню і, не гледзячы на капітуляцыю соцыял-дэмакратычных правадыроў, не толькі абараняліся са зброяй у руках, але ў некаторых месцах былі гаспадарамі становішча.

Паліцыя, войскі і ўзброеныя атрады хеймвера з'яўляюцца «гаспадарамі» толькі першага венскага раёна, г. зн. цэнтра горада, які акружан драцянымі загародамі. Большасць комунальных прадпрыемстваў і пролетарскія раёны заняты рабочымі прадпрыемстваў і рабочымі — членамі соцыял-дэмакратычнага шуцбунда.

Рад сумесных атак паліцыі, войск і хеймверaўскіх атрадаў па рабочыя кварталы быў адбіт.

ВАРШАВА, 13. (БЕЛТА).

З Вены паведамляюць, што ўся Вена занята паліцыяй і войскамі. У рабочых раёнах прадаўжаюцца баі. Несупынна даносяцца гарматныя выстралы. На ўсіх скрыжаваннях і мастах—дротавыя загароды. На венскіх ускраінах—Оттакрынгу, Зімерынгу, Грынцынгу і Фаворытэн рабочыя пабудавалі барыкады. З вокан сваіх кватэр рабочыя адстрэльваюцца з кулямётаў і вінтовак. Некалькі барыкад узяты войскамі прыступам.

* * *

ЛОНДАН, 13 лютага. (БЕЛТА). Згодна паведамлення Рэйтэр з Вены, лідэр аўстрыйскай соцыял-дэмакратычнай партыі Отто Бауэр і галоўнакамандуючы соцыял-дэмакратычнага шуцбунда Юліус Дэйч уцяклі ў Чэхаславакію.

АСАДНАЕ СТАНОВІШЧА ПА ЎСЕЙ АЎСТРЫІ

ПРАГА, 13 лютага. (БЕЛТА). Тут атрыманы наступныя паведамленні аб становішчы ў Аўстрыі. Барыкадныя баі прадаўжаліся сёння ў венскіх раёнах Оттакрынг, Грынцынг, Зімерынг, Дэблінг, Флорыдсдорф і ў пасёлку Зандлейтэн. Рабочыя, узброеныя кулямётамі, вінтоўкамі, рэвальверамі, забарыкадаваліся ў дамах.

Учора ўвечары ва ўсёй Аўстрыі аб'яўлена асаднае становішча. Уводзіцца кара смерцю для кіраўнікоў паўстання.

Генеральны дырэктар чыгунак, былы ваенны міністр Вогуэн, пагражае неадкладным звальненнем і аддачай пад суд усіх удзельнікаў усеагульнай стачкі.

РОСПУСК С.-Д. ПАРТЫІ

Совет міністраў пастанавіў распусціць соцыял-дэмакратычную партыю і кіруемы соцыял-дэмакратамі венскі муніцыпалітэт. Міністр соцыяльнага забеспячэння Шмідц (лідэр самага рэакцыйнага клерыкальнага крыла хрысціянска-соцыяльнай партыі, яры старонник італьянскай арыентацыі) назначан урадавым камісарам Вены.

Тактыка соцыял-дэмакратычнай партыі характарызуецца не толькі капітуляцыяй венскага муніцыпалітэта, але і адзіным фронтам соцыял-дэмакратычных правадыроў з фашыстамі супроць паўстаўшых і бастуючых рабочых.

У правінцыі Форальберг лідэры соцыялдэмакратычнай партыі звярнуліся з заявай аб сваёй лаяльнасці да правінцыяльнага ўрада. Яны называюць усеагульную стачку і паўстанне рабочых «злачынствам» і клянуцца, што ў «Форальбергу ні адзін чэсны соцыялдэмакрат не падтрымае гэтых выступленняў».

ПРЫЕЗД У МАСКВУ ЗАМЕЖНЫХ ПОЛЬСКАГА МІНІСТРА СПРАЎ п. БЕКА

13-га лютага прыбыў у Маскву польскі міністр замежных спраў п. Бек з жонкай.

На вакзале іх сустрэлі: народны камісар па замежных справах М. М. Літвінаў з жонкай, польскі пасланнік п. Лукасевіч, нам. наркома т. Крэсцінскі, член калегіі НКЗС тав. Стаманякаў, заг. пратакольным аддзелам тав. Флярынскі, заг. першым Заходнім аддзелам тав. Берозаў і адказныя супрацоўнікі гэтага аддзела, старшыня Масаблыканкома тав Камінскі, нам. старшыні Маскоўскага совета тав. Хвесін, камандуючы Маскоўскай ваеннай акругай тав. Корк, начальнік аддзела замежных зносін РВС СССР тав. Смагін, а таксама ўвесь склад польскай місіі і прадстаўнікі польскай калоніі і совецкага друку.

Беларуска-Балтыйскі вакзал быў упрыгожан совецкімі і польскімі флагамі. На пероне была выстраяна ганаровая варта з аркестрам, выканаўшым польскі гімн і Інтэрнацыянал.

З тым-жа поездам у Маскву прыбыў паўпрэд СССР у Польшчы тав. Антонаў-Аўсеенка.

ПРЫЁМ У т. т. МОЛАТАВА І ЛІТВІНАВА

Раніцой міністр зрабіў візіты старшыні СНК СССР тав. **В. М. МОЛАТАВУ (СКРАБІНУ)** і наркому замежных спраў тав. **М. М. ЛІТВІНАВУ.**

Днём міністр паведаў народнага камісара замежных спраў **М. М. ЛІТВІНАВА**, з якім меў дагую гутарку.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Менск, друкарня «Звязды». Упаўн. Галоўлітбела № К—2422.